Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 28 (4523) 31 ліпеня 2009 г.

У нумары:

Кіраўскай душы матывы

Высокі рэйтынг работнікаў культуры ў раёне — з'ява чаканая.

Стар. 4

Без эфемерных замкаў...

Інтэрв'ю з пісьменніцай Наталляй Голубевай.

Стар. 5

Супраць выхавання людзей-«чыпаў»

Таццяна Шамякіна — пра негатыўныя бакі глабалізацыі.

Стар. 11

Без спадзеву на прымірэнне

Палеміка вакол артыкула Жанны Капусты «Шэсць прычын не любіць крытыкаў».

Стар. 12

Псеўданім на ўдачу

«кіЛіМ з ласкутоў» — новая рубрыка Сашы Дорскай.

Стар. 14

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА II ПАЎГОДДЗЕ 2009 г.

Для індывідуальных падпісчыкаў: 1 месяц — 7760 руб. Падпісны індэкс — 63856

Ведамасная падпіска: 1 месяц — 10060 руб. Падпісны індэкс — 638562

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў: на 1 месяц — 5200 руб. Падпісны індэкс — 63815

Льготная падпіска для ўстаноў культуры і адукацыі: 1 месяц — 7870 руб. Падпісны індэкс — 63880

Каб год для вас быў неблагім — падпішыцеся на «ЛіМ»!

Уяўляеце? Нашы знакамітыя "Харошкі", візітоўка краіны, вядомы ў свеце Беларускі дзяржаўны харэаграфічны ансамбль, чые выступленні ў Еўропе, у Азіі, за акіянам суправаджаліся авацыямі, дагэтуль ніколі не бывалі на Міжнародным фестывалі "Славянскі базар у Віцебску". Заслужаны калектыў пад кіраўніцтвам Валянціны Гаявой і насамрэч толькі сёлета дэбютаваў на "зорнай" сцэне Летняга амфітэатра. Паказ праграмы "Гімн роднай зямлі", складзенай са знакавых кампазіцый ансамбля, прайшоў з аншлагам — і з трыумфам. Неверагодна, што фестывальны Віцебск аж семнаццаць гадоў абыходзіўся без гэтага яскравага і светланоснага мастацтва! "Але мы дужа не засмучаліся, — усміхалася Валянціна Іванаўна, — бо вялікія канцэрты на 4–5 тысяч гледачоў давалі ў Еўропе і па ўсім свеце...".

На вышыні натхнення

Чаму "Харошкі"? Ансамбль пераняў сваё імя ў старадаўняй вёскі на Магілёўшчыне. Там быў запісаны танец "Гусарыкі", што і сёння захоўваецца ў рэпертуары, не страчваючы сваю адметнасць сярод шматлікіх кампазіцый і танцавальных нумароў, з якіх складаюцца сінкрэтычныя праграмы, адмыслова ўгрунтаваныя ў пласты беларускай гісторыі, фальклору, побытавых традыцый.

Гэты ансамбль — не з тых, каму даводзілася ўпарта прабівацца "праз церні да зорак". Думаю, што яму проста пашчасціла нарадзіцца пад зоркаю славы. Бо "Харошкі", можна сказаць, — знакамітыя ад свайго з'яўлення на свет: самае першае выступленне калектыву, якое адбылося ў 1974 годзе, сталася падзеяй, свежым словам у беларускай харэаграфічнай культуры. А праз тры гады ён быў ганараваны I прэміяй і званнем лаўрэата Усесаюзнага конкурсу. І ўсе 35 гадоў творчага жыцця — на вышыні...

Прыгожую дату сваёй біяграфіі "Харошкі" адзначаюць без пампезных юбілейных урачыстасцяў, а ў натхнёнай працы і з нязменным пачуццём адказнасці перад публікай. Канцэрты сёлетняга сезона паказалі, што класіку свайго рэпертуару (нумары з праграм "Па старонках «Полацкага сшытка»", "Тураўская легенда", "Бывай, XX стагоддзе!", папулярныя "Таўкачыкі", "Весялуха", "Віцебская полька", "Люлечка", "Лянсей", сюіта "Субота" ды іншыя) ансамбль трымае на прэм'ерным узроўні, а для мастацкага абнаўлення знаходзіць арыгінальныя ідэі.

Плён творчасці народнай артысткі Беларусі Валянціны Гаявой і яе таленавітых спадзвіжнікаў заўжды навідавоку. Вось і не так даўно "ЛіМ", разам з незлічонымі прыхільнікамі ансамбля, назіраў за нараджэннем у гэтым унікальным Тэатры танца новай задумы. Грандыёзная задума здзяйснялася паступова, праз незвычайныя прэм'еры, што складваліся ў цыкл праграм (пад умоўнаю назвай "Паравіны года"), натхнёных каляндарна-абрадавым фальклорам беларусаў. "Беларусы" — такое гучнае адказнае імя і атрымала ўрэшце тое вялікае, поліфанічнае, шматколернае, насычанае народнымі найгрышамі ды спевамі, харэаграфічнае палатно, праца над якім доўжылася тры гады.

Пасля прэм'еры "Беларусаў", якая адбылася ў сталіцы летась, ансамбль шмат гастраляваў па краіне. А потым была чарада знакавых творчых вандровак. Чаму знакавых? Таму што артысты пад кіраўніцтвам Валянціны Гаявой з поспехам выступілі перад беларускай дыяспарай Санкт-Пецярбурга (разгарнуўшы тамсама ўражлівую выстаўку сваіх сцэнічных касцюмаў), затым наведаліся да землякоў, што жывуць у Даўгаўпілсе, і накіраваліся ў Смаленск. Між іншым, калі вясною "Харошкі" ладзілі канцэрт у Палацы Рэспублікі, на сцэну выйшлі госці — памочнік намесніка старшыні Камітэта па культуры Расійскай Федэрацыі Раман Зайцаў, член аргкамітэта федэральнай выстаўкі "Лепшыя праекты Расіі" Валянціна Мякоціна і кіраўнік Асацыяцыі садзейнічання культуры Смаленска Жана Кузьміна, — і адбылася ўрачыстая цырымонія ўручэння нашым артыстам дыплома Дзяржаўнай Думы краіны-суседкі "Лепшы праект Расіі 2008 года".

З нядаўняга часу ансамбль пачаў акцэнтаваць увагу гледачоў на тым складніку сваёй творчасці, без якога немажліва ўявіць паўнавартасны харэаграфічны спектакль, — на мастацтве касцюма. Унікальныя, прыгожыя і густоўныя народныя строі — аўтарскія работы мастакоў Юрыя Піскуна ды Аляксея Гаявога — "падказваюць" пластыку балетмайстру, "падыграюць" артыстам, спрыяюць стварэнню вобраза. Гэтая шыкоўная калекцыя ўразіла не толькі пецярбургскіх гледачоў. Яна дэманстравалася і на радзіме: у фае Беларускай дзяржаўнай філармоніі, у нашым Нацыянальным мастацкім музеі. Ды ў кантэксце выстаўкі "Танцавальная містэрыя", што прайшла нядаўна ў філіяле Дзяржаўнага музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Беларусі — "Гасцёўні Уладзіслава Галубка" і прысвячалася 35-годдзю "Харошак".

Спадарожнікам гэтага сезона стала для ансамбля дынамічнае, экспрэсіўнае мастацтва фота. З канцэртам у сталічнай філармоніі, напрыклад, спалучылася экспазіцыя здымкаў Ігара Кузняцова. Выступленне на сцэне Палаца Рэспублікі суправаджала разгорнутая ў фае тэматычная выстаўка «Харошкі». Лунаць над часам" Аляксея Паўлюця, і гэты фотапраект быў неўзабаве грунтоўна прадстаўлены ў музеі-галерэі "Свет фота". Дарэчы, Аляксей Паўлюць, фатограф-дызайнер, чые работы маюць міжнароднае прызнанне, праз творчасць славутага ансамбля адкрыў для сябе глыбіню і рамантыку існавання ў танцы, складаны невытлумачальны свет, дзе побыт, будні, святы сплятаюцца ў адно, утвараючы непаўторны, часам незразумелы для старонняга чалавека, загадкавы, прывабны і цудоўны лад жыцця.

Талент узросту непадуладны. Таму колькі б гадоў ні мінула, ансамбль "Харошкі" будзе заўсёды малады дзякуючы свайму "вечнаму рухавіку" — творчаму таленту Валянціны Гаявой з яе жывымі ідэямі, фантазіяй, прафесійнай патрабавальнасцю. А сама спецыфіка мастацтва танца абавязвае падтрымліваць маладосць артыстычнага складу. Зрэшты, і тут бываюць фенаменальныя выключэнні. Хто ж не ведае Фёдара Балабайку! Без яго няма ні гісторыі, ні сённяшняга дня "Харошак". Фёдар Іванавіч, як гаворыцца, — нязменны "брэнд" ансамбля. Але ж галоўнае — ён Артыст. Найвышэйшы прафесіяналізм, выразнае амплуа і адчуванне сцэнічнага кантэксту, непераймальная артыстычнасць, уменне заразіць сваім пачуццём гумару і партнёраў па танцы, і публіку, да таго ж, унікальны творчы досвед, — усё гэта спрыяе стварэнню вобразаў каларытных і незабыўных, глыбінна спакроўленых з беларускім фальклорам. Равеснік "Харошак" Фёдар Балабайка не толькі святкуе разам з калектывам свае 35 сцэнічных гадкоў: некалькі дзён таму ён прымаў віншаванні з уласным 60-годдзем.

"Харошкі" — хараство. Радасць. Маладосць — і мудрасць...

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

На здымку: заслужаны артыст Беларусі саліст ансамбля "Харошкі" Фёдар Балабайка заўсёды ў цэнтры ўвагі.

Фота Кастуся Дробава

Пункцірам

• У канцы ліпеня Беларусь зноў наведалі нашчадкі магнацкага роду Радзівілаў. Яны прывезлі для нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка "Нясвіж" 162 копіі графічных партрэтаў прыдворнага мастака Гершкі Лейбовіча. У музей была перададзена таксама кніга, у якой ёсць унікальныя фотаздымкі Нясвіжа з прыватных архіваў прадстаўнікоў роду. У бліжэйшы час Радзівілы паабяцалі прывезці каля 30 лічбавых копій партрэтаў са сваёй калекцыі.

• У Смаргоні да Дня беларускага пісьменства плануецца адкрыць помнік паэту Францішку Багушэвічу. А на яго сядзібе Кушляны, філіяле Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, павінна прайсці цырымонія ўзнагароджвання лаўрэатаў 49-га Нацыянальнага конкурсу "Мастацтва кнігі-2009". Тут будуць таксама адзначаны пераможцы Рэспубліканскага конкурсу на лепшы літаратурны твор, які праводзіцца Саюзам пісьменнікаў Беларусі.

• У Полацку на плошчы Свабоды вядуцца археалагічныя раскопкі. Кіруе імі кандыдат гістарычных навук, дацэнт Дзяніс Дук. Падчас сёлетняй археалагічнай экспедыцыі даследчыкі пацвердзілі звесткі пра тое, што на месцы раскопак у XVII стагоддзі знаходзіўся багаты жылы раён і рынкавая плошча. Археолагі знайшлі драўляную маставую і мноства артэфактаў. Былі даследаваны рэшткі фундамента помніка героям вайны 1812 года. Помнік мяркуецца ўзнавіць да 200-годдзя перамогі ў вайне з Напалеонам.

• Драўляная сядзіба Шацілінскі Востраў, помнік XVI стагоддзя, які знаходзіцца ў Светлагорску, будзе ўзноўлена. Такое рашэнне прыняў Светлагорскі райвыканкам. На тэрыторыі былой сядзібы трэці год праводзяцца раскопкі. У гэтым раёне на беразе Бярэзіны паселішчы існавалі ўжо ў VII стагоддзі. Згодна з канцэпцыяй ўзнаўлення Шацілінскага Вострава, комплекс павінен складацца з музейнай часткі, майстэрні традыцыйных рамёстваў і інфраструктуры па абслугоўванні наведвальнікаў.

• У нямецкім горадзе Майнц у чатырнаццаты раз прайшоў конкурс "Мастацтва ў горадзе", які сабраў 17 мастакоў з розных краін. Беларус Вячаслаў Паўлавец атрымаў прыз глядацкіх сімпатый. Тэма сёлетняга конкурсу — "Наш свет збліжаецца". Беларускі мастак паказаў свой трыпціх пад назвай "Дарогі злучаюць людзей". На трыпціху адлюстраваны беларуская рэчка і нямецкі Рэйн, якія злучае дарога.

• Праект плана мемарыяльных пабудоў у Беларусі да 2012 года прадугледжвае ўзвядзенне ў Мінску помнікаў Васілю Быкаву і Уладзіміру Караткевічу. Канцэпцыя плана налічвае ўзнікненне каля 200 мемарыяльных аб'ектаў рознага маштабу (комплексы, помнікі, мемарыяльныя знакі і шыльды). Так, у Віцебску павінен з'явіцца мемарыяльны знак у гонар 600-годдзя перамогі пад Грунвальдам, у Гродне — помнікі Францішку Багушэвічу і каралю Літвы Міндоўгу, у Магілёве — манумент Цішку Гартнаму, а ў Гомельскай вобласці — мемарыяльныя знакі, прысвечаныя казацка-сялянскаму паўстанню сярэдзіны XVII стагоддзя.

Падрыхтаваў Павел РАДЫНА

Рэканструкцыя подзвігу

Памяць

У мемарыяльным комплексе "Брэсцкая крэпасць-герой" сёння адбываюцца напружаныя кінематаграфічныя бітвы, ліецца кроў-фарба, палаюць танкі, грымяць выбухі і грукочуць гарматы. Тут распачаліся здымкі расійска-беларускага мастацкага фільма, прысвечанага абаронцам Брэсцкай крэпасці.

Тэлерадыёвяшчальная арганізацыя Саюзнай дзяржавы, якой належыць ідэя праекта, першапачаткова меркавала выпусціць карціну да 65-годдзя вызвалення Беларусі, праца над фільмам павінна была пачацца ў мемарыяле летась — сімвалічна, 22 чэрвеня. Але з-за шматлікіх удасканальванняў сцэнарыя і іншых праблем справа адцягнулася на год. Цяпер плануецца зняць асноўныя сцэны да кастрычніка і выпусціць фільм у кінапракат і на тэлеэкраны вясной-летам 2010-га. Здымкі ажыццяўляюцца супольна расійскай кампаніяй "Цэнтрал Партнершып" і кінастудыяй "Беларусьфільм".

Для маладога рэжысёра Аляксандра Кота, на рахунку якога экранізацыі раманаў В. Пікуля "Рэквіем каравану PQ-17» і Ю. Лермантава "Герой нашага часу", гэтая праца — добры шанц шырока заявіць пра сябе.

Генеральны прадзюсер фільма, тэлевядучы

Ігар Угольнікаў распавёў, што для яго гэтая карціна мае асаблівае значэнне: "Мой дзед загінуў у апалчэнні, другі — быў цяжкапаранены, вайна не абышла ніводную сям'ю. Мы мусім нагадваць усім пра тую цану, якую заплацілі нашыя народы за перамогу".

Сцэнарый фільма перапісваўся ажно 16 разоў і ў выніку стаўся калектыўнай працай чатырох аўтараў — расійскага акцёра Уладзіміра Яроміна, ад якога найперш засталіся ўражвальныя, экспрэсіўныя сцэны, драматурга Аляксея Дударава, які надаў карціне строгай дакументальнасці, а таксама рэдактара фільма Канстанціна Вараб'ёва і рэжысёра Аляксандра Кота. Стваральнікі кінастужкі паставілі за мэту ў сюжэтнай лініі ні на крок не адыходзіць ад гістарычнай праўды: усе галоўныя героі маюць сапраўдных прататыпаў, падзеі заснаваныя на рэальных баявых эпізодах — у дапамогу заклікаліся архіўныя матэрыялы, літаратура, успаміны абаронцаў, у тым ліку і тыя, што раней не друкаваліся. Сачыў за сцэнарнай праўдзівасцю дырэктар мемарыяла "Брэсцкая крэпасць-герой" генерал-маёр Валерый Губарэнка.

Герояў тых крывавых падзей іграюць расійскія акцёры: Павел Дзеравянка ("9 жизней Нестора Махно", "Участок", "Братья Карамазовы") выконвае ролю камісара Фаміна, Андрэй Мярзлікін ("Обитаемый остров", "Бумер", "Охота на пиранью") — памежніка Кіжаватава, а Аляксандр Коршунаў — маёра Гаўрылава. У ролі выхаванца музычнага ўзвода Сашкі Акімава малады акцёр Аляксей Капашоў. У гэтым героі ўвасоблены прататып пятнаццацігадовага беларуса Пятра Клыпы як зборны вобраз усіх Гаўрошаў, што змагаліся падчас вайны нароўні з дарослымі.

Сюжэт не абышоўся і без пранізлівага кахання: "Нашы героі Кіжаватаў, Гаўрылаў, Фамін ваявалі ў крэпасці ў розных ачагах супраціву, адзін пра аднога практычна нічога не ведалі. Мы злучылі тры гэтыя гісторыі з дапамогай дзяцей — хлопчыка Сашкі з Масквы і дзяўчынкі Ані з Мінска, якія ніяк не могуць сустрэцца, трапляючы то да Кіжаватава, то да Гаўрылава, то да Фаміна. Ёсць у фільме і юнацкае каханне Колі і Соні. Але гэта кіно-рэквіем, а не меладрама, так што тут галоўнае — любоў да радзімы", — адзначыў Аляксандр Кот. Ён таксама распавёў, што ў карціне няма канкрэтызацыі нямецкай арміі, яна паказваецца як нейкая абстрактная цёмная сіла, на першым плане — ваганні, пачуцці, страх і гераізм нашых байцоў.

Саша ДОРСКАЯ

На здымку: рэжысёр фільма Аляксандр Кот.

Фота аўтара

З'яднала кніга землякоў

Повязі

Прэзентацыя новага кніжнага фаліянта "Беларускі Пецярбург", якая прайшла ў прэс-цэнтры Дома прэсы, яшчэ раз пацвердзіла той факт, што беларуская гісторыя і культура самым цесным чынам звязана з гісторыяй і культурай Расіі. Пра ўклад беларускай дыяспары ў жыццё суседняй дзяржавы паведаміў аўтар кнігі Мікалай НІКАЛАЕЎ.

Кніга апавядае пра жыццё і дзейнасць выхадцаў з беларускіх земляў у Санкт-Пецярбургу на працягу больш як 300 гадоў. Раздзелы, згрупаваныя па храналогіі і па прафесійнай прыналежнасці, уключаюць больш як 2000 выдатных і неардынарных асобаў. Аўтар кнігі прыходзіць да высновы, што Пецярбург XIX ст., які па колькасці жыхароў-беларусаў быў самым вялікім у свеце гарадскім паселішчам, выконваў функцыю культурнай і адміністратыўнай сталіцы Беларусі.

"Беларускі Пецярбург" выдадзены пры маральнай, арганізацыйнай і фінансавай падтрымцы Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына", Дома нацыянальнасцяў Санкт-Пецярбурга, а таксама пецярбургскіх беларусаў. Аўтар кнігі — наш зямляк, выхадзец з Гродзенскай вобласці. З 1978 года ён працуе ў Расійскай нацыянальнай бібліятэцы, зараз — загадчык аддзела рэдкіх кніг, доктар філалагічных навук, адзін з заснавальнікаў і член прэзідыума Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, член Вучонага савета Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, праўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Санкт-Пецярбургу.

Пра ідэю стварэння кнігі расказаў сам аўтар: "2002 год. Пачынаюць выходзіць кніжкі, прысвечаныя нацыянальным меншасцям горада: два выданні кнігі "Татарская абшчына Санкт-Пецярбурга", кнігі палякаў, фінаў, немцаў, асецінаў, французаў. І я раптам спахапіўся ніхто не рыхтуе пра беларусаў. Ну, калі не мы, то хто? Пачаў збіраць матэрыялы, у першую чаргу гістарычныя, і — знайшоў цэлы беларускі горад, пра які не гаворыць ні адзін падручнік па гісторыі ці геаграфіі, 100-тысячны горад. Тут я сустрэў не "паноў касы і сахі", а беларусаў-інжынераў, артыстаў оперы, лекараў вышэйшага класа, адным словам інтэлігенцыю". У пацвярджэнне сказанага Мікалай Віктаравіч прывёў шэраг фактаў. Да прыкладу, наш зямляк Міхаіл Ханевіч — заслужаны ўрач Расіі, вядучы хірург анкалагічнага цэнтра, Лявон Навасельскі быў капітанам першага ранга, 7 выхадцаў з Беларусі — адміралы, 2 — віцэ-адміралы...

"З 2004 года «Бацькаўшчына» заснавала серыю кніг, прысвечаных беларускай эміграцыі ў Аўстраліі, ЗША і іншых краінах, — паведаміла кіраўнік рады Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына» Алена Макоўская. — Плануюцца кнігі па гісторыі беларускага жыцця ў Вялікабрытаніі і Аргенціне. Унікальная кніга, якая сёння прэзентуецца, — гэта вельмі значны крок па вывучэнні беларускай эміграцыі ў Расіі".

Усе прысутныя на прэзентацыі выказаліся за тое, што частка тыражу новай кнігі павінна папоўніць стэлажы кніжных крамаў Беларусі, бо сёння гэтае унікальнае выданне можна знайсці толькі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

Людміла ЦУБА

На здымку: Мікалай Нікалаеў — аўтар кнігі "Беларускі Пецярбург" — і Аляксандр Станкевіч — намеснік старшыні праўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства Санкт-Пецярбурга — падчас прэзентацыі новага выдання.

Фота аўтара

Помнім і шануем

Роднае

Беларусь адзначыла 100-годдзе з дня нараджэння дзяржаўнага дзеяча, Міністра замежных спраў СССР Андрэя ГРАМЫКІ. З гэтай нагоды ў Цэнтры гісторыі Міністэрства замежных спраў і беларускай дыпламатычнай службы адбылося адкрыццё тэматычнай выстаўкі дакументаў.

У Беларусі Андрэй Андрэевіч нарадзіўся, тут прайшлі гады яго дзяцінства і юнацтва. Савецкі дыпламат не раз цёплымі словамі ўзгадваў сваю радзіму, высока цаніў працавітасць і гераізм сваіх землякоў. Шмат гадоў апраўдваў ён давер сваіх беларускіх выбаршчыкаў у вышэйшым

заканадаўчым органе краіны — Вярхоўным Савеце СССР.

На працягу 28 год Андрэй Грамыка ўзначальваў знешнепалітычнае ведамства Савецкага Саюза. Ён быў першым савецкім прадстаўніком у ААН і стаяў ля вытокаў стварэння новай міжнароднай арганізацыі. Менавіта з імем нашага земляка звязана прапанова ўключыць у склад яе дзяржаў-заснавальнікаў дзве савецкія рэспублікі — БССР і УССР. І ў тым, што сёння з трыбуны ААН гучыць голас Беларусі, несумненна, немалая заслуга савецкага дыпламата. Прадстаўленыя на выставе дакументы, фотаздымкі, кнігі не толькі поўнасцю адлюстроўваюць асноўныя вехі дзейнасці Андрэя Андрэевіча на пасадзе Міністра замежных спраў, але і паказваюць карціну знешнепалітычнага развіцця нашай краіны з часоў, калі яна знаходзілася ў складзе СССР, да нашых дзён.

На святочныя мерапрыемствы прыехалі дзеці Андрэя Грамыкі, Анатолій і Эмілія, а таксама яго ўнукі. "Выстава вельмі добрая, — дзяліўся сваімі ўражаннямі сын Анатолій. Мне і маім родным вельмі прыемна, што ў Беларусі не проста помняць Андрэя Андрэевіча, але і шануюць яго памяць. Гэта гаворыць пра тое, што ён будзе яшчэ доўга жыць у сэрцах вельмі многіх людзей".

Святочная дата не засталася незаўважанай і на Гомельшчыне. Тут, у Гомелі, у яго гонар адбыўся мітынг, цырымонія ўскладання кветак да бюста слыннага земляка, наведванне Гомельскага абласнога музея ваеннай славы, канцэрт класічнай музыкі ў былой гасцінай "Гомельскага палаца-паркавага ансамбля". Не менш значнай падзеяй стала цырымонія гашэння маркі "100 год з дня нараджэння А. А. Грамыкі". Услед за Мінскам і Гомелем святочную эстафету прынялі горад Ветка і малая радзіма Андрэя Андрэевіча — вёска Старыя Грамыкі.

Ірына ЧАРНЯЎСКАЯ

На здымку: дзеці А. Грамыкі — Эмілія (злева), Анатолій (у цэнтры).

Фота аўтара

Прэзентацыі

На валожынскіх крылах

У Музеі гісторыі беларускай літаратуры адбылася творчая вечарына пад назвай "Валожынскія Мы", якая складалася з дзвюх частак: адкрыцця выставы маладога мастака Уладзіміра Сайко і прэзентацыі зборніка "Нашчадкі. Сучасная паэзія Валожыншчыны". Адкрыла вечарыну вітальным словам дырэктар музея Лідзія Макарэвіч, а героямі і гаспадарамі сталі сябры народнага літаратурна-мастацкага аб'яднання "Рунь" на чале з Валянцінай Гіруць-Русакевіч. У якасці гасцей былі запрошаны вядомыя валожынцы Тэрэза Голуб, Віктар Шніп, Вячаслаў Рагойша, Ганна Запартыка, Язэп Янушкевіч, а таксама Аляксандр Лукашанец, які, на жаль, не змог прыйсці на вечарыну, і Навум Гальпяровіч.

Галоўны рэдактар выдавецтва "Чатыры чвэрці", у якім выйшаў зборнік, Ліліяна Анцух распавяла пра гісторыю стварэння кнігі, пра тое, як увасобілася ў жыццё ідэя аздабляць нізкі вершаў не звыклымі фотаздымкамі аўтараў, а невялічкімі партрэтамі. Здзейсніў гэтую задуму навучэнец Рэспубліканскай гімназіі-каледжа мастацтваў імя І. Ахрэмчыка Уладзімір Сайко, які таксама паходзіць з Валожыншчыны і мастацкія працы якога былі прадстаўлены ўдзельнікам вечарыны. Дарэчы, і на вокладцы зборніка "Нашчадкі" таксама фрагмент карціны юнага, але бясспрэчна таленавітага мастака. Аўтарамі зборніка сталі 23 паэты, сярод якіх Ніна Бобрык, Уладзімір Буракоўскі, Нэла Васілеўская, Мікалай Ганчарык, Зінаіда Гасціловіч, Яўген Зялкоўскі, Сяргей Садоўскі і іншыя.

Віктар Шніп нагадаў прысутным, што ў серыі "Беларусь літаратурная", выданне якой ажыццяўляецца "Мастацкай літаратурай" і якая налічвае ўжо 10 зборнікаў, выйшла кніга "Валожыншчына літаратурная". Укладальнік гэтай кнігі Вячаслаў Рагойша падзяліўся ўспамінамі: у часы яго маладосці сябры рэгіянальнага літаратурнага аб'яднання нават і не марылі пра выданне калектыўнага зборніка — настолькі недасягальным гэта ўяўлялася.

Падчас мерапрыемства гучала шмат вершаў, песень, жартаў і натхнёных слоў у адрас гаспадароў-рунеўцаў. Анатоль Вярцінскі — аўтар прадмовы да першага зборніка валожынскіх паэтаў "Зямлі маёй і землякам" — адзначыў адметнасць валожынскага вопыту і важнасць дзейнасці аб'яднання "Рунь" для культурна-літаратурнага развіцця рэгіёна. А Язэп Янушкевіч звярнуўся да маладых рунеўцаў з метафарычным заклікам, які мог бы стаць своеасаблівым "эпіграфам" да вечарыны: "Ляціце ў гэты вялікі свет, толькі майце дужыя крылы, бо — валожынскія мы".

Жанна КАПУСТА

На здымку: выступае Віктар Шніп.

З-пад пяра

У Магілёўскай абласной бібліятэцы імя У. І. Леніна зладкавана фотаэкспазіцыя «Іх подзвіг жывы, непаўторны і вечны», прысвечаная 65-годдзю вызвалення Беларусі і горада Магілёва ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Праект падрыхтаваны пры актыўным удзеле Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея імя Е. Р. Раманава, які прадставіў значную колькасць фотадакументаў са сваіх фондаў.

Менавіта фотаздымкі таго часу найбольш уражваюць нашага сучасніка. Старонкі вызвалення Магілёва вачыма ваенных фотакарэспандэнтаў С. Гурарыя, П. Бернштэйна, В. Шароўскага, Б. Яраслаўцава даюць магчымасць сённяшняму пакаленню ўявіць святочныя і трагічныя імгненні гэтай падзеі. Сярод прадстаўленых фотадакументаў — «Фарсіраванне ракі Днепр каля Магілёва», «У Магілёве ў дзень вызвалення», «Часткі Чырвонай Арміі ўступаюць у Магілёў», «Савецкія танкі на вуліцах вызваленага Магілёва», «Група савецкіх салдат з жыхарамі Магілёва», «Першамайская дэманстрацыя ў Магілёве ў першыя пасляваенныя гады» і інш. Пра гісторыю стварэння і аўтараў гэтых фотадакументаў падрабязна распавяла на прэзентацыі фотаэкспазіцыі вядучы навуковы супрацоўнік Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея Людміла Кандрацьева.

Фотаэкспазіцыя будзе дзейнічаць у абласной бібліятэцы на працягу года.

Тамара КАЛІНІНА

Нацыянальная бібліятэка Рэспублікі Беларусь рыхтуе электроннае выданне "Не пакідайце ж мовы нашай беларускай..." Гэты дыск уключае ў сябе ўсе пашыраныя звесткі пра Францішка Багушэвіча з нагоды ягонага 170-годдзя з дня нараджэння. Сярод гэтых звестак — біяграфічны нарыс пра Францішка Багушэвіча, бібліяграфія ягонай творчай спадчыны і мастацкіх твораў, прысвечаных паэту, а таксама храналагічны спіс публікацый пра жыццё і творчую дзейнасць паэта. Натуральна ўпісаўся ў гэты электронны даведнік і дыяфільм пра Францішка Багушэвіча, створаны ў свой час Кіеўскай кінастудыяй. Дарэчы, Багушэвічаваму кампакт-дыску папярэднічае кампакт-дыск, прысвечаны В. І. Дуніну-Марцінкевічу з нагоды ягонага 200-годдзя з дня нараджэння.

Прэзентацыю электроннага кампакт-дыска "Не пакідайце ж мовы нашай беларускай..." мяркуецца правесці падчас святкавання Дня беларускага пісьменства ў Смаргоні.

Уладзімір СОДАЛЬ

Іван Чарота, удзельнік урачыстасцяў, прысвечаных 620-годдзю Косаўскай бітвы, правёў чатыры дні ў Косаве і Метохіі. Наведаў таксама сталіцу Рэспублікі Сербіі, дзе атрымаў дыплом "За справу жыцця" ад сербскага часопіса "ЗБИЉА/ REALITY", які выдаецца на сербскай і англійскай мовах у Бялградзе. Так адзначана яго перакладчыцкая дзейнасць і пажыццёвая ангажаванасць у папулярызацыі літаратур як Сербіі, так і ўсёй былой Югаславіі. У яго перакладзе на беларускую і рускую мовы на цяперашні момант выйшла ўжо больш як шэсцьдзесят кніг, а дзве кнігі — у Сербіі.

Гэта выпадак, калі кажуць: "Узнагарода знайшла ўзнагароджанага". Справа ў тым, што ўганараваны дыпломам сербскага часопіса беларус Іван Чарота разам з Прэдрагам Драгічам Кіюком (Сербія) і Драгашам Калаічам (Сербія, пасмяротна), Маркам С. Маркавічам (Францыя), Райкам Долечакам (Чэхія), быў яшчэ ў 2006 годзе. Але па пэўных прычынах дагэтуль не мог яго атрымаць.

А. І.

Вопыт

Дзеля чытача

Сувязі са сродкамі масавай інфармацыі сталі важным элементам стратэгіі публічных бібліятэк Слуцкага раёна. Як паказаў вопыт, самы складаны, але і найбольш выніковы спосаб узаемадзеяння бібліятэкі з прэсай — гэта сумесная праектная дзейнасць. Супрацоўніцтва бібліятэк Случчыны з раённай газетай "Слуцкі край" мае адметны ракурс: з 2008 года рэалізуецца сумесны праект "Кніжны праспект".

Бібліятэчная старонка прываблівае чытачоў змястоўнымі артыкуламі, інтэрв'ю, арыгінальнымі віктарынамі, рэкламнымі матэрыяламі пра новыя паступленні ў фонды бібліятэк, афішай мерапрыемстваў. Рэгулярна публікуюцца матэрыялы аб рабоце бібліятэк аграгарадкоў, уключаецца інфармацыя аб рабоце публічных цэнтраў прававой інфармацыі, што створаны ў бібліятэках. Сталі пастаяннымі рубрыкі "Чытаць — модна, прэстыжна", "Кнігі на ўсе часы".

У "Кніжным праспекце" знаходзяць месца артыкулы аб інавацыях у бібліятэчным абслугоўванні, мерапрыемствах рознага маштабу, важных падзеях; бібліятэкі знаёмяць чытачоў з найбольш цікавым у сваёй рабоце: што б гэта ні было: Тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі ці фестываль дзіцячага летняга чытання, прафесійныя конкурсы бібліятэчных спецыялістаў ці конкурсы дзіцячай літаратурнай творчасці.

Шмат увагі надаецца на старонках "Кніжнага праспекта" краязнаўству, аднаму з прыярытэтных напрамкаў дзейнасці бібліятэк, асабліва гэта актуальна ў Год роднай зямлі.

Пасля чарговага выпуску "Кніжнага праспекта" ў бібліятэках нярэдка раздаюцца званкі і гучаць пытанні: як запісацца ў бібліятэку, якое мерапрыемства будзе праводзіцца ў бліжэйшы час, ці можна ўзяць тую ці іншую кнігу. Гэтая зваротная сувязь, безумоўна, з'яўляецца магутнай падтрымкай для тых, хто займаецца папулярызацыяй кнігі і чытання.

У планах цэнтральнай раённай бібліятэкі — адкрыццё ў "Кніжным праспекце" рубрык "Каляндар месяца", "Пісьменнікі, якія вызначылі розум і душу сучаснасці".

Супрацоўніцтва працягваецца...

Ларыса ЦІШКЕВІЧ

г. Слуцк

Канкурэнтаздольны палац

Скарбы

Аднаўляецца палацава-паркавы комплекс у вёсцы Жылічы Кіраўскага раёна. Гэты помнік культуры з'яўляецца класічным узорам архітэктуры XVIII—XIX ст. Дваранскі маёнтак аднаго са старажытнейшых на Беларусі родаў Булгакаў па сваёй велічнасці здольны, пэўна, канкурыраваць нават з замкам Радзівілаў у Нясвіжы.

Палац уражвае сваімі памерамі. Яго плошча складае чатыры тысячы квадратных метраў. Да П-падобнага палаца прымыкае унікальны парк і штучнае азярцо, выкананае ў выглядзе каскаду сажалак: сядзіба размешчана на беразе маляўнічай ракі Добасна. У вадаёме пры Жыліцкім палацы былі астравы Салаўіны і Галубіны, таксама плаціна з арачным мосцікам.

Вядома, што пачынаючы з XVI ст. Булгакі займалі высокія пасты ў Вялікім княстве Літоўскім, а затым і ў Расійскай імперыі, мелі шмат зямлі на Віцебшчыне і Магілёўшчыне. Ігнацій Булгак, які задумаў пабудаваць палац, на той час узначальваў дваранства Бабруйскага павета і з'яўляўся ганаровым куратарам школ. Будаўніцтва ўзначаліў выхаванец Пецярбургскай акадэміі мастацтваў архітэктар Клабукоўскі, мяркуецца, што да праекта Ігнація спрычыніўся буйнейшы прадстаўнік класіцызму пачатку XIX ст. прафесар Віленскага універсітэта Карл Падчашынскі.

Двухпавярховы палац меў купал, на будынку размяшчаўся гадзіннік. Падчас знаходжання гаспадара ў палацы над купалам узнімаўся сцяг.

Палац прайшоў праз усе войны і надзіва добра захаваўся. Уцалела нават ляпніна на сценах і столях, захаваліся не кранутымі часам лесвіцы параднага ўваходу, тыя матэрыялы, якія выкарыстоўваліся ў аздабленні палаца. Рэстаўрацыйныя работы будуць мець пад сабой гістарычны падмурак: інтэр'еры комплексу выдатна адлюстраваў у сваіх малюнках Напалеон Орда — яны захоўваюцца ў Нацыянальным музеі ў Кракаве.

Цяпер у палацава-паркавым комплексе знаходзяцца сельская бібліятэка, дзіцячая школа мастацтваў, комплекс-музей.

Ірына ТУЛУПАВА

На здымку: палац Булгакаў.

Фота аўтара

Ініцыятыва

Музей у вёсцы

Вёска Вайцяшын, якая знаходзіцца на тэрыторыі Пескаўскага сельскага савета Бярозаўскага раёна, асабліва нічым не адрозніваецца ад суседніх. Уздоўж цэнтральнай вуліцы Чырвонаармейскай цягнуцца дабротныя сялянскія хаты з гаспадарчымі пабудовамі. Але жыхарам гэтага населенага пункта ёсць чым ганарыцца: тут створаны і працуе самы лепшы ў раёне музей — Вайцяшынскі грамадскі музей этнаграфіі і сялянскага побыту.

А атрымалася вось як. У прыгожым цагляным будынку да 1992 года працавала пачатковая школа. Калі дзяцей у вёсцы стала мала, яе прыйшлося зачыніць. Праўда, у адным з пакояў засталася бібліятэка, якую ўзначальвала мясцовая жыхарка Лідзія Рудзьман, якая прапанавала раённаму аддзелу культуры ў астатніх памяшканнях, побач з бібліятэкай, стварыць музей сялянскага побыту. Яе падтрымаў былы начальнік Бярозаўскага аддзела культуры Антон Барашка і паабяцаў дапамагчы...

І вось, пасля рамонту і збору экспазіцыі ў 2001 годзе быў адкрыты музей з дзвюма асноўнымі заламі: быт і этнаграфія, мінулае і сучаснасць. Лідзія Іванаўна зазначае, што збіралі рэчы ўсім светам, у некаторых хатах аддавалі па 15—20 розных прадметаў. У адноўленых памяшканнях захоўваецца больш як 700 розных экспанатаў. І кожны з іх распавядае пра жыццё вяскоўцаў у розныя гады, пра іх побыт, культуру, дэманструе прылады, якімі сяляне карысталіся ў свой час. Ёсць стэнды пра партызанскі рух у гэтых мясцінах, пра тых, хто змагаўся з ворагам у гады Вялікай Айчыннай вайны. На адным са стэндаў — прозвішчы людзей, якія за сумленную працу ў сельскай гаспадарцы ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі.

За год тут ладзіцца каля ста экскурсій, якія праводзіць малодшы навуковы супрацоўнік Лідзія Рудзьман і вучні старшых класаў Пескаўскай сярэдняй школы. З гэтай установай Лідзія Іванаўна падтрымлівае трывалыя сувязі і сама рыхтуе маладых экскурсаводаў.

Вясковы музей і надалей будзе ўзбуйняцца. У бліжэйшы час на адкрытай пляцоўцы плануецца стварыць сельскагаспадарчы двор. Ужо сабрана шмат прылад, якімі карысталіся сяляне ў далёкія гады. Непадалёк ад музейнага будынка ўзнімецца вялікі вятрак, унутры ўстановяць жорны. Усім наведвальнікам будзе цікава паглядзець, як выраблялася мука ад энергіі ветру.

Іван АСКІРКА

Фота аўтара

Кіраўскай душы матывы

На пасадзе начальніка аддзела культуры Кіраўскага райвыканкама Тамара ГАЛУБОЎСКАЯ каля 25 гадоў. Сама распачынала многія праекты, памятае, як людзі прыходзілі да высновы, што галоўнае — захаванне таго унікальнага, што ёсць на малой радзіме. Старонкі з той гісторыі "прачытаныя" цяпер ці не кожным кіраўцам: у раённым Доме культуры, які размешчаны блізу галоўнай гарадской плошчы, экспазіцыі пра багатую гісторыю рэгіёна змяняюцца раз у квартал. А ў фае гасцей сустракае створаны народнымі майстрамі хатнічак (скульптура ў рост чалавека), прыгажун Лявон, які едзе на запрэжаным кані да сваёй Лявоніхі, ды "карова" і "цяля". Такі традыцыйны перасоўны фольк-вугалок, які прысутнічае ці не на ўсіх мерапрыемствах, якія ладкуюцца на вольным паветры.

— Першы наш раённы Дом культуры, пасляваенная 1947 года драўляная пабудова, згарэў, — распавядае Тамара Леанідаўна. — Памяшканні для гурткоў, калектываў самадзейнасці нейкі час даводзілася здымаць. Нарэшце, пабудавалі вялікі Дом культуры ў Мышкавічах (узорна-паказальны калгас). А ў гарадах у той час пераважна кінатэатры будавалі, на дамы культуры ніхто не звяртаў увагі. Але, дзякуй Богу, да 1989 года мы і гэты, раённы, Дом культуры адбудавалі. Тады на ўсё быў дэфіцыт. З Ерэвана вагонам цягнулі люстры. Армяне не зразумелі нас, заказчыкаў, і перадалі свяцільнікі для вялікіх канцэртных залаў. Як пасля нашы народныя майстры даўмеліся разабраць і зрабіць з іх нармальныя па памерах свяцільнікі — дагэтуль дзіўлюся.

— Як жа ўдавалася афармляць такія буйныя заказы?

— Ведаеце, рэйтынг работнікаў культуры ў раёне вельмі высокі. У гэтым феномен Кіраўска. Калі б рэйтынгу не было, столькі б часу — па 20, 30 гадоў тут кожны чалавек не працаваў. Словам, падабралася такая каманда, і не толькі кіраўнікоў, а і работнікаў на месцах. Праўда, цяпер у жыцці ўвогуле зашмат мітусні, але і такое вытрымліваем. А калі насельніцтва бачыць, што людзі і на месцах працуюць, яны адгукаюцца! Летась на аднаго жыхара мы аказалі платных паслуг на 10 800 рублёў!

— Але бюджэтных датацый просіце?

— Натуральна, бюджэтных асігнаванняў намнога больш, чым мы самі зарабляем. Хаця план па платных паслугах на 115 працэнтаў выконваем. Нам пашчасціла, што знаходзім паразуменне з кіраўнікамі раёна. Дзякуючы нашаму выканкаму мы купілі батут. Дарэчы, рояль — таксама, цяпер можам запрашаць артыстаў рэспубліканскай сцэны.

— Ваш "птушнік" (адмысловы заалагічны парк ля цэнтральнай плошчы горада. — **І.Т.**) *шмат сродкаў патрабуе?*

— Справа нават не ў сродках. Ведаеце, наколькі трывала ўвайшоў гэты "птушнік" у жыццё кіраўчан! У нас цэнтральная плошча маленькая, але досыць утульная. Паходзяць людзі ля фантана, пабачаць экзатычных птушак, зойдуць да нас, у Дом культуры, у бібліятэку...

— Ці маюцца нейкія характэрныя рысы ў насельніцтва вашага раёна?

— Мы вельмі любім ездзіць на веласіпедах. Спартыўны ў нас люд. У Жылічах дзейнічала моцная школа цяжкай атлетыкі. Многія майстры спорту СССР выйшлі адтуль. Валейбол, футбол у пашане. А пачыналі з веласіпедаў. У Мышкавічах ініцыятарам спаборніцтваў быў Кірыла Арлоўскі — легендарная асоба. Ён хацеў, каб людзі мелі здаровы лад жыцця. Веласіпеды адразу пасля вайны сталі па раёне папулярнымі. Ездзяць і старыя і маладыя. Кожны год мемарыял-гульні па веласпорце праходзяць і носяць яны імя Арлоўскага.

Яшчэ нашы жанчыны трошкі па-іншаму апранутыя. Праўда! Яны нечым цікавейшыя. Ёсць у іх нейкі падыход да свайго знешняга выгляду. І наш глядач вельмі пераборлівы — гэта калі казаць пра канцэрты, што арганізоўваем. Глядач наш вельмі патрабавальны. Таму мы не паўтараем нумары мастацкай самадзейнасці!

— Між іншым, палацава-паркавы комплекс XIX стагоддзя ў Жылічах называецца дваранскім.

— І гэта таксама ад нашых вытокаў. Кіраўскі раён, так бы мовіць, падзелены гістарычна. Землі тыя, што ў Любонічах (бліжэй да шашы на Мінск) належалі расійскай імперыі. І падпарадкаванне ішло напрамую. Жылічы, Полькавічы і вёска, дзе пахавана ўнучка Пушкіна Варанцова-Вельямінава, Цялуша Бабруйскага раёна — гэтыя землі пераходзілі дваранскім родам беларускага паходжання. Вось і зямля Жыліцкая пазначана родавым валоданнем Радзівілаў, Хадкевічаў, Сапегаў. А пасля ўжо там пасяліліся Булгакі. І да іх там ніякіх замкаў не мелася. Але была добрая зямля. І калі Ігнацій Булгак у 1825 годзе першы корпус пабудаваў (закончылася будаўніцтва комплексу ў 1875 годзе), усе здзівіліся яго хараству! І бібліятэка ў Булгака мелася, і мясцовых музыкантаў ён утрымліваў.

— Але як вам уяўляецца роля кіраўніка ў сферы культуры? Чалавек наш заўсёды заняты сваімі паўсядзённымі клопатамі, а цяпер, калі штодня нагадваюць пра сусветны крызіс, то быццам акрамя як пра эканоміку, пра іншае і не думаем... Як пры гэтым прывабіць чалавека да бібліятэкі, Дома культуры?

— Асноўнае, відаць, у тым, што той, хто прыходзіць на пасаду кіраўніка, павінен быць не толькі высокім прафесіяналам, але і вялікім аптымістам, лідэрам, які здольны задзейнічаць увесь патэнцыял супрацоўнікаў.

— Вы сваю каманду доўга стваралі?

— Доўга. І цяпер яна працягвае фарміравацца. Таму што кожны работнік прыносіць нешта новае. Асноўная частка работнікаў — выхадцы з Кіраўскага раёна. Нехта будзе ў камандзе кіраўніком, іншы — творчым майстрам... Дарэчы, усе кіраўнікі структурных падраздзяленняў у нас з вышэйшай адукацыяй, а ёсць тыя, хто яшчэ вучыцца завочна. Значыць, будучае закладзена. Хочацца верыць, што нашыя творчыя задумы ўвасобяцца ў жыццё. Цяпер трэба больш яркіх форм працы для маленькіх школьнікаў і дашкалят. І каб Жыліцкі комплекс пачаў дзейнічаць на ўсю моц, зрабіўся турыстычным маршрутам. Праўда, у нас распрацавана нядрэнная вандроўка — з Магілёва ў вёску Боркі, дзе былі закатаваны і зажыва спаленыя 1 800 жыхароў, затым Чыгірынка, Чычэвічы, дзе водаахоўная зона, затым Кіраўск, калгас імя К. Арлоўскага "Рассвет" з яго слаўнай гісторыяй і ўжо адтуль плануем везці турыстаў на Жылічы. Ёсць добрыя напрацоўкі і па аграэкатурызме.

Перспектыва ў развіцці раёна нядрэнная. Вось толькі хочацца, каб дзяцей нараджалася больш, ды кадры былі свае. Бо жыццё, як не банальна, не стаіць на месцы, нягледзячы ані на якія крызісы...

Ірына ТУЛУПАВА

На здымку: начальнік аддзела культуры Кіраўскага райвыканкама Тамара Галубоўская.

Фота аўтара

На бабулінай кухні ў Горадзе майстроў

У Брэсце адбыўся III адкрыты абласны фестываль фальклорнага мастацтва "Радавод".

Свята аб'яднала ў сценах Брэсцкага абласнога цэнтра творчасці моладзі больш як тысячу чалавек — удзельнікаў васьмідзесяці васьмі беларускіх і трох замежных калектываў. Гасцямі ж "Радавода" сталі юныя выканаўцы з Германіі, Польшчы і Харватыі. Дарэчы, артысты з дзвюх названых апошнімі краін выступілі пасля фестывалю ў Камянюкскай школе і зрабілі экскурсію па Камянецкім раёне.

Яшчэ да пачатку конкурснай праграмы ў габеленавай зале цэнтра творчасці моладзі з'явіўся амаль казачны "Горад майстроў". Чаго толькі не было на гэтай выставе: незвычайнай прыгажосці вырабы з дрэва, гліны, саломкі і іншых матэрыялаў, вышыўка, выцінанка, дэкаратыўнае пано... Амаль усё гэта — справа рук выхаванцаў пазашкольных устаноў адукацыі і агульнаадукацыйных школ Берасцейшчыны. Некаторыя юныя майстры стваралі свае маленькія "цуды" проста на вачах гасцей незвычайнага "горада"!

Працавала тут і вельмі смачная выстава "Бабуліна кухня". Знайшлося шмат жадаючых не толькі паглядзець на традыцыйныя беларускія стравы, але і пакаштаваць іх, узяць рэцэпты самых упадабаных.

Вельмі апетытнай была экспазіцыя кандытарскіх вырабаў выхаванцаў гуртка "Гаспадынька" цэнтра пазашкольнай працы пры Жамчужнінскай сярэдняй школе Баранавіцкага раёна. Дарэчы, сакрэты прыгатавання печыва кіраўнік Галіна Харавец і яе вучаніцы ўсім жадаючым раскрывалі з вялікім задавальненнем.

Удзельнікі фестывалю са Століншчыны здзівілі наведвальнікаў выставы адварам мядовым "Усе здаровы!", напоямі з хвашчу "Бывай здарова, цешча", са зверабою "Мы здаровы з табою" і "Смародзінка — уцякай, хваробінка!" А яшчэ — піражкамі ў форме жаўрукаў.

Самабытныя беларускія стравы прапаноўвалі наведвальнікам "Бабулінай кухні" і прадстаўнікі іншых раёнаў вобласці. Асабліва ж, на думку журы, вылучаліся пачастункі з Іванаўшчыны ("Бабка маркоўная", "Бульбішнікі", "Галёны", "Прысыпанка" — смачней не бывае!) і Камянеччыны. З традыцыйнымі стравамі апошняга з названых раёнаў гасцей пазнаёмілі прадстаўнікі Высокаўскага цэнтра пазашкольнай працы.

І ў "Горадзе майстроў", і на "Бабулінай кухні" кожны адчуваў сябе не тое што жаданым госцем — часткай вялікай дружнай сям'і, дзе шануюць беларускія традыцыі, умеюць добра працаваць і адпачываць. Была тут і магчымасць пазнаёміцца з традыцыйнымі народнымі касцюмамі, якія ў кожным раёне маюць свае адметныя рысы. Тое, што сапраўды апраналі ў маладосці нашы бабулі, рэканструяваная вопратка па старажытным узоры, сучасныя мадэлі ў фальклорным стылі — усё гэта можна было ўбачыць падчас і без таго цікавай праграмы фэсту.

У межах праекта "Радавод" адбылася навукова-практычная канферэнцыя "Праблемы перадачы і захавання фальклору".

— Сваю малую радзіму варта вывучаць разам з дзецьмі, якіх спярша трэба да гэтага заахвоціць, — упэўнена каардынатар праекта "Радавод" Вера Волкава, метадыст аддзела мастацкай самадзейнасці цэнтра творчасці моладзі. — Вывучаць не па кнігах, а падчас летніх фальклорных экспедыцый, каб дзеці на свае вочы бачылі выкананне старажытных абрадаў і, магчыма, удзельнічалі ў іх, спявалі разам з бабулямі... Толькі тады яны будуць больш паважліва адносіцца да прадстаўнікоў старэйшага пакалення і захоўваць нацыянальныя традыцыі.

Своеасаблівым працягам канферэнцыі стала сустрэча яе ўдзельнікаў з носьбітамі фальклору Брэсцкага раёна, якія за развіццё і зберажэнне фальклорнага мастацтва атрымалі ад аргкамітэта фестывалю спецыяльныя дыпломы і салодкія падарункі.

Адбылося сапраўднае свята фальклорнага мастацтва, якое аб'яднала прадстаўнікоў некалькіх пакаленняў. Заўважым, сёлетні фестываль прайшоў у рамках рэспубліканскай акцыі "Год роднай зямлі". Арганізавалі яго ўпраўленне адукацыі і аддзел па справах моладзі Брэсцкага аблвыканкама, абласны камітэт БРСМ і абласны цэнтр творчасці моладзі.

Алена ГАРМЕЛЬ

Фота Віктара Кавалёва

У Беласток — да беларусаў

Па запрашэнні Культурнага цэнтра Беларусі ў Польшчы (КЦБ), які існуе пры Пасольстве Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча, нядаўна ў Беластоку з візітам знаходзілася дэлегацыя Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, у склад якой уваходзілі Анатоль Крэйдзіч — старшыня, а таксама члены суполкі, беларускія літаратары Анатоль Шушко, Валерый Гапееў, Георгій Тамашэвіч. Асноўнай мэтай візіту з'яўлялася ўстанаўленне і развіццё супрацоўніцтва паміж беларускімі літаратурнымі аб'яднаннямі Беларусі і Польшчы.

Падчас візіту брэсцкія літаратары наведалі Беларускае грамадска-культурнае таварыства ў Польшчы (БГКТ), пра дзейнасць якога распавёў яго дырэктар Янка Сычэўскі. Тут госці прынялі ўдзел у творчым вечары, прысвечаным Дню дзіцяці, які складаўся з выставы дзіцячых малюнкаў і канцэрта. Атрымалася велічнае свята беларускасці. Падчас сустрэчы беларускія літаратары пазнаёмілі прысутных з дзейнасцю Саюза пісьменнікаў Беларусі, творчасцю брэсцкіх пісьменнікаў і паэтаў, быў абмеркаваны шэраг пытанняў па развіцці супрацоўніцтва паміж Брэсцкім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі і БГКТ. У мерапрыемстве прыняла ўдзел консул Генеральнага Консульства Рэспублікі Беларусь у Беластоку Наталля Міцкевіч.

Члены дэлегацыі таксама паўдзельнічалі ў пасяджэнні Беларускага літаратурнага аб'яднання "Белавежа" ў Беластоцкім універсітэце. Гэтая сустрэча з'яўляецца першай падобнага кшталту паміж дзвюма арганізацыямі. З боку аб'яднання "Белавежа" прысутнічалі старшыня арганізацыі, вядомы пісьменнік, рэдактар літаратурна-мастацкага і беларусазнаўчага часопіса "Тэрмапілы" прафесар Ян Чыквін, члены аб'яднання Галіна Твараповіч, Віктар Швед, Юрка Баена, Міра Лукша, Уладзімір Саўчук, Яўгенія Максімюк, Юрка Буйнюк і іншыя. Падчас сустрэчы абмяркоўваліся пытанні дзейнасці літаратурных аб'яднанняў Беларусі і Польшчы, была дасягнута дамоўленасць аб развіцці супрацоўніцтва, правядзенні сумесных літаратурных мерапрыемстваў, выданні зборнікаў твораў беларускіх пісьменнікаў і паэтаў. У якасці магчымага накірунку сумеснай дзейнасці на бліжэйшую перспектыву быў абраны фестываль беларускай паэзіі, які можа быць праведзены ўжо ў наступным годзе.

У выніку паездкі Брэсцкае аддзяленне СПБ папоўніла сваю бібліятэку кнігамі беларускіх пісьменнікаў-белавежцаў Віктара Шведа, Міхася Андрасюка, Юркі Буйнюка, Галіны Твараповіч, Юрыя Баены, былога рэдактара і заснавальніка беларускага грамадска-культурнага тыднёвіка "Ніва" Георгія Валкавыцкага.

Антаніна КІТ

Без эфемерных замкаў...

«Я нарадзілася са сваёю думкай»

Намеснік начальніка Упраўлення сацыяльна-культурнай сферы апарата Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, кандыдат гістарычных навук, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, член Беларускага саюза журналістаў, аўтар шматлікіх навуковых прац Наталля ГОЛУБЕВА вядома найперш як грамадскі дзеяч. Наталля Аляксандраўна вядома таксама як аўтар некалькіх празаічных кніг і паэтычнага зборніка "Балтийская тетрадь".

— Наталля Аляксандраўна, як вы для сябе выбіраеце прыярытэты: у прафесіі, напрамках дзейнасці, у хобі?

— Самае галоўнае — умець прыслухацца да сябе. Чалавеку дадзеныя пэўныя якасці ад прыроды. Калі ў яго за плячыма вялікі жыццёвы вопыт, ён многае можа. І калі ў мяне пытаюцца, як я ўсё паспяваю, адказ просты — трэба вельмі гэтага хацець і па жыцці не ленавацца! Тады ўсё атрымаецца.

— Прафесію сабе вы доўга выбіралі, гадамі марылі пра яе ці ўсё атрымалася нечакана ды знянацку?

— Ведаеце, уся справа ў тым, што я заўсёды сама прымаю рашэнні, што мне рабіць у жыцці, як жыць. Часам нават здаецца, што я нарадзілася са сваёю думкай. У пяцігадовым узросце ўзяла партфель сваёй старэйшай сястры, паклала туды кнігі: мне стала крыўдна, што ўсе кудысьці ходзяць — хто на працу, хто ў школу — вось і я пайшла! Ішла і аб'яўляла ўсім па дарозе: я настаўніца! Як у пяць гадоў аб'явіла, так і атрымалася. Сама я з сям'і ваеннага, мой бацька служыў у Бабруйску, і я закончыла пятую бабруйскую школу, дзе працавалі выдатныя педагогі, якія засталіся ў памяці назаўсёды. Была ў мяне дакладная скіраванасць: літаратура, гісторыя. І той сектар, які звязаны з мастацтвам, музыкай. Нашаму пакаленню пашчасціла: мы нарадзіліся і пражылі ў стабільны час савецкага перыяду, калі была магчымасць максімальна рэалізаваць сябе, калі ты хацеў вучыцца — вучыўся, у нас не было ніякіх рэпетытараў. Я займалася спортам, закончыла музычную школу па класе фартэпіяна, была актывісткай, камсамолкай, выбіралі ў камітэт камсамола школы...

— І далей вы працавалі настаўніцай?

— Так, я працавала ў другой школе Бабруйска настаўнікам этыкі, рускай мовы і літаратуры, праз нейкі час мяне прызначылі арганізатарам пазашкольнай працы. Усё вельмі хутка пайшло. А потым была камсамольская праца, у 26 гадоў стала загадчыцай аддзела райкама партыі па ідэалогіі, у 29 — сакратаром райкама партыі, у 32 гады была ў Маскве, у адной з самых прэстыжных устаноў Савецкага Саюза — аспірантуры Акадэміі грамадскіх навук. Шмат можна гаварыць пра нейкія этапы, але самы прыемны, напэўна, час — вучоба ў Гомельскім універсітэце. У мяне заўсёды была схільнасць да навуковай працы, пісала іх і ўдзельнічала ў конкурсах. І ўжо пасля І курса я стала ўладальніцай прэміі на Усесаюзным конкурсе навуковых прац. Простая студэнтка, са звычайнага універсітэта, нават не сталічнага ВНУ, накіроўвае ў камісію сваю навуковую працу і атрымлівае другую прэмію, а ў выніку — стажыроўка ў Кракаўскім універсітэце! Гэта таксама была выдатная школа для нас, савецкіх студэнтаў. У Польшчы тады пачыналася эпоха "Салідарнасці". Для нас гэта было новае — і мы на свае вочы ўсё назіралі...

— Адтуль — і імкненне ўнікнуць у гісторыю? У многіх вашых кнігах, да прыкладу, у "Радзімічах" — гістарычная аснова...

— Разумееце, усё назапашвалася гадамі. Кожны перыяд, які мы з вамі пражылі: савецкая эпоха, перабудова, гады незалежнасці — паўплываў на светапогляд чалавека, яго перакананні. Можа, мне пашчасціла, бо гэта была ўжо другая палова 80-х гадоў, калі адкрываліся архівы, я працавала з Цэнтральным партыйным архівам. Асобныя факты выклікалі амаль што шок. Калі даведалася, да прыкладу, што рэпрэсіўная машына падчас Другой сусветнай вайны, калі людзі праяўлялі небывалы гераізм, працавала не менш, чым у 1937 годзе. Я шмат дазналася пра персаналіі — і з'яўляўся зусім іншы погляд на гістарычныя перыяды, асобы, паводзіны людзей.

Прыходзіла усведамленне, што ты належыш да народа... Нам гаварылі, што Беларусь — гэта нацыянальная ўскраіна. Дзеці ваеннаслужачых у школе вызваляліся ад урокаў беларускай мовы і літаратуры. І натуральна, адносіны да сваёй унікальнай гісторыі былі іншыя. Калі ж ідэалагічная заслона прыадкрылася, мы даведаліся, што гэта краіна дала свету шмат майстроў, мастакоў, музыкантаў, помнікаў культуры. І мецэнаты ў нас былі, не горшыя за расійскіх. Тады ўзнік не проста інтарэс, а патрэба ўсё гэта вывучыць! І сёння мая задача як гісторыка, літаратара — распавесці пра маладаследаваныя гістарычныя падзеі і перыяды, якія часам выклікаюць у грамадстве дыскусіі.

Зусім нядаўна выйшла мая кніга "На перепутье двух дорог" — яна прысвечана падзеям, якія адбываліся на заходніх землях Расійскай імперыі перад вайной 1812 года. Знарок пра вайну не пісала, а ўзяла некалькі месяцаў перад ёю. Каб паказаць, наколькі важнымі былі землі Беларусі ў кантэксце еўрапейскіх падзей, у кантэксце тых супярэчнасцей, якія існавалі на нашай тэрыторыі; разам з тым хацелася паказаць гераізм людзей, якія будавалі Бабруйскую крэпасць і вакол якой разгортваюцца асноўныя падзеі.

У кнізе дзейнічаюць сапраўдныя гістарычныя асобы — Аляксандр І, Барклай дэ Толі, выкарыстана шмат архіўных дакументаў. Не абвінавачваючы нікога, я імкнулася паказаць, як адны намагаліся аднавіць ВКЛ, іншыя бачылі ў гэтым недарэчнасць. У аповедзе прысутнічаюць і нашы магнацкія роды — Сапегаў, Агінскіх, у тым ліку асоба Міхаіла Клеафаса Агінскага з яго вядомым планам аднаўлення ВКЛ у рамках Расійскай імперыі, іншыя.

— У гістарычных кнігах галоўнае — дакладнасць, тут трэба вызначыцца, што будзе дамінаваць: дакументальная, гістарычная аснова альбо мастацкасць...

— Брацца за такую тэму вельмі адказна. Таму што ты маеш гістарычны матэрыял, а самая канкрэтная навука, на маю думку, — гэта гісторыя. У ёй маецца канктрэтны гістарычны факт. А справа сумлення і падрыхтаванасці пісьменніка, гісторыка, навуковага дзеяча — як распарадзіцца гэтым фактам. Калі бярэшся за гістарычную тэму, павінен абстрагавацца ад эмоцый: вось гэта мне падабаецца, а вось гэта — не. Так, у мяне ёсць героі, якіх я люблю, ёсць — якіх не люблю. Але я павінна зразумець, чаму герой дзейнічаў так, а не іначай. Значыць, галоўнае — гэта пэўныя гістарычныя падзеі. Трэба імкнуцца да аб'ектыўнасці, а не навязваць чытачу нейкія ідэалагічныя погляды і, бясспрэчна, яны не павінны пераважаць. Гісторыя можа і аб'яднаць, і пасварыць. Я лічу, што гісторыя павінна ўсе ж быць моцным аб'ядноўваючым грунтам.

Творчы чыноўнік

— Вашы літаратурныя спробы — рознажанравыя. Гэта і паэзія, і проза, і гістарычная, дакументальная хроніка...

— Я катэгарычна супраць таго, каб працаваць у нейкім адным напрамку і эксплуатаваць адну тэму. Не ўяўляю, як змагла б пісаць толькі пра вёску альбо яшчэ пра што іншае. Пісьменнік на тое і пісьменнік, каб бачыць наперад, уздымаць тыя праблемы, якія могуць быць цікавымі і актуальнымі. І, безумоўна, акрамя натхнення неабходны пэўны інтэлектуальны ўзровень, які павінен выходзіць за межы толькі аднаго пытання. Заканчваючы працу пра Бабруйскую крэпасць, адначасова пісала чыста жаночую кнігу — "Міражы". Гэта кніга аповесцей і апавяданняў, якія адлюстроўваюць узаемаадносіны мужчыны і жанчыны сярэдняга ўзросту, да якіх прыходзіць пачуццё кахання.

— На прэзентацыі вас назвалі "творчым чыноўнікам". Вы згодны з такім вызначэннем?

—Не толькі я творчы чыноўнік. Усе, хто працуе ў апараце ўрада — усе творчыя людзі. Калі б тут не было творчага чынавенства, то, напэўна, ні адзін дакумент, які праходзіць праз кабінеты, не набываў бы тую форму, якую мае. Без творчага падыходу адказных чыноўнікаў мы б, напэўна, не атрымалі ні сучаснай Нацыянальнай бібліятэкі, ні адноўленага будынка філармоніі, ні шмат іншых аб'ектаў, якія рэстаўруюцца. Згадайма Мір, Нясвіж...

Галоўнае — каб пісьменнік пісаў

— Многія памятаюць вашы дзелавыя, канкрэтныя выступленні на пленумах і з'ездах Саюза пісьменнікаў Беларусі. Што робіцца дзеля таго, каб прапановы маглі быць рэалізаваныя?

— Я лічу, што самае галоўнае — каб пісьменнік пісаў. А на ўзроўні дзяржавы павінен працаваць механізм, які б забяспечыў умовы для працы. Таму сёння са старшынёй Саюза пісьменнікаў Беларусі М. Чаргінцом мы прапрацоўваем прапановы па замацаванні на дзяржаўным заканадаўчым узроўні такой, напрыклад, нормы, як залік пісьменніцкага стажу ў агульны працоўны стаж. Неабходна ўнясенне паправак і ў працоўны кодэкс, і ў Закон Рэспублікі Беларусь "Аб творчых саюзах". Хочацца, каб творчы чалавек — і літаратар, і мастак, і музыкант — быў ўпэўнены: калі ён таленавіты, дзяржава яго падтрымае. Напэўна, нашы знакамітыя пісьменнікі В. Быкаў, І. Мележ, І. Шамякін і многія іншыя сталі шырока вядомымі толькі дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы, таму, што за кошт дзяржавы выходзілі творы вялікімі тыражамі, былі створаны добрыя ўмовы для працы. Цяпер мы жывём ва ўмовах рынку і нягледзячы на гэта дзяржавай шмат чаго зроблена для творчай інтэлігенцыі (прыняты на дзяржаўным узроўні меры па падтрымцы сацыяльна-значнай літаратуры, ажыццёўлена значная дапамога нашым дзяржаўным выдавецтвам, якія выпускаюць такія кнігі, фінансуецца Саюз пісьменнікаў Беларусі, існуе шмат грантаў).

Перамена заняткаў — адпачынак

—Для кагосьці і дом — яго крэпасць, іншаму вельмі важна, каб побач былі сябры. Што вам дапамагае ў працы? Хто вашы сябры, памочнікі, хто вас падтрымлівае?

— Напэўна, я рэаліст, які дакладна ацэньвае сітуацыю, якая б яна ні была: дрэнная, вельмі дрэнная альбо добрая, і акуратна раскладвае складнікі гэтай сітуацыі... Бясспрэчна, чакаеш, што вакол цябе будуць добрыя людзі. Што цябе зразумеюць, падтрымаюць. Але... разам з тым усведамляеш, што ніхто лепш за цябе нічога не зробіць. Я дынамічны па жыцці чалавек, і вельмі перажываю, калі губляю час: гадзіны, мінуты, секунды. Для мяне гэта — катастрофа! Я павінна ўвесь час рухацца наперад. Раніцай устаеш і гаворыш сабе: ты за дзень павінна зрабіць тое і тое, і калі ўвечары разумееш, што зрабіла — цудоўна! Дзень арганізую менавіта так: усё павінна быць накіравана на канчатковы вынік. Асноўная праца, літаратура, спорт — усё павінна быць спланавана. Ведаеце, можна прыйсці дадому і сказаць сабе, што вельмі стамілася. А можна зірнуць і па-іншаму: у мяне ёсць яшчэ чатыры гадзіны жыцця і я магу шмат чаго зрабіць.

— Ці згодны вы з меркаваннем, нібыта сучасная жанчына павінна альбо рабіць кар'еру, альбо займацца домам?

— Абсалютна не згодна. У нас у дзяржаўным апараце сабраліся не толькі выдатныя ўпраўленцы з вялізным жыццёвым і прафесійным вопытам. Гэта людзі, якія ўмеюць арганізаваць сваё жыццё. Зрэшты, перамена заняткаў ёсць адпачынак. Я адпачываю і на працы, калі разумею, што прыняты дакумент, па якім жыве краіна, эфектыўны. Таму што каманда якасна папрацавала, падрыхтавала яго. А калі прыходзіш дадому — і ёсць магчымасць памяняць занятак, то гатуеш нешта смачнае. Прычым, як творчы чалавек я "сава", увечары пасля 9 гадзін з задавальненнем уключаю камп'ютэр і пішу. Дом заўсёды ёсць дом!

— Што б вы хацелі, каб збылося ў бліжэйшы час?

— Яшчэ раз паўтару: я абсалютны рэаліст, таму не будую эфемерных замкаў, не мару, каб нешта збылося. Я дакладна ведаю, што ўсё залежыць у большасці ад сябе самой. Проста трэба ўмець ацэньваць свае сілы і магчымасці.

Гутарыла Ірына ТУЛУПАВА

Турын — вёска казачная

Старажытнае паселішча Турын, што месціцца па дарозе з Мар'інай Горкі на Чэрвень, з даўніх часін звязана з гісторыяй навукі, культуры, мастацтва. Тут нарадзіўся славуты вучоны Якуб Наркевіч-Ёдка. З гэтых мясцін — беларускі гісторык, даследчык падзей Айчыннай вайны 1812 года Яўхім Карнейчык. У даваенныя гады ў вёсцы, на беразе Свіслачы, летаваў пісьменнік Янка Маўр. У Турынскай сярэдняй школе ў розныя гады настаўнічалі кандыдат гістарычных навук Міхаіл Спірыдонаў, пісьменнік-сатырык Міхась Скрыпка.

Загадчыкам Турынскай сельскай бібліятэкі цяпер працуе руплівы і энергічны кніжнік Зінаіда Саўчык. Сярод іншых яе ініцыятыў — тэатральная работа з вясковымі дзецьмі. Дзяўчынкі і хлопчыкі, якія наведваюцца ў бібліятэку, паказваюць на школьнай сцэне невялікія казачныя дзействы. За гады работы Зінаіды Іванаўны сельская бібліятэка стала сапраўдным лялечным тэатрам.

А яшчэ бібліятэкар піша тэксты, разам з дзецьмі робіць лялькі, якія пасля становяцца дзеючымі асобамі тае ці іншай казкі. Вось што расказвае Зінаіда Іванаўна:

— "Церамок на новы лад" — казка, напісаць якую мяне падштурхнула знаёмства з выпадковай Жабай. А ўсё пачыналася так. Дзеці прынеслі мне галоўку Жабы з зялёнага шоўку ў гарошак. З такім шырокім ротам на ўвесь твар. Вочы прышыты ў выглядзе зялёных шарыкаў. А яшчэ на іх — жоўтыя гузікі. У роце — цыгарэта. Я пашыла для Жабы вельмі прыгожую сукенку — з бліскучага зялёнага шоўку. Часам сабе на палец уздзявала такую ляльку і любавалася. А пасля неяк раптоўна і казку напісала... У мяне ёсць і вершы пра ката Рыжыка і новая казка "Чырвоныя капялюшыкі" — пра тое, як у бабулі было шэсць Чырвоных Капялюшыкаў, а Воўк злосны сярод іх нявесту падбіраў...

Адмысловыя прыдумкі казачнага характару, уменне спалучыць лялечных персанажаў з кніжнымі героямі — адметная рыса ў рабоце сельскага бібліятэкара Зінаіды Саўчык. Якраз гэта і пашырае чытацкую прастору сярод турынскай дзятвы. А нядаўна бібліятэкар з Турына разам з пухавіцкай раённай бібліятэкай выдала рэкамендацыйны паказальнік літаратуры "Усё пра лялькі". Выкарыстоўваючы ў асноўным тую перыёдыку, якая прыходзіць ці прыходзіла ў нядаўні час па падпісцы ў сельскую бібліятэку, Зінаіда Іванаўна склала цікавую тэматычную бібліяграфію пра цацкі, лялькі, лялечны тэатр. Відавочна, што турынскі бібліятэкар пераканана ў тым, што казка, якая развівае фантазію, мары, выступае для дзятвы самым сапраўдным лекавым сродкам. Ад страхаў і жахаў цемры, адзіноцтва — найперш. Нездарма ж існуе і такое вызначэнне, як казкатэрапія. І ў Турынскай сельскай бібліятэцы гэта — не пусты гук, а справа, якая сцвярджае дабрыню, справа, якая аб'ядноўвае фантазію, казачны свет і рэальнае жыццё, народную педагогіку.

Кастусь ЛАДУЦЬКА

Навобмацак

«Халоп(ам)...» пераможа(а)ны

"*Сапраўдны* літаратуразнаўца павінен быць здатны прааналізаваць мастацкі твор, не чытаючы яго", — не стамляецца паўтараць адзін наш надзвычай аўтарытэтны (і пры гэтым *вечна малады*) прафесар. Гэты "пастулат" у маім асабістым літаратурна-крытычным вопыце мог бы застацца жартам на тэму прафесіі, але стаўся... паратункам.

Сёлета ў вядомым выдавецтве "Кнігазбор" выйшла чарговая кніга Валерыя Казакова (расійскага пісьменніка, што нарадзіўся на Магілёўшчыне) "Халоп Яснавяльможнага дэмакрата", чый жанр сам аўтар з пэўнасцю і выключнай шчырасцю вызначае як "раман-дур". Унікальнасць той ці іншай літаратурнай з'явы можа вымярацца ў розных сістэмах каардынат. Так, пасля з'яўлення на паліцах беларускіх кнігарняў "Прогнутых небес" (на рускай мове, 2008) і зборніка "Цень гобліна" ("першай кнігі аўтара на роднай мове", 2008) у каляліТаратурным асяродку пра пісьменніка, "уганараванага Вялікай літаратурнай прэміяй Саюза пісьменнікаў Расіі", *загаманілі*. Праўда, сёння яшчэ рана казаць, чым запомніцца В. Казакоў беларускаму чытачу. Аднак у маёй асабістай літаратурнай гісторыі ён станецца пісьменнікам, ад кнігі якога я пацярпела, бадай, першую ў сваім свядомым літаратурна-крытычным жыцці паразу. Пад націскам "Халопа Яснавяльможнага дэмакрата" не толькі гэхнулі прафесійныя прынцыпы (нельга разважаць пра кнігу, якую не *да*чытаў!) — на пэўны час нават адступіла прафесійнае захворванне (кожная кніга, якую пачаў чытаць, будзе вярэдзіць цябе, пакуль яе не *да*чытаеш!).

Цягам некалькіх месяцаў упартага чытання "Халопа Яснавяльможнага дэмакрата" далей чацвёртага раздзела мне прарвацца не ўдалося. І гэта пры тым, што я не маю *асабістай непрыязі* да твораў, чый жанр (з вялікай доляй умоўнасці) можна вызначыць як антыўтапічную фантасмагорыю. Сама эпоха *замаўляе* творы, падобныя да "Кысі" Таццяны Талстой; нездарма ў літаратурнай прасторы сучаснай Расіі яна спарадзіла цэлую плойму наследаванняў, перайманняў ці, скажам мякчэй, пошукаў у тым жа кірунку (згадаем хоць бы раман Барыса Гайдука "Третья Мировая Игра"). У тым жа кірунку, што і аўтар "Кысі", рушыў і В. Казакоў; зрэшты, *прыкладна* ў тым жа кірунку, трымаючыся (наўмысна ці міжволі — не ведаю) на велізарнай мастацкай дыстанцыі. Быццё герояў "Халопа..." працякае ў сярэдзіне XXI стагоддзя, калі ўжо "светам кіруе Высокая сямёрка", а "Расію ў Сібрусію пераназвалі"; аўтар структуруе гэтае быццё, верагодна, у адпаведнасці з уласнымі поглядамі пра сучаснасць — і ўяўленнямі пра будучыню. Я з вялікай цікавасцю павандравала б па *сацыяльна-міфалагічнай* сістэме, выштукаванай В. Казаковым, — калі б ведала мову, якой пераказаны "Халоп Яснавяльможнага дэмакрата".

У зборнік "Цень гобліна" ўвайшлі раман, апавяданні, запісы ў "аўтарызаваным перакладзе з расійскай мовы". На шмуцтытуле "Халопа Яснавяльможнага дэмакрата" пазначана — "пераклад з рускай мовы аўтара", але, на жаль, не ўказана, *на якую мову* аўтар пераклаў свой "раман-дур". Я насамрэч адчайна не разумею, на якую, хоць дакладна ведаю, што не на беларускую. Трыццаць прачытаных мною старонак можна было б прывесці ў якасці аргумента цалкам; але давядзецца абмежавацца тым, што выхаплена *навобмацак*:

"...Прохар нядбайна матнуў рукой на палкі матавы шар ліпеньскага месяца, наліты нейкай нетутэйшай, маладой і дурлівай сілай";

"...Енах Мінавіч ямчэй уладкаваўся ўсё ў тым жа плеценым крэсле, некалькі разоў пагарцаваў на ім мясістымі ягадзіцамі...";

"...рускі дваранін некалі павінен быў... лакея часам менаваць "братка"...";

"...сярэдняй рукі дваранскі гербішка, з нейкай цаглянай не то заводскай трубой, не то худой прыгоннай вежай...";

"...мясцовая валадарка, Паліна Захараўна, дзябёлая, высушаная гадамі і працай жанчына...";

"...напусцілася было на яго Паліна Захараўна, але, убачыўшы блажэнную асобу старога, які бабылём дажывае век і хінецца да гэтай кветачкі як да цудоўнага пасланца.... з разуменнем уздыхнула ды пачала аддаваць нейкія распараджэнні...";

Словам, "усюды буяніла ціхае... жыццё", у нейкім "удзеле працягваюць пашальваць ліхія людзі", а таму ці варта пераймацца наконт дробязяў: "саноўнага мужа" з "уездам", "народнай тупасці, забітасці свядомасці" і г.д., і да т.п.

Як чалавек мэтаскіраваны, я цвёрда вырашыла дапяць хоць бы да якой сімвалічнай старонкі — 35-й, 66-й ці нават 100-й. Але, прачытаўшы першую фразу чацвёртага раздзела ("Пры ўсёй ліпеньскай цеплыні перадсвітальнай пары ў гэтых краях, як правіла, зімна") прызнала паразу. Зрэшты, за імгненне да капітуляцыі паспела зрабіць 2 высновы і знайсці 1 сціплае суцяшэнне: В. Казакоў перакладаў "Халопа Яснавяльможнага дэмакрата" з рускай мовы, бадай, на "сібрусінскую"; апошнюю павінны дасканала ведаць, прынамсі, два чалавекі на Беларусі — рэдактар кнігі А. Пашкевіч і карэктар А. Спрытніч; толькі пацярпеўшы паразу ад "Халопа...", я, нарэшце, займела прывідны шанц стацца сапраўдным літаратуразнаўцам (паводле класіфікацыі аднаго эсэістычна настроенага *вечна маладога* прафесара).

Ірына ШАЎЛЯКОВА

Людзям з Беласточчыны

Пра канкрэтных людзей, тым болей людзей таленавітых, заўсёды чытаеш матэрыял з неаслабнай цікавасцю. Сяргей Чыгрын, хоць сам са слонімскай зямлі, выдаў летась ажно дзве кніжкі, у якіх хораша расказаў пра тых, хто паходзіў з Беласточчыны. Іхнія імёны пакуль паўзабытыя, але цяпер ужо не кануць у Лету. Пра іх будуць ведаць і маладыя, кожны, хто цікавіцца роднай гісторыяй, лёсам, часам няпростым, тых людзей, што пакінулі след пра сябе. Гэта кніжка гісторыка-краязнаўчых і літаратурных артыкулаў "Беларуская Беласточчына" (Мінск, "Кнігазбор", 2008) і надрукаваная Праграмнай Радай тыднёвіка "Ніва" ў Беластоку незвычайна багатая на факты, асобы і здымкі кніга "З беластоцкай зямлі", якая нядаўна з'явілася ў Беларусі.

Пра новую кнігу Сяргея Чыгрына і хачу сказаць некалькі добрых слоў. Яна вылучаецца любоўна сабранымі фактамі. А мне як чытачу якога-небудзь глыбокага аналізу і не трэба. Факты падавай, факты, а высновы я зраблю сам. У кнізе Сяргея Чыгрына нарысы найперш пра такіх творцаў, што паходзілі з Беласточчыны, як крытык Серафім Андраюк, літаратуразнавец Уладзімір Казбярук, тэатразнавец Арсень Лабовіч, паэт і перакладчык Яўген Міклашэўскі, музыказнавец, тэлежурналіст і педагог Данат Яканюк, мастак Мікалай Несцярэўскі, цяпер яны жывуць у Мінску. Добра, што пра іх выйшлі нарысы на іх радзіме, бо тут у нас пра іх чамусьці маўчаць. Усяго аўтар распавёў пра 52 асобы.

З вялікім задавальненнем прачытаў артыкулы ў кнізе Сяргея Чыгрына пра звязаных з рэлігіяй Дамініка Аніську, Язэпа Дашуту, Антона Неманцэвіча, які некалі мне выпісаў пасведчанне пра хрышчэнне ў Альбярціне каля тагачаснага Слоніма, Уладзіміра Тамашчыка, Героя Савецкага Саюза Васіля Сакалоўскага, генерала Аляксандра Вашкевіча, вайскоўцаў Івана Гелду, Міколу Дзямідава, грамадска-палітычнага дзеяча, педагога, доктара філасофіі Міколу Чарноцкага, архітэктара Іосіфа Лангбарда, чые будынкі — Дом урада, Дом афіцэраў, Тэатр оперы і балета, Нацыянальная акадэмія навук — упрыгожваюць Мінск і сёння. У параўнанні з кніжкаю "Беларуская Беласточчына", дзе таксама былі нарысы пра Дзямідава, Тамашчыка, Сакалоўскага, Макаля, Неманцэвіча і іншых, кніжка "З беластоцкай зямлі" выгадна адрозніваецца тым, што ў ёй аўтар даў велізарную колькасць незвычайна цікавых і рэдкіх фатаграфій, ажно 125 штук.

Здымкі, паліграфічнае афармленне зрабілі выданне шыкоўным, раскошным, багатым, яго хочацца, перш, чым чытаць, прагледзець, пагартаць, звярнуць увагу на подпісы пад здымкамі. Многія фатаграфіі, якія я як энцыклапедыст і даследчык літаратуры, напрыклад, ведаю, звычайнаму чытачу дадуць дадатковую інфармацыю. Ну дзе, скажыце, калі ласка, чытач можа ўбачыць фота Серафіма Андраюка, малога з бацькамі і братамі ў роднай вёсцы на Беласточчыне ў канцы 1930-х гадоў? Ці здымак Гродзенскага гуртка беларускай моладзі 1910 года, на якой не толькі Адам Бычкоўскі (ягоную п'есу "У сваты" Сяргей Чыгрын нядаўна адшукаў і апублікаваў у студзеньскім нумары часопіса "Маладосць"), а і Зоська Верас (тады яшчэ Людвіка Савіцкая) і Уладзіслаў Чаржынскі (ён самы малады ў гуртку) і інш. Ці афішу-паведамленне пра смерць Адама Бычкоўскага ў Варшаве ў 1937 годзе. Па-мойму, у кніжцы Сяргея Чыгрына яна ўвогуле друкуецца ўпершыню. Чытачову ўвагу несумненна прыцягнуць такія фота, як пасяджэнне галоўнай управы Згуртавання беларусаў Канады, на якім Аляксей Грыцук, Міхась Мацукевіч, Кастусь Акула, Генрых Барановіч (1957г.), археолагі Сяргей Дубінскі і Аляксандр Ляўданскі падчас апрацоўкі матэрыялаў раскопак (пачатак 1930-х гадоў), здымак Івана Краскоўскага і Паўліны Мядзёлкі сярод вучняў у Дзвінску 1923 года. На фатаграфіі 1982 года ў Піцундзе Лідзія Арабей, Уладзімір Караткевіч, яго жонка Валянціна, Георгій Шыловіч, Уладзімір Казбярук, Аліса Шыловіч.

Шырокі чытач, здаецца, упершыню сустрэне ў кніжцы Сяргея Чыгрына "З беластоцкай зямлі" партрэты Д. Аніські, А. Бычкоўскага, С. Грынкевіча (малодшага), Я. Дарашкевіча (Янука Д.), Я. Хлябцэвіча, У. Чаржынскага і інш.

Як піша Яўген Вапа ў прадмове, Сяргей Чыгрын "у прапанаваным ім выданні ратуе ад забыцця падляшска-беларускі ланцуг невядомых шырэйшаму колу чытачоў дзеячаў. Аўтар — збіральнік і захавальнік памяці беларускіх прозвішчаў і імён Сямятыцкай, Гайнаўскай, Бельскай, Беластоцкай, Гарадоцкай, Крынкаўскай, Сакольскай, Дуброўскай зямель... Кніжка — маленькая спроба сплаціць перад імі (вядомымі людзьмі з Беласточчыны — **Я.С.**) наш доўг і абавязак памятаць пра роднае ". А Віталь Луба ў прадмове да кнігі С.Чыгрына "Беларуская Беласточчына" справядліва адзначае, што "яна — доказ жывучасці беларускіх ідэй не толькі на этнічнай Бацькаўшчыне, але і па-за яе межамі, у тым ліку і сярод беларускага насельніцтва Беласточчыны".

Застаецца толькі пажадаць руплівому аўтару добрага здароўя і спадзявацца, што ён сваю работу па апісанні біяграфій вядомых людзей з Беласточчыны будзе працягваць. Бо пісаць ёсць пра каго. Можа гэта і нясціпла, але падкажу аўтару, пра каго, мне думаецца. Сярод адышоўшых з гэтага свету чакаюць на асобныя нарысы (абавязкова, каб яны былі дапоўненыя рэдкімі здымкамі, як у кнізе "З беластоцкай зямлі") А. Чачуга, Я. Тарасэвіч, Э. Цюкша, М. Гайдук, У. Гайдук, М. Шаховіч, Ю. Геніюш, Г. Шыманюк, А. Свісёк, В. Склубоўскі, Я. Рэшаць, Я. Жамойцін, Н. Мушынская і многія іншыя. З цікавасцю прачытаў бы нарысы Сяргея Чыгрына пра людзей, якія апрацоўвалі беластоцкі фальклор, прынамсі песні — Л. Панько, Я. Бондара, Э. Гойліка, С. Лукашука... Толькі збірай матэрыял ды фота і пішы! Як кажуць, дзякуй за тое, давай другое!

І яшчэ. Ёсць у кнізе і некалі беластоцкіх ураджэнцаў, якія, на маю думку, не заслугоўваюць быць побач са знакамітымі асобамі Беласточчыны...

Яшчэ раз шчыра прызнаюся, што кнігу Сяргея Чыгрына "З беластоцкай зямлі" я адразу "праглынуў". І лічу, што беластаччане павінны ёю быць задаволеныя. А мы ў Беларусі — утрайне.

Янка САЛАМЕВІЧ

Бяроза чорная, бяроза белая...

Кнігу Аляксандра Валковіча "Береза черная, береза белая" (на рускай мове) выпусціла РВУ "Літаратура і Мастацтва" ў серыі "Лімаўскі фальварак". Яна трэцяя, пасля кніг Міколы Купрэева "Палеская элегія" і Анатоля Казлова "Горад у нябёсах". Аўтар сабраў у ёй лепшыя свае творы — нарысы, аповесці, апавяданні.

Спыніцца хачу на аповесці "Оберег". У ёй аўтар пранікнёна і захапляльна распавядае пра няпросты лёс удавіцы. Міжволі думаецца, што яе вобраз, як і лёс, тыповы для многіх сялянак таго часу...

Было ў бабы Дуні, раней маладзіцы, адно захапленне, якое яна пранесла праз ўсё жыццё — вышыванне. Жанчына вырабляла шлюбныя, падарункавыя, ахвярныя ручнікі, і ў гэтым майстэрстве ёй не было роўных. Ніхто не ўпаўнаважваў Еўдакію Казлову-Асмалоўскую шыць ручнікі для крыжа на ростані, што сімвалічна з'яўляецца развітальным востравам пацалункаў і слёз. Але месяц за месяцам, год за годам гэты аб'ект быў пастаянна ў полі зроку жанчыны. Дзесяткі ручнікоў вязаліся на крыж, своечасова мяняліся зношаныя. Нават яе стан здароўя жыхары вёскі вызначалі па тых жа ручніках...

А пачалося захапленне з вайны. Дунечка добра памятае, хоць і была маленькай, той дзень, калі Манька-паштарка прынесла ў вёску чарговую "пахаронку" (баі пад Прапойскам, сёння — Слаўгарад) і як царкоўны стараста вымавіў: "Шыйце, салдаткі, усім мірам абярэжны ручнік і нясіце яго ў храм. Абавязковая ўмова: вышыць у самым цэнтры Параскеву Пятніцу, бо яна з'яўляецца берагіняй хрысціянскага роду і ўсіх нашых ваколіц, маці зямная, захавальніца здароўя і сямейнага ачага. Трэба таксама, каб кожная жанчына, якая праводзіла кагосьці на вайну, вышыла на тым палатне з думкай аб родным чалавеку сваю персанальную памятку".

На ўсё адводзілася адна ноч. Як дакладна аўтар перадаў у творы настрой жыхароў вёскі, аб'яднаных адзінай думкай, — выратаваць, абараніць ад варожай кулі сваіх родных сілай Веры, Любові, Надзеі! У аповесці вельмі выразна расказана, як старанна працавалі сялянкі, аб'яднаныя святой справай, як неслі ўсім сялом той трапяткі ручнік-абярог у лазавіцкую царкву! Дні і ночы, пакуль доўжылася вайна, маліліся жанчыны за сваіх і чужых з верай у цудадзейную сілу абярэга.

Не менш цікавая аповесць А. Валковіча "Архангельская Алёнка с шоколадной обертки". У ёй аўтар ад свайго імя цікава і захапляльна расказвае пра моладзь і час сямідзесятых. Лесаэкспартны порт-рэйд, Архангельск, нейлонавыя кашулі, танцавальныя вечары ў партовым клубе і самыя прыгожыя ў свеце дзяўчаты...

Дзяўчынка, якая так прывабіла Сашу (аднаго з галоўных герояў аповесці) і якую ён запрасіў танцаваць, была на пратэзе (трывіяльная бытавая сітуацыя: абмарозіла ногі, хвароба, гангрэна)... Але якімі чароўнымі, незабыўнымі былі сустрэчы! Ім, маладым, дастаткова было блізкасці рук, даверлівасці вачэй і некалькі слоў пад купалам паўночнага неба...

А "Береза черная, береза белая", — гэта аўтабіяграфічны нарыс Аляксандра Валковіча, аснову якога складаюць вобразы бярозы белай — карыятыды, якія стрымліваюць пагрозу вайны, і бярозы чорнай — ахвяры атамных выбухаў. Аказваецца, чорныя бярозы ёсць і ў Беларусі. У Брэсцкай вобласці каля вёскі Турная расце цэлы гай (каля 200 дрэў) чорных бяроз — найбуйнейшы не толькі ў нас, але і ва ўсёй Еўразіі...

Пачынаецца нарыс з расповеда пра чорную бярозу, якая без жалю высмоктвала вільгаць і тым самым спустошвала глебу пятнаццаці сотак, адведзеных сям'і на ўскрайку пасёлка Дамачава, што ў Брэсцкай вобласці, але ні ў кога не ўзнімалася рука, каб спілаваць дрэва... Бацька аўтара быў удзельнікам выпрабаванняў атамнай бомбы на Тоцкім палігоне. Пагаршэнне стану здароўя старэйшага ў сям'і аўтар звязвае менавіта з гэтай падзеяй... Пісьменнік з такой цеплынёй, з такім захапленнем расказвае пра свайго бацьку, што міжволі задумваешся, як трэба цаніць родных, тых, хто з табой побач, сёння...

Ды што я вам пераказваю і спрабую заахвоціць да чытання? Набывайце "Березу черную, березу белую" ў кнігарнях, ці закажыце яе ў сваёй бібліятэцы — вандруйце з аўтарам, суперажывайце з яго героямі, і ўспамінайце сваё.

Валянціна СМАНЦАР

Дзве думкі

Літаратурная творчасць — выдатная магчымасць для аўтара звесці рахункі з рэальнымі крыўдзіцелямі і прасунуць жыццёвыя ісціны, набытыя на энным дзесятку зямнога веку ці запазычана-перастворaныя ў папярэднікаў. Думаецца, меў рацыю Сідні Шэлдан, калі сцвярджаў, што "калі б у свеце не было пісьменнікаў, то было б значна больш забойцаў, гвалтаўнікоў і падпальшчыкаў". У гэтым лішні раз пераконваешся, знаёмячыся з "адмысловай" прозай пэўных аўтараў, якія імкнуцца на старонках сваіх твораў узняцца да філасофскіх абагульненняў, падмацаваных жыццёвым вопытам пакрыўджаных лёсам і канкрэтнымі людзьмі персанажаў. Адны працуюць у дэпрэсіўным рэчышчы, другія — у эгаістычным, трэція — у рамантычным... Асаблівасць творчага метаду залежыць ад душэўнага стану аўтара і ступені ягоных літаратурных амбіцый. Псіхалогія творчасці — з'ява не менш цікавая, чым сама творчасць.

Апраўданне адзіноты, альбо У палоне эгацэнтрызму

А нядаўняга часу берасцейскі пісьменнік Алесь Паплаўскі быў вядомы пераважна як паэт, аб чым сведчаць яго вершаваныя зборнікі "Спынены лістапад" і "Незваротнасць". На працягу апошніх гадоў ён пачаў актыўна займацца прозай, вынікам чаго сталі кнігі "Тэрыторыя скразнякоў" (2004) і "Пастка для рэха" (2009). На сённяшні дзень А. Паплаўскі — аўтар некалькіх аповесцей, апошняя з якіх, "Бонза", была апублікаваная ў часопісе "Маладосць" (№ 6, 2009). А паколькі, па трапным назіранні Х. Р. Хіменеса, *"паэт правяраецца прозай"*, цікава зірнуць на творчасць берасцейскага пісьменніка з пазіцый "міжпрадметных сувязей", тым больш у друку пакуль не з'яўляліся разгорнутыя рэцэнзіі-водгукі на празаічнае "амплуа" аўтара. Праз "Бонзу" ж можна зірнуць на ягоную творчасць у цэлым.

Лірычны герой А. Паплаўскага — гэта надзвычай адзінокая і ранімая асоба, якая знаходзіцца ў адвечным канфлікце-супрацьстаянні не толькі з навакольным, але нават і ўнутраным светам. Адсюль адпаведныя мінорнасць стылю, беспрасветны адчай, тужлівы песімізм, душэўны разлад і заканамерная *колернасць* жыццёвага ўспрымання, выяўленая ў мудрагелістых метафарах і параўнаннях, што з псіхалагічнага пункта гледжання цалкам апраўдана: за імі лягчэй схаваць пустату. І калі ў паэзіі такую з'яву можна абгрунтаваць як праяву індывідуальнага творчага почырку, то ў прозе абстрактныя вобразы, створаныя багатым уяўленнем аўтара, могуць проста завесці чытача ў ідэйны тупік.

Было б памылкай лічыць, што пісьменнік стане іншым у прозе. Светаадчуванне не зменіш. Таму і *перабраліся* лірычныя героі А. Паплаўскага ў ягоныя аповесці ў нязменным выглядзе. І няхай пісьменнік будзе сцвярджаць адваротнае, але за празаічнымі персанажамі стаіць аўтарскае Я, аб чым яскрава сведчыць вядзенне аповеда ад першай асобы, праз якую праводзяцца пэўныя ідэі і жыццёвыя назіранні.

Я-герою А. Паплаўскага камфортна жыць адзінотнікам, бо вакольныя людзі для яго — патэнцыяльныя ворагі, якія нахабна ўрываюцца ў жыццё і літаральна *псуюць* зямное (і да таго бязрадаснае) існаванне. А паколькі ўцячы немагчыма, застаецца зацята-моўчкі ненавідзець іх. Пры гэтым Я-герой аўтара ў эгаістычным запале чамусьці забывае, што ён зусім не лепшы за іншых, тых, каму адкрыта супрацьпастаўляе сябе і абвінавачвае ва ўласных паразах лёсу: *"Гэты чалавек, пра якога я збіраюся вам расказаць, належыць да кагорты тых індывідаў, якія псуюць нам жыццё адною сваёй прысутнасцю. Яны замінаюць нам жыць па-людску. Іх робіцца шмат ужо з першай хвіліны знаёмства. Іх здольнасці і магчымасці, дасведчанасць і багаты вопыт заўжды амаль перабольшаныя... Іх бяскрыўдныя мары робяцца тым, каму выпала быць з імі побач, сапраўдным пеклам... Усё гэта мне давялося спазнаць на сабе. Майго жыцця хапіла б на сотню, а то і некалькі, прыкладаў"*. Але потым выяўляецца, што Я-герой абсалютна ідэнтыфікуецца са сваім ворагам-крыўдзіцелем: маўляў, *"я — гэта Бонза, Бонза — гэта я"*. Гульня ў раздвоенасць натуры не можа служыць апраўданнем супрацьлеглых учынкаў і паводзін, бо такім чынам выяўляецца сапраўдная — амаральная — сутнасць любой чалавечай асобы, здольнай мімікрываць у залежнасці ад абставін. Такая асаблівасць характару выклікае звычайнае адчужэнне і непрыманне.

У цэнтры аповесці А. Паплаўскага — ідэйны канфлікт Я-героя і Бонзы. Аўтар прасочвае іх узаемаадносіны з самага дзяцінства. Фізічна неразвіты хлопчык (Я-герой) імкнецца да сяброўства з фізічна развітым (Бонзам). У аднаго і другога няма паразумення з блізкімі ў сям'і. Але ў іх розныя, так бы мовіць, жыццёвыя арыенціры. Я-герой цягнецца да Бонзы з-за адчування беспрасветнага адзіноцтва і кволасці. А той здзекуецца з гэтага дзівака і ігнаруе, самасцвярджаючыся за кошт ягоных слабасцяў. Нараджаецца крыўда, якая праходзіць з пакрыўджаным праз усё жыццё. І абвастраецца ў чарговы раз, калі ўжо дарослы Я-герой зноў сутыкаецца з Бонзам, па віне якога страчвае работу і дзякуючы якому ўладкоўваецца на добрую пасаду ў ягонай фірме (найперш дзеля помсты).

Чым вытлумачваецца непарыўная повязь персанажаў? Што прымушае аўтара зводзіць іх разам праз шмат гадоў? Банальны жыццёвы эпізод: Я-герой выпадкова стаў сведкам таго, як Бонза, такі важны і моцны, мыў ногі свайму айчыму ў тазіку. Гэты сакрэт, нібыта злачынства, аб'яднаў іх і зрабіў адным цэлым. Бонза не можа пагадзіцца з тым, што нейкі "неданосак" бачыў акт ягонага прыніжэння. Калі цябе прыніжаюць, інтуітыўна не жадаеш паўтарэння гэтага і імкнешся прынізіць слабейшага. А калі ён яшчэ бачыў тваю бездапаможнасць перад іншым, то маральнае знішчэнне проста неабходна — дзеля вяртання сапсаванага іміджу.

Ці ажыццявіў свой план Я-герой? З-за ўласнай нявытрыманасці і імпульсіўнасці гэта было нерэальна. Не вытрымаўшы, ён неяк выказаў Бонзу ўсё, што пра яго думаў, чым абумовіў сваё дачаснае звальненне і зыход у нікуды: *"Ведаеш, Бонза, вяртаюся ў думках да таго выпадку, калі ты ў дзяцінстве мыў ногі свайму айчыму. Мне заўсёды хацелася спытацца ў цябе: чаго ты так мяне баяўся тады, ды і зараз? Ты не хочаш, каб пра гэта даведаліся ўсе? Ты неўзлюбіў людзей. Ты пры любой магчымасці выплюхваў на іх сваю крыўду. Ты прыраўняў усіх да свайго айчыма. Для цябе было ўсё роўна, вінаватыя яны ці не. Табе здавалася, што толькі так ты здольны перамагчы ў сабе свае крыўды. Я таксама стаў ахвярай тваіх амбіцый. Ты паўсюль праследаваў мяне, ты быў маім ценем. Ты замінаў мне жыць, Бонза... Я стаміўся. З-за цябе ўсё жыццё маё наперакасяк... Спачатку я хацеў засадзіць цябе за краты, але потым перадумаў. Я не стану пэцкаць аб цябе рукі. Прыйдзе час і ты сам за ўсё разлічышся"*. Зашмат выкшталцонай гаварыльні. Пісьменнік не павінен *вылазіць* праз персанажа ў такой псіхааналітычнай манеры...

Шчыра кажучы, Я-герою не верыш. Гэта звычайны няўдачнік, які вырашыў перакласці свае жыццёвыя паразы на чужыя плечы. Перш чым абвінавачваць кагосьці, варта зірнуць найперш на сябе. А рабіць гэтага не хочацца. Бо сам выклікаеш агіду. Ды і якая можа быць паслядоўнасць пры пастаяннай раздвоенасці натуры, на якую спісваюцца ўласныя заганы, у тым ліку і мізантропія. Гэта нядзіўна: звычайны эгаізм. Я такі-растакі, а яны — палкі ў колы! Я-герою варта было б спачатку пазбавіцца ад суцэльнага якання і пачуцця абранасці. Заўважу: такія *плаксівыя* персанажы *блукаюць* па старонках усіх аповесцей А. Паплаўскага, што сведчыць пра яўную заканамернасць і зададзенасць творчага крэда, абумоўленага няйнакш псіхалагічнымі комплексамі. Асноўныя героі аўтара — невылечныя *якалы*, няздольныя ўжывацца ў любым грамадстве з любымі людзьмі, бо не могуць пераступіць праз уласны эгаізм і пакінуць межы ўяўнай свабоды, з-за чаго асуджаны на вечнае самавыгнанне і нарцысісцкае самалюбаванне...

Пазіцыя Я-героя выклікае недавер ужо з першага сказа аповесці: *"Колькі яго памятаю, заўсёды карцела набіць яму морду. Проста так, без прычыны"*. Дык чаму ж у такім разе ты цёгаўся за крыўдзіцелем неадступным ценем?! І пра мордабіццё тады — ні слова... Дзе логіка? Відавочна, пісьменніку спатрэбіўся эфектны пачатак для твора. Але тады неабходна і канцы з канцамі неяк зводзіць. Ды і не б'юць морды без прычыны, проста так. Гэта дзікунства, паталогія... Прасцей кажучы — ***паказушная літаратуршчына***...

Я-герой удакладняе: *"Ёсць людзі, якіх ненавідзіш за адно толькі тое, што яны існуюць, што ад іх нікуды не дзецца. Яны, як лёс — назаўжды. Яны, як цень — неадступна побач. Не раз лаўлю сябе на вар'яцкай думцы, што нашы цені і ёсць душы незнаёмых нам людзей, без якіх мы маглі б з лёгкасцю абысціся, што цягаем мы гэты цяжар за нейкую прынцыповую правіннасць, і ад гэтага бескарыснага, непатрэбнага нам клопату, які дадзены звыш, як неабходнасць, мы хутка старэем, робімся немачнымі, не такімі, якімі б маглі быць насамрэч. Мы перараджаемся ў палахлівых і пакорлівых да гідлівасці людзей. І ўсё з-за таго, што цягаем за сабою чужыя цені. Будучыня — моцная анестэзія. Але як толькі не стане мяне, не стане нікога іншага. Нашто мне такая будучыня? Я хачу жыць цяпер і тут. Людзі, маніякальна адданыя ісціне, якая ў пераважнай большасці адносная, мяне не цікавяць. Бо аб'ектыўнасць для мяне, — амаль тое ж, што і безаблічнасць"*. Я-я-я-я-я-я-я... Жыць у свеце Я-героя не тое што страшна, а немагчыма і проста нецікава. Бясконцыя развагі пра апраўданне сваёй значнасці і зямной прысутнасці за кошт іншых, залічаных у ворагі ўласнаму эга.

Вернемся да *метадалогіі* паэта-празаіка А. Паплаўскага. У сваім творы ён наўмысна звяртаецца да вядомай біблейскай гісторыі з мыццём ног, што сімвалізуе пакорлівасць і змірэнне. Аналогія ўзнікае двойчы: калі Бонза мые ногі айчыму і калі незнаёмы дзядок "працуе Мыйдадзірам" у дачыненні да Я-героя ля святой крыніцы. Мыццё — гэта ачышчэнне і сябе (духоўна), і таго, каго мыеш. Але ў даным выпадку такая аналогія даволі сумніўная і недарэчная — *прыцягнутая за вушы*. Ізноў жа з адной мэтай — дзеля эфектнасці. Няўжо айчым не мог памыць ногі ў ванным пакоі? Навошта выкарыстоўваць анахранізм з тазікам ды яшчэ прымушаць старога паўтараць Хрыстовы *подзвіг* і збітыя пропаведзі? Па-мойму, гэтыя сцэны штучныя, нежыццяздольныя — ***чыста літаратурныя***... Як, дарэчы, і параўнанне ў канцоўцы твора нейкай цаглянай агароджы са Сцяной Плачу. Эфектна? Не. Гэта якраз той выпадак, калі вобразы ствараюцца выключна дзеля вобразаў, вытыркаючыся з агульнага кантэксту сваёй ненатуральнасцю і малаверагоднасцю...

І яшчэ. Аўтар піша: *"У іх кватэры заўсёды пахла крадзеным"*. Гэта як? У чым адрозненне паху крадзеных рэчаў ад некрадзеных? Упэўнены, што аўтар сам не здолее даходліва растлумачыць чарговае *эфектнае* параўнанне. Разам з тым трэба аддаць належнае майстэрскай абмалёўцы псіхалагічных партрэтаў персанажаў, дзякуючы якой яны раскрываюцца ва ўсёй сваёй непрывабнай *велічы*.

Я-герой А. Паплаўскага лічыць адзіноту вялікім шчасцем. З улікам ягонага характару гэта выглядае сапраўдным паратункам. Адзінота апраўдваецца ўласнай недасканаласцю і нікчэмнасцю, няздольнасцю трымаць удары лёсу, а яшчэ душэўнай слабасцю, невылечным эгаізмам і псеўдафіласофскім самакапаннем, якое ў выніку прыводзіць да самазакопвання і самаразбурэння.

Сяргей ГРЫШКЕВІЧ

Параніць неабыякавасцю

Кніга аповесцяў Алеся Паплаўскага Пастка для рэха" — сапраўдная "пастка" для чытача. Пачаўшы яе чытаць — трапіўшы ў лабірынты, створаныя пісьменнікам, удумлівы чытач рызыкуе застацца там надоўга: пакуль не расшыфруе знакі і імёны рэальнасці ў неверагодна ірэальнай прасторы мастацкага свету... Словам, кніга, нягледзячы на некаторую легкаважнасць афармлення вокладкі, патрабуе актыўнай духоўнай і інтэлектуальнай працы.

Усе аповесці маюць падобную структуру — паралельна развіваюцца два пласты, узаемасувязь якіх да пэўнага часу пісьменнікам не раскрываецца, і толькі напрыканцы дзве сюжэтныя плыні зліваюцца ў адну — тады здымаюцца ўсе маскі, раскрываюцца ўсе загадкі. Але з пасткі тым самым чытач не выбаўляецца — атрымаўшы "новую інфармацыю", хочацца вярнуцца ў пачатак, каб з іншых пазіцый асэнсаваць прачытанае.

Ірэальнага, загадкавага, таямнічага ў кнізе сапраўды шмат. Аднак разам з тым няма абстрактнасці ў апісаннях герояў і месца дзеяння, абсалютна зразумела, што падзеі адбываюцца ў рэальным часе, у рэальным беларускім горадзе. Такая мастацкая праўда. Таму падчас чытання кнігі ўзнікае не адчуванне фантастычнасці свету, створанага А. Паплаўскім (свет гэты цалкам рэальны), але адчуванне фантастычнасці жыцця. Аўтар падкрэслівае не тое, што героі жывуць падвойным жыццём, а тое, што сапраўднае для іх — толькі адно з апісаных.

Найбольш гэта датычыць аповесцяў "Закахацца ў малпу" і "Піраміды". Пісьменнік, мабыць, наўмысна падкрэслівае звычайнасць герояў. Напрыклад, валацуга Мелеш ці намеснік мэра Віктар Віктаравіч Котаў. Усё нібыта звычайна. Але А. Паплаўскі — майстар дэталяў. Дзеяннямі герояў кіруе мінулае, а таму, каб зразумець сэнс твора, трэба быць пільным найперш да тых караценькіх згадак дзяцінства, юнацтва герояў, што сустракаюцца ў творах.

Першая фраза пра Мелеша: "У гэтым горадзе ў Мелеша ёсць дзве справы: знайсці свайго брата і памерці". І галоўнае ў аповесці "Закахацца ў малпу", як высветліцца пазней, зусім не ў гэтым: не ў тым, што два бамжы бавяць галоднае існаванне за філасофскімі размовамі, не ў тым, што ім прапаноўваюць зарабіць грошы ў некім сумнеўным псіхалагічным эксперыменце і нават не ў тым, што Мелеш сапраўды настойліва шукае брата. Пяцігадовая дачушка Мелеша Яна загінула пад коламі аўтамабіля, за рулём якога быў ён сам. Гэта няшчасны выпадак, жахлівы збег акалічнасцяў,.. А ў любым выпадку — *"камень, імя якому грэх"*. Аднак пра гэта — пра ключ да ўсяго, што адбываецца, — нібы мімаходзь, вельмі сцісла.

Па-першае, таму што самому Мелешу пра гэта цяжка згадваць; па-другое, таму што пра такое цяжка і пісаць, і чытаць. Але задума пісьменніка, мабыць, не ў гэтым. Ва ўсіх чатырох творах прысутнічае тэма непазбыўнай віны альбо невыказнага болю. Менавіта гэта робіць трывіяльных на першы погляд герояў выключнымі. Але каб *параніць* чытача *неабыякавасцю* (а пісьменнік гэта зрабіў, нават калі і не імкнуўся), патрэбна была вельмі моцная канцэнтрацыя болю, дасягнуць якой можна было толькі такім шляхам: схаваць тэму ў недаказанасць, у нераскрытасць. Тое ж і ў аповесці "Пастка для рэха".

Крыху выбіваецца з агульнай стылістыкі аповесць "Бонза" — псіхалагічная галаваломка. Пісьменнік апісвае, па сутнасці, бясконцы двубой паміж героем, ад імя якога вядзецца аповед, і яго знаёмым, суседам Бонзай. Героі сапернічаюць ва ўсім са школьных гадоў. Першы, насуперак Бонзу, робіць добрую кар'еру, а Бонза, у сваю чаргу, падстаўляе яго і правакуе звальненне з прэстыжнай працы. Апавядальнік дае свайму "саперніку па жыцці" шмат характарыстык, аднак усе яны — выключна негатыўныя, часам проста на мяжы прыстойнасці, ён ненавідзіць Бонзу, ён апісвае яго так, што гідлівасць перадаецца і чытачу. Аднак у "заключным слове" апавядальнік прызнаецца: *"Бонза — гэта я. А я — гэта Бонза"*. Гэта акурат той выпадак, калі трэба вяртацца ў пачатак. Такім чынам, "Бонза" — гэта аповесць пра сябе, не ў тым сэнсе, што пісьменнік Алесь Паплаўскі распавядае пра сябе самога, але ў больш шырокім, універсальным сэнсе — пра *сябе*. Зрэшты, галоўныя героі ўсіх чатырох аповесцяў шукаюць у часе няспраўджаных надзей саміх сябе.

Хочацца вярнуцца да метафары пасткі. Пакуль чытач яшчэ "ў кнізе" — ён мае агульную мову з аўтарам, мае спадзеў на разгадку і пачуваецца адносна спакойна. А як толькі яе загортвае, то адразу ж пачынае сумнявацца ў рэальнасці існага. Таму не спяшайцеся гэтую кнігу загортваць — магчыма, менавіта так трапляюць у пастку да рэха...

Жанна КАПУСТА

Яўген ГУЧОК

* * *

Як я стану паміраць,
Будзе жаўранак спяваць,
Будзе сонца долу ліцца,
Ну а хтось і зажурыцца;
Толькі ж я яго прашу:
"Уздымі сваю душу,
Паглядзі у неба пільна,
Там няма прыкмет магільных;
А дзе тых няма прыкмет,
Адшукаеш там мой след".

* * *

Як быў смяротна я патлівы
І як ляжаў ледзь не ў труне,
Пейзаж нябёсаў зіхатлівы
Раптоўна ўзяў ў палон мяне.

І сілай надзяліў такою,
Якой няма у дольніх з'яў...
Відаць, нябачнаю рукою
Хтось незямное штось мне даў,
Ізноў адчуў свае я ногі,
І клічуць зноў мяне дарогі.

* * *

Забяры ў мяне памяць, Божа,
Пра бязладдзе ў былым,
Калі штосьці не надта гожае
Я зрабіў на шляху сваім.

А зняважаным дай забыцца
На ўчынкі мае ў іх бок...
Хай у памяці іх зацьміцца
У мой адрас дакор і папрок.

* * *

Што я жыву невысока,
Пра гэта мне шэпчуць аблокі,
А неба бяздонная сінь
Мяне заклікае:
"Уздымайся, мой сын!"

* * *

Ў часіны смерці блізкіх нам людзей
Мы, як ніколі, блізкія да Бога;
А плачам і журбоцімся таму,
Што час і нам да Божага парога.

Ў часіны смерці блізкіх нам людзей
Мы, як ніколі, блізкія да Бога;
А плачам і журбоцімся таму,
Што й мы не варты Божага парога.

* * *

Радасць майму сэрцу,
Светласць — галаве...
На маім балконе
Ластаўка жыве.

На маім балконе
Неба больш штодня.
Носіць яго й носіць
Новая радня.

Радуецца сэрца,
Светла ў галаве...
На маім балконе
Ластаўка жыве.

* * *

Чым больш хвароб,
тым болей крылы
Я адчуваю за плячмі;
Вось толькі б унутраныя сілы
Да часу поўнага магілы
Уратавалі тыя крылы —
Каб не размыла іх слязьмі.

* * *

І усё, што нас мучыць,
І ўсё, што гняце,
Адыдзе ў нябыт,
Назаўжды прападзе;
А думы? Пачуцці?
Што голаў цяжараць
і ціснуць грудзі?
Таксама яны не вернуцца,
Пройдуць яны —
і пылам абернуцца...
Прыдарожным — калі мы тлелі,
І зорным — калі гарэлі.

Анатоль ТРАФІМЧЫК

Стансы

У тым усім, што я пішу,
Пярэчыць часта слову слова
Таму, што я сваю душу
Ствараю кожны раз нанова.

Шукаю кожны раз свой склад,
Нібы сябе ў жыцці шукаю.
Так рыфмаваны лістапад
Нясе даніну прозе-маю.

Калі збіраешся заснуць,
Успамінаеш часта яву.
Таму гаворыць пра вясну
Мая паэзія-праява.

Як дні мае, за лістам ліст
У нашым небыцці знікае,
Але — апошні мадэрніст
Постмадэрніста нараджае.

Яскрава бачачы мяжу,
Якой завершваецца снежань,
Я адваротнае кажу:
Не існуе ніякіх межаў!

Хоць з успамінамі пра май
Прыйшла зімы мне прахалода,
Я буду — не сваім няхай —
Чужым чыімсьці Новым годам.

* * *

Усё сышло:
Дабро і зло,
Каханне і нянавісць.
Я на мяжы
Сляпой імжы
Ці нават у анклаве.

Няма падзей
Сярод людзей,
Сціраюцца ўсе канты,
Няма мяне
Ў маім акне,
Няма прыстаўкі "анты-".

Апошні юр
Літаратур
Ляціць у космас прама.
Ягоны след —
Сапраўдны свет —
Застыў абсурду драмай.

* * *

N.
Как Вы милы!..
А. С. Пушкін

Нам лепей застацца на Вы
і думкі выказваць намёкам,
каб змесціва галавы
і сэрца нябачным для вока
было і спакойным для нер-
ваў. Лепей застацца на Вы,
прычым захаваць нежывы
тон гутарак нашых, і вер-
шыкаў не пісаць і тым больш
цябе не знаёміць з такімі,
што выклікаць могуць боль,
якога ўжо сэрца не прыме
і выштурхне ў месцы, дзе швы
пасля накладуць на руцэ.
Супынім жа гэты працэс,
нам лепей застацца на Вы.
Саткуць паасобку ставы
сувоі жыццёвых абзацаў...
Ці лепей застацца на Вы?
То лепей зусім не застацца.

* * *

Ад дзяцінства не плакаў наўзрыд,
Хоць хацелася вельмі, — паверце.
Уцячы безгалова ад смерці
Не памог ні mein Gott, ні Майн Рыд.

Ад дзяцінства мой светлы настрой
Пралятаў, як па глосах рэмарка.
Не чытаючы нават Рэмарка,
Не пазычыш у фатума мрой.

Ад дзяцінства у зубы каню
Заглядаць мяне цягне і цягне.
Растрывожылі Ніцшэ і Вагнер,
І паставіў да сценкі Камю.

І не плачацца болей наўзрыд.
Не бушуюць вербальныя смерчы.
Уцякліся пачуцці ад смерці:
Праз кірыліцу ды — у санскрыт.

* * *

Я — убожество. Ты — Божество!
Ігар Шклярэўскі

Твой кожны след увекавечыць
Хацеў бы вершыкам сваім.
Твой след — як свет, агонь і дым,
І дом, дзе грэюся на печы.

І слова кожнае тваё мне
Хацелася б крануць губой
І языком, каб змог запомніць
Твой смак і смех,
і жыць — табой.

Твой кожны жэст
і кожны рух твой
Зарыфмаваць, уклаўшы ў троп, —
І можна жыць — над сіняй бухтай,
Без рыфм, алюзій, лішніх стоп.

P. P. S.

Калі я існую — то ў пачуцці,
Што не сышло ў нябыт вясной са снегам
І не змагло хоць некуды сысці,
З'яўляючыся Альфай і Амегай.

Я праганяў яго і разам з тым
Так прагнуў. Бачыць болей не жадаў я
Аб'екта пачуцця. Астынь, астынь, —
Казаў сабе. І быццам бы ад шчаўя,

Крывіўся я ад слёз, якія праз
Неверагоднасць рытму альбо спектру
Стваралі ці той вобраз ці абраз,
За што душу прадаць хацелі пеклу

Героі рэлігійных міфаў. Я ж
Хацеў забыцца, і гарэлка часам
Дапамагала замяніць міраж
На іншы свет —
на трохі менш няшчасны...

У пачуцці — аднак жа існую,
Але наступіць і яму — Амега,
І радасць тую сумную маю
Закідае быццё пустэльным снегам.

Фота Кастуся Дробава

Вольга САКАЛОВА

Рэчанька глыбокая

Скажы, рэчанька, мне, глыбокая,
Чаму броду нідзе не відаць?
Кінь жа кладачку ты шырокую,
Я каханне пайду сустракаць.

Толькі рэчанька засмяялася:
— Ты паслухай, аб чым я скажу —
Ты на кладачку спадзявалася,
Толькі ж кладачкай лёс не звяжу.

Бо каханы твой, мая светлая,
Не глядзіць у твой бок, не глядзіць.
Калі й высную, запаветную,
То па ёй не табе ўжо хадзіць...

Ах ты, рэчанька, мая родная,
Не кажы пра яго, не кажы...
Берагі твае, век нязводныя,
Для кагосьці звязаць не спяшы.

Мы блукалі ў садзе адзіноты

Мы блукалі ў садзе адзіноты.
Мы хадзілі сцежкамі вясны —
Я шукала там тваю пяшчоту.
Ты мяне гукаў у свае сны...

Ты не падарыў свае пяшчоты.
Я не заляцела ў твае сны...
Мы блукалі ў садзе адзіноты,
Так і не заўважыўшы вясны...

* * *

Падае лісток зялёна-жоўты,
Светлым прывітаннем і паклонам
Ад пары, што першай пазалотай
Пасылае нам свае законы...

І ляціць кляновы той лісточак
На мае стамлёныя далоні...
Колькі іх зляціць яшчэ да ночы?
Колькі адарве іх вецер вольны?

* * *

Як знайсці тыя словы,
Што маглі б пра каханне сказаць?
Па гаях ды дубровах
Разышліся яны сумаваць...

Як знайсці тую сцежку,
Што каханне ў мой сад прывяла?
Чаму гэтак паспешна
Ды травою густой парасла?

* * *

А яна ўзяла дый закахалася,
І ступіла ў свой вясновы сад...
Нечаканым шчасцем умывалася —
Хто сказаў,
што позна ў пяцьдзесят?

А наўкола ўсё жыло дзівосамі:
Для яе ўзыходзіла зара!
Шчасце бегла ейнымі пракосамі,
І кахаць прыйшла яе пара!

І яна, шчаслівая і светлая,
Расцвіла, хоць мела пяцьдзесят...
Сустракала долю запаветную
І ступала ў свой вясновы сад.

Учора лета спявала...

Учора лета спявала,
Суцяшала душу,
Сёння восень шаптала,
Залаціла мяжу.

Учора ветрык нясмелы
Ціха лашчыў мой твар,
Сёння ў сэрцы збалелым
Дагарае пажар...

Заплятала касу

Заплятала касу —
Чапурылася...
Як згубіла красу —
Зажурылася.
Дзе ж вы, стужкі мае
Каляровыя?
Дзе ж вы, сцежкі мае
Чабаровыя?

Партызанская фантазія

Юрась НЕРАТОК

Старонкі з аповесці

Чацвёра былых аднакурснікаў адпраўляюцца на радзіму да аднаго з іх, каб да прыезду астатняй групы падрыхтавацца да пікніка, прысвечанага дзесяцігоддзю заканчэння ВНУ. Па дарозе да возера, дзе плануецца правесці сустрэчу, хлопцы праходзяць загадкавую паляну, якую мясцовыя называюць Бесавай або Нежытым, і трапляюць пад навальніцу. Пасля навальніцы яны аказваюцца на той жа тэрыторыі, але адкінутымі ў часе на дзесяцігоддзі — у першыя пасляваенныя гады. Напачатку непрыстасаванья, турысты ўсё ж асвойваюцца ў непрыхільнай эпосе, якую ўяўлялі з падручнікаў і сродкаў масавай інфармацыі па-рознаму, аднак зусім не такой, якая яна на самай справе...

Твор не прэтэндуе ні на гістарычную дакладнасць, ні на гістарычную фальсіфікацыю — толькі адпавядае жанру.

Дасье на кожнага месье

— *Ну что, господа диверсанты, как спалось?* — бесклапотным тонам Крайчук надаваў сабе ўпэўненасці. — *Прошу по одному входить в штаб. Будем заводить личные дела. А заодно расскажете, за что убили Берковца. Гвоздева и Микитку — тоже ко мне. Пусть сидят все время. Что надо — спрошу. Возможна очная ставка.*

Крайчук, спакойны звыш меры, выкладаў усё канкрэтна і амаль без акцэнту. Але ўсё ж не стрымаўся.

— Ды развяжы ты гэтых цялят! Толькі Андрэю ногі звяжы! І глядзі, каб не пабеглі на дурніцу! — Загад тычыўся Базыля Шаптовіча. — А пасля з вамі разбяруся, паскуднікі. А то дзе балявалі, там і блявалі!

— Не блявалі мы, Акім Вацлававіч!

— Во-во! Адзін здаўся. Не блявалі, то я вам дрыстачку ўстрою... Выконвай, што сказана!

Першым у зямлянку, дзе месціўся штаб, выклікалі Мураўскага.

— Акім, скажыце, а дзе камандзір?

— *Теперь я тебе командир, диверсант Муравский...* О, дык ты і па-беларуску гаворыш!

Крайчук не хацеў, ды і не меў права расказваць пра тое, што камандзір партызанскага атрада Сямён Ходас асабіста з чатырма байцамі пайшоў *перастрэць* машыну, якая павінна была везці грошы з Кружыслава ў Луначарск. Думалі балышавікі, перахітруюць, калі зранку ў нядзелю паедуць. А халера вам у бок!

Педантызм Акіма Вацлававіча не быў задаволены: дыверсанты не блыталіся ў сведчаннях, аднак давалі абсалютна абсурдныя звесткі. А лысы Андрэй Садкоў з разбітым тварам яшчэ і невядома якія крымінальныя артыкулы фармуляваў...

Крайчук удумліва ставіў пытанні і ўвесь час добрасумленна запісваў адказы. Пакуль — алоўкам на чарнавік. І цяпер, калі адпусціў усіх чацвярых пад канвой Базыля Шаптовіча і Адама Косача, разглядваў уласнаручна напісаныя лісткі і нічога не разумеў. Інцыдэнт з Беркаўцом Акім разабраў лёгка, хоць і загадаў яшчэ раз праверыць, ці добра звязаны Садкоў. Учарашні банкет Ягора, Базыля і Вінцэся таксама быў простай справай. Ды пакуль невядома было, як караць. Завадатара нядрэнна б і расстраляць, каб не панадна было... На шчасце, у хуткім часе вярнуўся Ходас.

— Восем тысяч рублёў адгрэблі, Акімка! Петрака толькі паранілі ў плячо: чырвонагаловік з касай ехаў. Машына едзе, на Мішкіну міну колам — бум! Яна круць-круць і глухне... Пятрок Леварукі гранату — кідзель! Машына і грымнулася. Бензін выцек — і запалала! Салдат саскочыў і з калена — у наш бок! Мішка — яшчэ гранату! А пасля паклалі, як зайцоў...

Крайчук прывычна чакаў, пакуль Ходас супакоіцца. Затым выклаў бачанне сітуацыі на дадзены момант. Сямён Апанасавіч за доўгі камандзірскі тэрмін навучыўся не толькі выслухоўваць даклады, але і прымаць рашэнні амаль імгненна:

— Усё зразумела, Акім. І ўсё, як заўжды, проста. Дыверсантаў трэба раздзяліць. Разам з Вінцэсем у разведку — Ягора. Незалежна ад вынікаў паслязаўтра сыходзім да Вітухноўскага. Цяпер аблава непазбежная. Нават калі б громакаўцы касу ўзялі, усё роўна на нас бы накінуліся. Мы ім — як костка ў горле: ворагі новага ладу... А праз два дні ці праз два тыдні? Пакінем для абароны Гваздзёва, дыверсантаў і мо разведчыкаў, калі вернуцца. З дыверсантаў, дурныя яны або занадта хітрыя, — толку ніякага, апроч рэквізіту, — згодны? А калі ўмеюць рэзаць партызанаў, то страляць балышавікоў — яшчэ прасцей. Сем чалавек могуць іх добра патрэсці! А лягуць — няхай Валачок думае, што амаль усіх паклаў. Шаптовіча не чапай. Ён — ніякі, з-за жонкі перажывае... Базыль — свой чалавек.

— Коней ім пакідаць, калі што?

— З глузду ты з'ехаў, Акіме! Куды яны паскачуць? У чыстае поле, пад кулі? А як мы правіянт і зброю павязём? На гарбе? Ці думаеш, што ў Вітухноўскага запасаў — на армію? Добра, калі сам яшчэ цэлы! Во, няхай пакуль нашыя штрафнікі — Ягорка і Базыль — валакушы падладзяць. Ці мо гэтага, Косціка, да Базыля прыстрой. Гэта ж у ягоным ранцы сякерка ляжала? Значыць, не пусты ў гэтай справе чалавек. А Вінцэся за Тосяй пашлі, няхай прыйдзе Петрака падлячыць. І, напэўна, гэтага зуха, Андрэя Садка, з ім. Правер, як ён з хлопцамі.

— Ты, Сымон Апанасавіч, відаць, на аперацыі перагрэўся. Садка расстраляць патрэбна!

— Не, Акім Вацлававіч, гэта ты забыў, хто камандзір, — як адрэзаў Ходас. — У нас людзей лішніх нямашака. Хацка — да Гваздзёва: чыстка-змазка-ўвязка зброі. А з Антончыкам сам папрацуй. Раскажы пра нашыя задачы, як ты гэта ўмееш, а ён хлопцам сваім няхай данясе. Калі і пакідаць дыверсантаў, то трэба, каб яны біліся за нас, а не ўцяклі або не здаліся. Раскідай усіх па розных аб'ектах і паглядзі, хто на што здатны.

— А як паўцякаюць, Сямён?

Ходас крыва пасміхнуўся:

— Куды? У багну? Ці да балышавікоў? Мо да Громака? Няма ў іх варыянтаў!

— Ты што, у атрад іх хочаш прыняць?

— Ну, прыняць — не прыняць, аднак тут будуць. Абыдуцца пакуль без Прысягі, а лыжкі выдай. І Садка развяжы, а то спутаў як жарабца!

— Дык ён жа Казіка...

— Казік сам занадта разагнаўся! Ты б што зрабіў з тым, хто табе пысу расквасіў, а пасля да сасны прыпёр?

— Я — справа другая...

— Во-во! А ён — трэцяя! Абодва дурні. Быў бы адзін разумны — саступіў бы. І ў нас няма варыянтаў, апроч як ім даверыцца. А людзям паверыш — і яны твае. Ці першы раз, Акімка? Ну і, можа, пераапрані дыверсантаў, калі вошай не баяцца. Асабістую зброю не выдавай пакуль, а прыстраляцца дазволь. Ты іх хоць пакарміў?

— Пад'елі па чарзе, пакуль дапытваў.

— Няхай са сваіх запасаў ядуць. Толькі кансервы не чапай — спатрэбяцца — і гарэлкі не давай. Ні ім і нікому! А што яны табе расказалі пра шыфроўкі, якія там жа, дзе і гэты, як яго, "Памлет"?

— "Гамлет", Сымоне, трагедыя Шэкспіра.

— Не тлумі галаву! Што за шыфроўкі?

— Рэестры нейкія, кажуць, быццам бы магазінныя. Нешта я ў магазінах такога не бачыў, і шрыфт нейкі амерыканскі, пакручасты...

— Ну, мы шмат чаго не бачылі з таго, што яны з сабой прынеслі. Нават рацыі з палец даўжынёй — Амерыка! Хоць і не працуюць. І запальнічкі, якія бензінам не пахнуць... А як і не Амерыка, а нешта іншае — нам усё адно: лятаць яны не ўмеюць, страляць з дрына — таксама. Усё!

Ходас рашуча падняўся і выйшаў.

Акім Вацлававіч падліў у чарнільны парашок вады, узбоўтаў чарніліцу, адсунуў на край стала. Дастаў пёравую ручку, выцягнуў старое пяро, прыладзіў новае і шырокім прыгожым почыркам напісаў на вокладцы новага школьнага сшытка з профілем Сталіна на вокладцы і гімнам Савецкага Саюза на зваротным баку:

Група «Д-16Ж».

Затым раскрыў старонку і пачаў пісаць.

Мураўскі Антон Уладзіміравіч.

Г. н. прыбл. 1915—1920, дакументаў няма, паказанні не адпавядаюць рэчаіснасці.

З сям'і інтэлігентаў-спецыялістаў. Гандляр скабяным таварам.

У атрадзе з'явіўся ў складзе дыв. групы 16 жніўня 1947 года. Старшы групы.

Прыцягваўся ўладамі да адміністрацыйнай адказнасці за вольналюбівыя погляды.

Мае польскія карані, аднак лічыць сябе беларусам.

Бацька загінуў у барацьбе з акупантамі.

Добра валодае беларускай і рускай мовамі, ведае начаткі польскай, здольны выкладаць і разумець асноўнае на англійскай.

Характар спакойны, разважлівы, упэўнены. Перакананні ўстойлівыя. Здатны да аналізу сітуацыі, пры валоданні абставінамі можа ўзначаліць невялікую групу (5—10 чалавек).

Да лёсу Радзімы ставіцца спачувальна.

Хацко Аляксандр Дзмітрыевіч.

Г. н. 1915 — устаноўлена па паказаннях, хаця выглядае маладзей; сапраўдныя дакументы адсутнічаюць.

З сям'і разначынцаў. Бацька — інжынер-мостабудаўнік, маці — гандлярка. Аднаасобнік на мяжы разарэння з-за дзяржаўных структур. Неаднаразова штрафаваўся за нявыплату падаткаў.

Ёсць прымешак юдэйскай крыві, сябе лічыць карэнным беларусам.

Добра размаўляе на рускай мове, разумее і валодае асновамі беларускай. Няблага ведае англійскую і некаторыя тэрміны на нямецкай.

Схільны да кампрамісу, рызыкоўны ў межах разумнага, здольны працаваць як асобна, так і ў камандзе.

Лёс Радзімы хацеў бы палепшыць.

Садкоў Андрэй Міхайлавіч.

Г. н. прыбл. 1915—1920, дакументы адсутнічаюць, па паказаннях устанавіць немагчыма.

З сям'і рабочых. Швейцар у публічным доме.

У атрадзе з'явіўся 16 жніўня 1947 года.

Мае канфлікт з Савецкай уладай, прыцягваўся да крымінальнай адказнасці, уцямна прычыну не назваў.

Бацька — рускі, прапаў без вестак.

Больш-менш валодае толькі рускай мовай, якую лічыць роднай, аднак сябе называе беларусам. Беларускую мову разумее.

Характар неўраўнаважаны, помслівы. Перакананні хісткія. Здольны на рызыкоўныя ўчынкі, самаахвяраванне. Хваравіты да ўласнае абразы. Можа быць выкарыстаны на адказных аперацыях у складзе групы з вызначанай субардынацыяй. Аднаасобных дзеянняў з-за няведання моў і няякаснай ацэнкі абставін лепш не давяраць.

У шчаслівым лёсе Радзімы перакананы.

Дзямкевіч Канстанцін Сяргеевіч.

Г. н. 1915—1920, дакументы адсутнічаюць, устаноўлена па паказаннях.

Бацькі — беларусы. Бацька — каморнік, маці — ветэрынар. Абодва трагічна загінулі. Сам — тэхнік на металургічным заводзе.

Свабодна размаўляе на беларускай і рускай мовах, аднак роднай лічыць рускую. Трохі ведае нямецкую.

Характар мяккі, спагадлівы. Можа быць выкарыстаны ў аперацыях, не звязаных з рызыкай для жыцця, або ў складзе групы з дакладнай іерархіяй і жорсткім камандаваннем.

Лёс Радзімы лічыць "нармальным".

Акім Вацлававіч яшчэ раз уважліва перачытаў дасье; пры гэтым успамінаў фрагменты допытаў. Усе дыверсанты, як адзін, былі шчырымі, хоць незразумелых слоў і звестак хапала.

Мураўскі размаўляў на беларускай мове, але на нейкай не мясцовай. Ну, можа, у іх у сталіцы так і гавораць. Расказаў пра тое, што перспектывы ў партызан ніякай няма, а Беларусь праз сорак пяць гадоў сама сабой зробіцца незалежнай. Калі Акім намякнуў на фізіка Тэслу, адказаў туманна: маўляў, нешта вучылі, цяпер не помню. А на пытанне, як адбудоўваецца Мінск, Антон сказаў, што там пару гадоў таму пабудавалі Нацыянальную бібліятэку і пракладваюць трэцюю лінію метрапалітэна. Ведаў Крайчук, што Нацыянальная бібліятэка даўно ёсць, толькі балышавікі яе Ленінскай называюць. Ведаў, што трамвай нядаўна пусцілі, аднак, каб метро? Халера іх знае!

Хацко адказваў бойка, як па гатовым. Бадай, задумаўся, калі начштаба спытаў пра магчымую дапамогу Захаду. Верагоднасць расстрэлу за забойства Казіка Аляксандра Дзмітрыевіча не азадачыла. "Будзеце адказваць, Акім Вацлававіч!" "Перад кім?" "Перад гісторыяй". "Ты, я гляджу, да жыцця ставішся па-філасофску?" "Ага, а да філасофіі — па-жыццёваму..." Пра Нацыянальную бібліятэку пацвердзіў, а пра метро сказаў, што "не ў курсе, бо не карыстаецца".

Садкоў паводзіў сябе нахабна. Яго не астудзіў нават пільны позірк Крайчука, лісліва-патрабавальны тон і ўзведзены наган. А пра сітуацыю з Беркаўцом Андрэй выказаўся проста: "Не крышы батон, камандзір, я ўсё па паняццях зрабіў! Пачаў бы ён мяне душыць, пацаны б заступіліся, а малы пахерачыў бы ўсіх. І самога Казіка здуру. І было б у цябе пяць жмуроў замест аднаго... Прадумваць такія камбінацыі трэба! Лахануўся твой Казік".

З Дзямкевічам было прасцей, чым з астатнімі. Але палахліва-шчырыя адказы нікольки не пераканалі Крайчука, што хлопцы і насамрэч у атрадзе выпадкова і ніадкуль. Паверыць было нельга — тое, што адбывалася, у нейкай ступені адпавядала літаратурнаму досведу Акіма, аднак стопрацэнтна супярэчыла цвярозаму розуму.

Міхась ДАНІЛЕНКА

Чыгун — дабрадзей

Абразок

У апошні дзень фальклорнай экспедыцыі Паліна Рыгораўна сказала студэнтам:

— Тут недалёка вёсачка, у якой жыла мая бабуля Тэкля. Можа, заглянем туды?

— Абавязкова! Пайшлі зараз жа! — падахвоціліся студэнты.

Ліпаўка (так звалася вёска), лічы, дажывала свой век. Амаль кожная трэцяя хата глядзела на свет забітымі дошкамі вокнамі. На многіх гародах буяў бур'ян. Некаторыя дзічкі, што раслі паўз платы, паўсыхалі. Праўда, ліштва пад дахам дома бабулі Тэклі яшчэ не абшалушылася ад фарбы (некалі фарбаваў Палінін муж).

Паліна Рыгораўна расчыніла веснічкі, дастала з рукзака ключ, які загадзя прыхапіла ў горадзе, і адамкнула замок.

Пад столлю веранды дзе-нідзе блыталася павуціна, патыхала запусценнем. Адчувалася адсутнасць чалавека. Урэшце зрэдку Паліна з мужам наведваліся ў Ліпаўку — нават вясною садзілі бульбу. Так што Тэкліна хата яшчэ не зусім апусцела.

— Згатуем абед у печы, — прапанавала выкладчыца студэнтам.

Тыя не доўга думаючы, падаліся да градаў, падкопвалі карчы бульбы — "падглядвалі", ці ўбраліся ў сілу клубні. А Паліна Рыгораўна прывычна змяла сажу, адсунула юшку, падклала пад паленцы (ляжалі тут з вясны) лучынку і чыркнула запалкай. З істопкі студэнты цягнулі ўжо вядро, а Косця валок нават бідон.

— Вады набяром. Хоць памыемся ўволю, — сказаў ён.

— Зараз, мае дарагія, я вам пакажу нештачкі незвычайнае, — таямніча прыклала да вуснаў палец Паліна Рыгораўна.

Яна на момант знікла ў расчыненых дзвярах клуні і вынесла адтуль... здаравенны чыгун.

— Ну, і што? — расчаравана пераглянуліся студэнты.

— Пачакайце. Гэта чыгун незвычайны. Яго бабуля Тэкля заўсёды называла "чыгун-дабрадзей". І калі ставіла ў печ, дык — помню — абавязкова прыгаворвала: "Чыгун-дабрадзей — для харошых людзей".

Умомант Косця з сябрам прыцягнуў ад калодзежа вады, а дзяўчаткі пачалі скрэбці (у гэтых мясцінах кажуць "абіраць") бульбіны і апалоскваць у вядры.

А Паліна Рыгораўна расказвала студэнтам, як некалі прыязджала з горада да бабулі Тэклюсі (так яна яе называла) і тая апавядала малой пра цудадзейны чыгун, які лізала гарачае полымя ў печы.

Цяпер выкладчыца старалася з такой жа інтанацыяй расказваць пра чыгун сваім юным сябрам:

— Цяжкі быў той год. Блакадай заціснулі, як стальным абручом, партызан у Амелькаўскіх лясах. Дык толькі чыгун-дабрадзей на вогнішчы і выручаў, калі даставалі з яго звараную бульбу з абабкамі. І абавязкова партызаны прыгаворвалі, як і іхняя паварыха Тэкля: "Чыгун-дабрадзей — для добрых людзей. А для злыдняў і ворагаў — куля ды агонь ад пораху..."

— Ой, як цікава! — схапілася дзяўчына Ліля за блакнот. — Я зараз запішу. Гэта ж — сапраўды знаходка для фальклярыстаў.

Студэнты нібы такі цуд бачылі ўпершыню — абмацвалі чыгун. Многія, мусіць, сустрэлі такую штуковіну ўпершыню (выраслі ў горадзе). Налілі ў яго вады, што прынёс Косця, пасунулі віламі на вышчарблены спод печы. Пачалі чакаць, калі зварыцца бульба. А кандыдат навук Паліна Рыгораўна расказвала пра маладую Тэклюсю, якая некалі пякла партызанам праснакі, варыла кашу ды бульбу ў чыгуне-дабрадзеі.

— Адным словам, чыгун-дабрадзей...

— ...для добрых людзей! — хорам закончылі студэнты і пачалі рассаджвацца на верандзе.

— На наступнае лета абавязкова пойдзем у Амелькаўскую пушчу, — падахвоцілася Ліля.

На веранду заляцеў матылёк. Пачаў пырхаць пад столлю, пакуль не ўблытаўся ў павуціну. Хлопцы пасунулі стол і пачалі ратаваць бедака.



Таямнічая прастора сцэны

Дзмітрый Мохаў — сцэнограф, добра вядомы па спектаклях у драматычных і музычных тэатрах Беларусі і шэрагу іншых краін. Яму ўласцівае імкненне ствараць разнастайнымі сродкамі сучаснага тэатра і мастацтва архітэктуры вобразы складаныя, небытавыя, запамінальныя і загадкавыя. Яго сцэнічныя канструкцыі вызначаюцца філіграннасцю пабудовы. І таму тэатр Д. Мохава з'яўляецца наватарскім і прыцягальным.

Не дзіва, што на спектаклі ў яго афармленні імкнуцца гледачы. Не меншую цікавасць выклікаюць выстаўкі Д. Мохава. Адна з апошніх па часе ладзілася ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва, дзе экспанаваліся эскізы, макеты, праекты для спектакляў у тэатрах нашай краіны, а таксама Расіі, краін Прыбалтыкі, Сярэдняй Азіі, Каўказа і іншых. Прыцягвалі ўвагу архітэктурныя праекты мастака, эскізы дэкарацый да вядомых фільмаў "Я — Францыск Скарына", "Хрыстос прызямліўся ў Гародні".

— *Шматгадовы досвед працы ў тэатры, кіно, у архітэктуры дазваляе мне думаць, што пачаткам, першакрыніцай у стварэнні прасторавых структур з'яўляецца драматургія. У драматычным тэатры — гэта п'еса, у музычным тэатры — музыка, у кіно — сцэнарый, у архітэктуры — праектная пабудова,* — кажа мастак.

Тая выстава прысвячалася юбілею Дзмітрыя Мохава і таму на ёй былі прадстаўлены работы за ўвесь перыяд яго творчасці — ад самага пачатку, 1970 года, — спектакля "Марыя" паводле А. Салынскага ў Новасібірску да нядаўніх тэатральных праектаў. Сярод іх — таямнічы "Лес" А. Астроўскага, пастаўлены ў Смаленскім драматычным тэатры (рэж. М. Шчаглоў). У сваёй рабоце мастак зыходзіў з таго, што драматург надаваў назве твора першаступеннае значэнне. Лес мусіў прысутнічаць на сцэне як гэткі "ўтваральнік" атмасферы страху і чагосьці невядомага. Мастак перадаў гэтую атмасферу праз няўлоўнае святло і цені. Зменлівае святло, шэразялёна-белыя колеры ў розных мізансцэнах падаваліся адметна. Высвечвалася тонкая мэбля, абрысы дрэваў і кожны раз па-новаму акрэсліваліся героі, у залежнасці ад таго, якімі бачыў і ў якой прасторы "падаваў" мастак.

Цікава вырашана Д. Мохавым прастора спектакля "Дом Бернарды Альбы" паводле Ф. Г. Лоркі Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага (рэж. В. Карпілаў). Эскізы мастака простыя, нават аскетычныя, прытым у іх дакладна прачытваецца задума аўтара. Дом Бернарды Альбы — гэта турма, у якой павінны жыць яе дочкі, асуджаныя на адзіноту і бясшлюбнасць. Прыкрываючыся дагматамі царквы, ідучы супраць жаданняў і волі сваіх дачок, Бернарда Альба такім чынам, як ёй здавалася, пакланялася законам грамадства. Насамрэч жа — душыла ўсё жывое, што насяляла яе дом. Гэта адразу ж прачытваецца ў эскізах Д. Мохава. Ён паказвае замкнёны халодны дом Бернарды Альбы, у які не трапляе святло для яе дачок. Сціплы крыж сімвалізуе не толькі веру ў бога, але і забарону на звычайнае жыццё са сваімі радасцямі і надзеямі, з марамі маладых асоб. У фінале ж спектакля пакой дома ператвараецца і ў апошні прытулак дачок, з якога сапраўды няма выйсця.

— *У пошуках эквіваленту рэальнай жыццёвай прасторы паводле зададзенай драматургіі неабходны вобраз, метафара, сімвал. Як яны ўзнікаюць ? Ці гэта памяць, ці мара — нешта такое, што не дае спакою і вядзе да ўзнікнення імпульсу, які нараджае творчы акт. Зарад гэтага імпульсу аб'ядноўвае думкай і пачуццём драматургаў, кампазітараў, рэжысёраў, мастакоў, архітэктараў, прафесійныя намаганні творчых людзей, адкрываючы нам таямніцы прасторавых структур,* — разважае мастак.

Асобнай выставай можна было б прадставіць яго работы ў Тэатры-студыі кінаакцёра Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм", дзе Д. Мохаў быў галоўным мастаком з 1983 па 1994 гады, на якія прыпадае зорны час гэтага тэатра.

Макет да спектакля "Генералы ў спадніцах" выкананы пераважна ў чорна-белых колерах і сёння застаецца сучасным і цікава раскрывае п'есу Ж. Ануя. Удала спалучаюцца ў гэтай рабоце метал і шкло, цікава ўведзены ў сцэнічнае дзеянне веласіпеды і лесвіцы, якія надаюць не толькі сучаснасць прачытанню твора Ануя, але і дынамізм мізансцэнам.

Адзначу, што лепшыя спектаклі Тэатра-студыі кінаакцёра пастаўленыя менавіта ў сцэнаграфіі Д. Мохава: "Шчасце маё..." А. Чарвінскага, "Камедыя пра Лісістрату" Арыстафана, "Жаніцьба Бальзамінава" А. Астроўскага, "Чалавечы голас" Ж. Както, "Саракавыя", "Фантазіі паводле Гогаля" У. Грыцэўскага і іншыя. Работа мастака тут вылучаецца прафесійным адчуваннем драматургічнага матэрыялу. Яго інтэр'еры і вынаходніцкія канструкцыі заўсёды камфортныя для герояў спектакляў. Напрыклад, усю сцэнічную прастору спектакля "Шчасце маё..." запаўнялі звычайныя і такія знаёмыя для пакалення 1940-х гадоў рэчы: драўляная школьная парта, глобус, вядро і пры ім кубак на ланцужку. Гэтыя рэчы былі неадрыўныя ад людзей, якія насялялі спектакль мастака Д. Мохава і рэжысёра Б. Луцэнкі.

Прыцягальнымі з'яўляюцца эскізы дэкарацый Д. Мохава да музычных спектакляў. Опера "Князь Навагрудскі" кампазітара А. Бандарэнкі (рэж. С. Штэйн) уражвала сваім афармленнем, жывапіснымі дэкарацыямі ў бела-блакітнай колеравай гаме і прыдуманым мастаком эфектам заслонаў, змена якіх захапляла "музычнасцю".

Цікава вырашаны мастаком і балет "Мефіста" У. Кандрусевіча ў Беларускім дзяржаўным музычным тэатры. У спектаклі дзейнічае пад'ёмна-апускная ўстаноўка "Павук" з падсвятленнямі, доўгімі шлейфамі, незвычайным святлом, срэбным пакрыццём дэталяў. Усё гэта надавала відовішчу фантастычнасць, загадкавасць.

Дзмітрый Мохаў застаецца сучасным і нечаканым у кожным сваім сцэнаграфічным праекце. Сучасная драматургія тэатра — найпершая крыніца яго натхнення. З 2007 года ён працуе мастаком-пастаноўшчыкам на "Беларусьфільме"; выкладае курс сцэнаграфіі ў БДУ культуры і мастацтваў; з 2008-га выкладае на кафедры жывапісу Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, а яшчэ ён — кіраўнік курса мастакоў кіно.

Вераніка ЯРМАЛІНСКАЯ

Радуемся разам

150 гадоў мінула з дня нараджэння скрыпача, кампазітара, педагога Канстанціна Горскага (1859 — 1924), творчая дзейнасць якога ў пэўнай ступені належыць да беларускай культуры. Нарадзіўся ён у Лідзе, вучыўся ў Мінску, у Вільні; прафесійную музычную адукацыю атрымаў у Варшаве і ў Пецярбургу. Меў славу бліскучага выканаўцы твораў П. Чайкоўскага. З музычна-сцэнічных твораў К. Горскага вылучаецца опера "Маргер", прысвечаная гісторыі Вялікага княства Літоўскага і напісаная паводле твораў У. Сыракомлі. На радзіме музыканта ў горадзе Ліда заснаваны конкурс юных скрыпачоў імя Канстанціна Горскага.

З пачаткам лета музыка, можна сказаць, пакідае замкнёную прастору залаў і выходзіць на адкрытае паветра. Традыцыйныя канцэрты артыстаў Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі адбыліся на вольным паветры ля сцен Полацкага Сафійскага сабора і побач са старажытным замкам у Міры, а новы

праект "Ля фантана" дэбютаваў 4 ліпеня. Канцэрт прайшоў на пляцоўцы каля галоўнага ўваходу ў Вялікі тэатр. У першай частцы праграмы была прадстаўлена сусветная оперная класіка, затым прагучалі папулярныя песні 1940-50-х гадоў. А вось у парках нашай сталіцы кожную нядзелю з чэрвеня па жнівень можна слухаць духавыя аркестры. Апроч вайсковых і народных духавых калектываў, у гэтым праекце ўдзельнічае выбітны прафесійны канцэртны аркестр "Няміга".

Гран-пры VII Міжнароднага конкурсу юных піяністаў "Прыступка да майстэрства", які праходзіў у Санкт-Пецярбургу, атрымаў 14-гадовы беларускі музыкант Андрэй Шычко. Ён вучыцца ў Рэспубліканскім каледжы пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі ў вядомага педагога Наталлі Ташчылінай, якая выхавала нямала таленавітых піяністаў, у тым ліку і лаўрэатаў міжнародных конкурсаў. Наколькі прэстыжная перамога ў конкурсе "Прыступка да майстэрства" сведчыць той факт, што гэтае піяністычнае спаборніцтва з 2000 года ўваходзіць у Еўрапейскі саюз музычных конкурсаў для юных выканаўцаў.

Відэакомплекс "Цэнтр-відэа", размешчаны на ніжнім паверсе папулярнага мінскага гандлёвага цэнтра "Сталіца", радуе сваіх наведнікаў і ўлетку. У чэрвені прайшла тут прэм'ера дакументальнага фільма Ігара Бышнёва "Рака жыцця" і творчая сустрэча з аўтарам гэтай новай стужкі, створанай на "Беларускім відэацэнтры" па замове Міністэрства культуры краіны. Гледачы атрымалі эстэтычную і, безумоўна, інтэлектуальную асалоду ад філасофска-паэтычнага расповеда пра Яе Вялікасць Бярэзіну-раку і лёс чалавека, цесна звязанага з прыродай, — самабытнага мастака Анатоля Бухаркіна з Бярэзінскага запаведніка. А не так даўно "Цэнтр-відэа" запрасіў на чарговую імпрэзу з праекта "Адкрыты фармат". Гэтым разам кінаманы атрымалі магчымасць пазнаёміцца з разнастайнымі і цікавымі амерыканскімі фільмамі — удзельнікамі, а сярод іх і прызёрамі, міжнародных фестываляў. Паказ пад красамоўнаю назвай "Планета кіно: ЗША" працягваўся тры тыдні.

Лана ІВАНОВА

На здымках: партрэт К. Горскага; духавыя інструменты гучаць і на вернісажах.

Фота Святланы Берасцень

Прыязджаў класік

Класікам айчыннага дзіцячага кіно лічаць вядомага рэжысёра Леаніда Нячаева. 17 гадоў працаваў ён на Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм", зняў каля дзесятка музычных казак, самыя вядомыя з якіх — "Прыгоды Бураціна", "Пра Чырвоны Каптурок", "Прададзены смех", "Рыжы сумленны, закаханы", "Пітэр Пэн" — упадабала ўжо не адно пакаленне гледачоў. На пачатку 1990-х Л. Нячаеў пераехаў у Маскву. Не так даўно ён пабываў у нашай сталіцы — па запрашэнні Музея гісторыі беларускага кіно.

Да 70-годдзя майстра тут наладзілі рэтраспектыўны паказ яго фільмаў, а таксама выстаўку, на якой былі прадстаўлены касцюмы кінагерояў, мастацкія эскізы, рэквізіт. У Мінску прайшло некалькі сустрэч з Леанідам Нячаевым, адбылася прэм'ера яго стужкі "Дзюймовачка" (2007 год), адзначанай шматлікімі ўзнагародамі на расійскіх і міжнародных фестывалях. Паводле слоў кінарэжысёра, у Расіі, на жаль, ніхто не хоча ўкладаць грошы ў здымкі фільмаў для дзяцей, бо затраты, як правіла, не акупаюцца: нават кошт білетаў на дзіцячыя сеансы нізкі. У выніку здымаць такое кіно мала хто бярэцца. Леанід Нячаеў прызнаўся нашым журналістам, што калі б цяпер ад "Беларусьфільма" паступіла прапанова стварыць фільм для дзяцей, ён прыняў бы такую прапанову з радасцю і — з вялікім хваляваннем, бо без пастаяннай практыкі цяжка працаваць над новай стужкай.

Я. КАРЛІМА

Усе аблічча акварэлі

Акварэліста, мастацтвазнаўцу, педагога Уладзіміра Рынкевіча ведаюць як аўтара шматстайных і адметных твораў, кніг пра акварэльны жывапіс, навуковых работ, рэспубліканскіх мастацка-прапагандысцкіх, выставачных праектаў. З 1975 года ён, выхаванец славутага мастацка-графічнага аддзялення Віцебскага педагагічнага інстытута, актыўна ўдзельнічае ў выстаўках (у тым ліку замежных), у міжнародных пленэрах. Яго персанальныя экспазіцыі ладзіліся ў Іспаніі, Італіі, Польшчы, Расіі, а творы знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, сталічным Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва, Літаратурным музеі Янкі Купалы, Віцебскім мастацкім музеі, у Нацыянальным мастацкім музеі ў Варшаве, Музеі сучаснага рускага мастацтва ў ЗША, у шэрагу галерэй Расіі. Рэпрадукцыі некалькіх дзесяткаў жывапісных твораў У. Рынкевіча выдаваліся масавым тыражом. Прытым ён плённа займаецца навукай: пасля абароны кандыдацкай дысертацыі напісаў доктарскую, на матэрыяле якой падрыхтаваў новую кнігу — "Станковая графіка Беларусі XIX — XX стст.". А яшчэ — выкладае ў БДУ культуры і мастацтваў. Персанальная выстаўка У. Рынкевіча была нядаўна зладкаваная ў Палацы культуры горада Маладзечна.

С. ВЕТКА

На здымку: акварэль У. Рынкевіча.

Фота Віктара Кавалёва

Працяг тэмы

Супраць выхавання людзей-«чыпаў»

Дыскусія, якая вядзецца ў “ЛіМе” на старонках “Сядзібы муз”, мяне глыбока ўсхвалявала. І таму ўсхвалявала,што пастаўленыя праблемы даўно, практычна ўсё свядомае жыццё, мяне цікавяць, і таму яшчэ, што дзесяткі разоў я выказвалася пра тое ж у друку. Але ўсё, што пішаш, нібы правальваецца ў бездань. У адказ – поўнае маўчанне. “Парадоксы нашага жыцця”, надрукаваныя ў трох выпусках часопіса “Полымя” за 2007–2008 гады, выклікалі шырокі рэзананс, абмяркоўваліся і ў пісьменніцкім асяродку, і ў педагагічным, і сярод студэнтаў. Хацелася б, каб такая ж увага да зробленага праявілася і ў беларускім друку. Нагадаю, што нашы тоўстыя часопісы складаюцца не толькі з мастацкіх твораў, але напалову – з публіцыстычных нарысаў, навуковых артыкулаў, мемуарных нататкаў, дзённікаў, рэцэнзій. Крытыка крытыкі або крытыка публіцыстыкі – з’ява даволі нязвыклая, але яна неабходная, каб прыцягнуць увагу грамадскасці да набалелых праблем сучаснасці.
Ды і мас-медыа – усё ж такі, мяркую, не забароненае поле для аналізу.

З такім аналізам я шмат разоў выступала на канферэнцыях і ў спецыялізаваных навуковых выданнях. Але такога кшталту выданні — маладасягальныя для шырокай публікі. “ЛіМ” — папулярная газета інтэлігенцыі. А інтэлігенцыя заўсёды заклапочана грамадскімі праблемамі больш, чым асабістымі. Сёння, можа быць, больш важна не стылёвае майстэрства пісьменніка, а яго грамадзянская пазіцыя. Бо сітуацыя з адукацыяй і выхаваннем у нас проста крытычная. Крытычная, калі не катастрафічная, яна, праўда, ва ўсім свеце. Але тая краіна першая выйдзе з крызісу (тое, што мы перажываем, — крызіс не толькі фінансава-эканамічны, але ўсеагульны, сістэмны), якая адчуе неабходнасць будаваць усе адносіны ў грамадстве на аснове культуры, прычым сапраўднай культуры, а не тэлевізійнай. Інтэлігенцыі неабходна крычаць і біць у званы штодзень, штогадзіна, на кожным кроку, нагадваць і нагадваць пра рост бездухоўнасці, пра страту нацыянальнай душы, заняпад беларускай мовы. Аднак грамадская думка таўчэцца на пытаннях, хоць, можа, і важных, але не лёсавызначальных. Скажам, наконт абавязковасці экзамену па замежных мовах. Мне ўжо даводзілася пісаць пра абывацельскі літаральна шабаш адносна вывучэння англійскай мовы, які ахапіў насельніцтва ў 1990-я і пазней. Што і казаць — патрэбна. Ды толькі жыццё паказала: ці не ўсе, хто добра вывучыў мову, выехалі на пастаяннае жыхарства за мяжу. Велізарная колькасць дзяцей тых, каго можна аднесці да нацыянальнай эліты, ужо не грамадзяне Беларусі. Будзем і далей рыхтаваць для чужых краін лепшыя кадры? Існуе закон, аксіёма: канцэнтрацыя ўвагі на замежнай мове непазбежна вядзе да паслаблення патрыятычнага пачуцця. Таму чарговы шум падымаць не варта.

Сапраўды, усё пачынаецца з адукацыі, са школы. Аўтарка “ЛіМа” Алена Мінчукова (гл. нумар за 26.06.2009 г.) піша пра кампазітара, якому ні разу ў жыцці не спатрэбілася валентнасць. Я — таксама прадстаўнік гуманітарнай сферы. Слова “валентнасць” я ўжывала ў фігуральным сэнсе ў адносінах да мастацкага вобраза, а зусім не ў яго літаральным значэнні. Увогуле, мне звесткі па фізіцы, астраноміі, біялогіі і іншых навуках у жыцці былі ўсё ж, хоць і абмежавана, але неабходныя. Дзякуй Богу, у савецкай школе яшчэ давалі трывалыя веды па большасці дысцыплін, хоць ужо і тады па фізіцы, скажам, скіроўвалі ўвагу не на прыгажосць, гармонію і загадкавасць прыродных працэсаў, не на пазнанне фенаменальна мэтазгодных законаў прыроды, а на апісанне іх у формулах, якія выклікалі непазбежную агіду ў дзяцей. Значыць, ужо ў савецкі час пачалося адвучванне моладзі ад арганічнай і натуральнай прагі пазнання. Сёння мы — у канцы працэсу. Празмерная матэматызацыя шматлікіх прадметаў адбівае любоў дзяцей да ведаў. Матэматыка патрэбная — хто спрачаецца, але ў школе яна патрэбная для таго, каб развіваць лагічныя структуры мыслення, а тут можна абысціся значна меншай колькасцю формул і тэарэм. Пра развіццё мозгу, і лагічных яго структур, і асабліва вобразных, аднак, ніхто не клапоціцца. Усё толькі дэкларуецца, а практычна робіцца роўна наадварот.

У апошнія гады студэнты-пачаткоўцы, што прыходзяць да нас на філфак БДУ, проста здзіўляюць сваёй фенаменальнай неадукаванасцю ў нейкіх базавых рэчах, якія павінен ведаць кожны сучасны чалавек. Я выкладаю дысцыпліну “Гісторыя і тэорыя сусветнай культуры”. Пачала на кожнай лекцыі на экране, акрамя мастацкіх слайдаў, паказваць карту, бо проста называць нейкую мясцовасць няма сэнсу — дзеці не ўяўляюць, дзе знаходзіцца тая ці іншая краіна, нават у якой частцы свету. Такое ўражанне, што мы з імі геаграфію адкрываем упершыню. Зразумела, па ёй жа тэсты не пісалі. З гісторыяй — яшчэ горш, хоць па ёй якраз на філфаку тэсты здаюць. У школьнікаў і абітурыентаў няма цікавасці да прыроды і этнічных асаблівасцей насельніцтва іншых краін, да жыцця ўласных продкаў, няма звычкі да чытання. Яны жывуць нікчэмнымі, дробязнымі інтарэсамі, якія яшчэ і падагравацца з экранаў тэлевізараў, са старонак бульварных выданняў. Няшчасныя дзеці заходзяцца ў істэрыках, аплакваючы Майкла Джэксана і абыякавыя да таго, што вакол іх ніхто не гаворыць па-беларуску, а гэта — сапраўдная трагедыя. Не пакідае, аднак, уражанне, што той жа нікчэміцай жывуць і чыноўнікі. Таму — які там клопат пра душу: нашым упраўленчым структурам здаецца, што тэлевізар якраз усе патрэбы душы і задавальняе, навошта яшчэ кнігі! Апошнім часам праграмы па літаратуры скарацілі напалову!

Памятаю, у нас у савецкай школе, нават у 10-м і 11-м класах, урокі мовы і літаратуры былі абсалютна кожны дзень, і натуральна, лічыліся галоўнымі. Але тады і дыктары па радыё і тэлебачанні гаварылі выключна па-беларуску. Даходзіць да трагіфарсу, бязглуздзіцы, дзікага абсурду: на факультэце міжнародных адносін у БДУ раней чытаўся курс “Гісторыя культуры Беларусі”, які сёлета скарацілі дзеля большай колькасці гадзін па замежных мовах. Як быццам усё правільна. Але чыноўнікам няўцям, што нашы дыпламаты ці менеджэры па турызме павінны не толькі ўспрымаць заходнюю культуру, для чаго і патрэбна замежная мова, але і несці ў свет сваю, актыўна яе прапагандаваць! Як жа гэта рабіць, калі яны яе абсалютна не ведаюць?! Зноў тое ж: лічыцца, што сувенірнасць дызайну і тэлепапса — і ёсць сапраўдная нацыянальная культура. Калі студэнты шчыра здзіўляюцца, што ў Беларусі, аказваецца, шмат чаго было і ёсць, пра што яны і не здагадваліся, хочацца плакаць.

У апошнія гады студэнты-пачаткоўцы, што прыходзяць да нас на філфак БДУ, проста здзіўляюць сваёй фенаменальнай неадукаванасцю ў нейкіх базавых рэчах, якія павінен ведаць кожны сучасны чалавек.

У адной з нядаўніх перадач ток-шоу “Выбар” большасць бацькоў выказалася супраць Цэнтралізаванага тэсціравання. Народ — мудры, людзі бачаць, як дэградуе моладзь, адчуваюць, што ў школах вучаць не таму і не так. Нарэшце, б’юцца з чыноўнікамі і навукоўцы, у прыватнасці, расійскія. У “Литературной газете” прафесар Вячаслаў Купрыянаў піша: “Тэкст, прапанаваны як мазаічны “тэст”, супярэчыць лагічнай аснове мыслення і маральна-этычнаму імператыву. Правільнае побач з няправільным пры няведанні гэтага правільнага прыводзіць слабы розум да змяшання дабра і зла. Падрыхтаванага абітурыента правільны адказ, абкружаны памылковымі, крыўдзіць як непатрэбная падказка. А невуку дае магчымасць здагадацца “метадам тыку”. Я не раз прыводзіла і іншыя навуковыя аргументы — не буду іх паўтараць — супраць праверкі ведаў па гуманітарных дысцыплінах з дапамогай тэстаў. Ды толькі прафесар, доктар навук хіба мае такі ж аўтарытэт, як папсовая “зорка” або тэлеаглядальнік, каб да яго прыслухаліся? Але жыццё паказвае: студэнцкі кантынгент, што прыходзіць да нас з таго часу, як увялі ЦТ, усё горш і горш падрыхтаваны — прычым па ўсіх дысцыплінах. На першых курсах, дзе я выкладаю, мая галоўная прыгаворка, звернутая да студэнтаў (калі ўжо канчаецца цярпенне): “Чаму ж вас усё-ткі вучылі ў школе?!!”

Гадоў трыццаць-дваццаць таму да нас таксама прыходзілі слабыя дзеці з правінцыі, глухіх вёсак. Але за пяць гадоў навучання мы не толькі рабілі з іх добрых прафесіяналаў, а дацягвалі да самага высокага ўзроўню крэатыўнасці, фарміруючы ў поўным сэнсе слова нацыянальную эліту. Сёння гэта зрабіць значна цяжэй з прычыны жорсткай рэгламентацыі літаральна ўсяго вучэбнага працэсу з боку кіруючых намі органаў: міністэрства, РІВШа, НАН, ВАК, НІА, дэпартаменту праверкі ведаў і інш. Зноў спашлюся на ўласны вопыт. Адно з самых яркіх уражанняў майго студэнцтва — шматлікія вершы, што чытаў нам незабыўны Міхась Рыгоравіч Ларчанка літаральна на кожнай лекцыі. Хто б сёння дазволіў яму парушаць план, столькі часу забіраць на зусім непатрэбныя, з пункта гледжання бюракратычных структур, нейкія там вершы? Але ў плане эстэтычнага выхавання, ды і агульнага развіцця, хвілінкі высокай паэзіі мелі не меншае, калі не большае, значэнне, чым рацыянальная інфармацыя. А з нашага курса, між іншым, выйшла цэлае сузор’е выдатных пісьменнікаў, навукоўцаў, дзяржаўных дзеячаў.

У сярэдняй школе, у ВНУ ўсё стандартызуецца, даводзіцца да вышэйшай ступені нарматыўнасці. Нават на дакладных і прыродазнаўчых факультэтах, не кажучы пра гуманітарныя, гэта сушыць мазгі і выкладчыкам, і студэнтам. Тэлебачанне дадае, выхоўваючы адпаведныя густы, уводзячы іх — самыя нізкія, пошлыя, абывацельскія — у абавязковую норму. Мы, старэйшае пакаленне, ужо сапраўдныя “маманты”, якія яшчэ ведаюць і разумеюць класічнае мастацтва. А пасля нас хто яго будзе ведаць? А калі-небудзь усё адно ж спатрэбіцца! На першым канале дзяржаўнага тэлебачання Беларусі кожны дзень — не менш як пяць кінастужак вытворчасці ЗША, у тым ліку ў дні нашых уласных дзяржаўных і рэлігійных святаў. Мабыць, маладыя супрацоўнікі тэлерэдакцый, самі выхаваныя на дэбільнай галівудскай прадукцыі, не ведаюць, чым можна запоўніць эфір? Між тым, нават у гісторыі замежнага кінамастацтва, не кажучы пра савецкае, — поўна шэдэўраў, прычым, не толькі галівудскіх. Свае нізкія густы журналісты насаджаюць усяму насельніцтву. Я і некаторыя мае калегі ўжо даўно тэлевізар, акрамя навін, не глядзім. Можна сказаць, што мы струхнявелыя кансерватары. Але яго абсалютна не глядзіць мая 32-гадовая старэйшая дачка, чалавек ва ўсім сучасны, затое яна кожны дзень чытае класічную паэзію.

Паколькі паважаная Алена Мінчукова расказала пра сваіх дзяцей, скажу збольшага і я. Не ў маіх правілах, хто мяне ведае, узносіць сваіх. Але маіх дачок, сапраўды, хваляць іншыя. Іх поспехі — сёння ўжо зразумела — дасягнутыя не дзякуючы сярэдняй школе, а насуперак ёй, хоць працавалі ў іх школах сумленныя, высокапрафесіянальныя педагогі. Ды толькі я даўно ведала, што лепшая адукацыя — індывідуальная. Прызнаюся: часта, калі сама была вольная, дачок у школу і не адпраўляла. Вучыла дома: мы шмат разам чыталі, я ўсё тлумачыла, паказвала шматлікія ілюстрацыі (а я з маленства збірала мастацкія альбомы); музіцыравалі на фартэпіяна і акардэоне. А пачынала я таксама ледзь не з нараджэння — гаварыла з немаўлятамі вершамі, ведаючы, што музыка слоў дзейнічае і без разумення сэнсу.

Быў у мяне і ўласны спецыфічны вопыт выкладання ў школе. Прыклад, праўда, нетыповы, але паказальны. Першы клас маёй малодшай дачкі Славяны ў канцы 1980-х прыпаў на кароткі і безвынікоўны перыяд беларусізацыі. Тады кіраўнікоў школ абавязалі ўжо з першых класаў праводзіць урокі беларускай мовы. Але настаўніца маёй дачкі была руская і адмовілася выкладаць па-беларуску. Па ўласнай ініцыятыве ўзялася я. Мне ніхто не плаціў і не правяраў маіх урокаў, я, ужо тады даўно дацэнт БДУ, рабіла ўсё, што лічыла патрэбным. Дзеці яшчэ толькі вучыліся пісаць, таму мы не пісалі; я гаварыла з дзецьмі па-беларуску, тлумачыла словы, шукала да іх аднакарэнныя, паказвала ў малюнках адпаведныя прадметы, увогуле вельмі многа прыносіла ілюстрацыйнага матэрыялу; чытала казкі, вершы, загадвала загадкі. Хадзіла ў клас цэлы год, раз на тыдзень. У выніку дзеці палюбілі беларускае слова, адчулі яго смак. Потым, усе гады навучання, калі яны бачылі мяне, прасілі зноў прыходзіць, праводзіць урокі. І пасля заканчэння школы аднакласнікі дачкі шчыра прызнаваліся, што найбольш ім запомніліся менавіта мае ўрокі. Я не радавалася (ведаю правільнасць свайго метаду), а глыбока засмучалася: да чаго ж шэрае школьнае жыццё! Але не настаўнікі ў тым вінаватыя.

Зноў вяртаюся да тэмы. Стандартызацыя, паніжэнне прафесіяналізму ва ўсіх сферах дзейнасці, агульнасць густаў — з’ява, безумоўна, не толькі беларуская, але сусветная. З насельніцтва Зямлі робяць людзей-чыпаў, людзей-мурашак, людзей-тэрмітаў з раз і назаўсёды зададзенымі функцыямі. Рабочай мурашцы хіба патрэбна нейкая там высокая паэзія, сусветная культура з яе стылямі, напрамкамі, безліччу імёнаў? Майкл Джэксан як ідал адзін на ўсіх, і хопіць. Але практычна ўсе народы супраціўляюцца негатыўным бакам глабалізацыі, імкнуцца развіваць сваё, роднае, традыцыйнае. Усе, на вялікі жаль, акрамя нас.

Таццяна ШАМЯКІНА

Фота Святланы Берасцень

Без спадзеву на прымірэнне

Літаратурны крытык Жанна Капуста ў артыкуле "Шэсць прычын не любіць крытыкаў" правакуе пісьменнікаў на палеміку. Што ж, паспрабую ў ёй паўдзельнічаць, тым больш што маю пэўны досвед у гэтай праблеме, з'яўляючыся і аўтарам і крытыкам у адной асобе.

Шэсць прычын не любіць крытыкаў

Увогуле артыкул спадарыні Капусты падаўся грунтоўным, прыемна, што малады крытык так няблага арыентуецца ў літаратурнай сітуацыі і псіхалогіі аўтараў. Аднак акцэнт у артыкуле пастаўлены аднабакова: крытык ідэалізуецца. Напрыклад: *"Ён разглядае пісьменніка як прафесіянала, таму ні біяграфія, ні чалавечыя якасці не ўлічваюцца пры напісанні рэцэнзіі"*. Добра, каб так было. Але ж дазволю сабе ўпарта ўсумніцца ў гэтым — на той простай падставе, што крытык такі ж звычайны чалавек з плоці і крыві, як і тыя грэшныя аўтары, якіх спадарыня Капуста разбірае па костках. Чалавек жа, як вядома, усюды аднолькавы: яго хвалюе найперш самарэалізацыя, а крытык, у сілу сваёй прафесіі, самавыяўляецца не ў апошнюю чаргу за кошт аўтара, нярэдка забываючыся, што аўтар таксама жывы чалавек.

Крытыкі ўпікаюць аўтараў за непамернае самалюбства і славалюбства, а аўтары бурчаць на крытыкаў за іхнюю несправядлівасць. Гэта было ва ўсе часы. І наша з Жаннай Капустай палеміка гэты працэс не спыніць і ані трохі не зменіць. Бо падобны канфлікт — рухавік не толькі літаратуры, а і ўвогуле таго, што мы называем жыццём.

Чаго, па сутнасці, дамагаецца аўтар сваімі творамі ад крытыкаў і чытачоў? Найперш любові і разумення, а таксама ў перспектыве — экспансіі сваіх ідэй і свайго імя ў гісторыю літаратуры. Гэтае жаданне ніколькі не заганнае, яно дадзена творцу ад прыроды. Усе папрокі да аўтараў у славалюбстве не маюць пад сабой маральнай асновы. Бо як толькі ты панёс хоць адзін верш у рэдакцыю, то можаш называцца славалюбцам роўна на той жа падставе, як і крытык, які апублікаваў на цябе рэцэнзію памерам у два радкі. Таму крытыкам, паколькі яны жывяцца літаратурным працэсам, давядзецца змірыцца з тым, што яны знаходзяцца сярод славалюбцаў, на якіх, тым не менш, літаратура трымаецца.

У той жа час было б дзіўна, каб аўтары радаваліся адмоўным рэцэнзіям на свае творы. Гэта ўсё адно як сказаць чалавеку, якому адмовілі ў каханні: радуйся, ты першы шчаслівец! Зразумела, што аўтар цешыцца высокай ацэнкаю сваіх твораў ад крытыкаў і злуецца на нізкую адзнаку. Гэта зноў жа — закон прыроды, на якім заснаваны прагрэс. Калі чалавеку адмаўляюць у каханні, ён або робіць новы наступ на свой аб'ект, або шукае іншы аб'ект. Так і аўтар пасля адмоўнай рэцэнзіі, хоча — не хоча, а перайначваецца і нешта ў сабе і сваёй творчасці падпраўляе. Аднак прагнуць літаратурнай славы не перастае, робячы новы наступ на рэдакцыі, выдавецтвы. У гэтым недарэчна яго вінаваціць.

Паводле Жанны Капусты, некаторыя пісьменнікі: *"...выказваюць перакананне, што крытыка ўвогуле ніводнаму мастаку слова не патрэбна"*. І яны памыляюцца. Паколькі менавіта крытыкі і літаратуразнаўцы робяць творы і творцаў фактамі літаратурнага працэсу, гісторыі. Апублікаваўшы рэцэнзію на твор, крытык тым самым увёў аўтара ў складаную іерархічную структуру нацыянальнай літаратуры. Толькі стаўшыся часткай гэтай сістэмы, аўтар набывае жыццё ў культурным кантэксце. З гэтага часу творы яго як бы індэксуюцца і маюць магчымасць сістэмна шукацца і аналізавацца як навукоўцамі, так і простымі зацікаўленымі чытачамі. Таму зразумела, што аўтару хочацца заняць не апошняе месца ў гэтым іерархічным каркасе нацыянальнай (а можа, у перспектыве — сусветнай) культуры. Аднак хацець не шкодна. У крытыкаў сваё хаценне і меркаванне наконт аўтара, безумоўна, суб'ектыўнае. І ў аўтараў няма ніякіх іншых магчымасцяў атрымаць ацэнку свайму твору, як толькі ў выглядзе сукупных суб'ектыўных ацэнак. Чым больш розных крытыкаў пра яго напішуць, тым з большай верагоднасцю з цягам часу выкрышталізуецца ісціна пра яго творчасць.

З гэтай прычыны важна мець шматпалярнасць літаратурнага працэсу, канкурэнцыю паміж выданнямі, суполкамі, ідэалогіямі. Нічога кепскага няма ў тым, што суполка дэкларуе творы сваіх аўтараў як найвыбітнейшыя, а іншая суполка іх ганіць і крытыкуе. Наадварот, гэта вельмі карысна для літаратурнага працэсу, бо чакаць ад выдавецтва, каб яно само ж давала антырэкламу сваім творам, не выпадае. Іншае ж, канкурыруючае, выдавецтва з задавальненнем справакуе жорсткую крытыку на такі твор. Таму што, як справядліва зазначае спадарыня Капуста: *"суцэльныя дыфірамбы цягам усяго творчага жыцця выклікаюць сумневы ў іх шчырасці"*. Некаторыя нашы аўтары так высільваюцца наладзіць станоўчыя рэцэнзіі на свае творы, а некаторыя крытыкі ім так старанна падыгрываюць, што дасягаюць абсалютна супрацьлеглага эфекту — адварочваюць ад сябе чытачоў. Бо няшчырасць праступае між радкоў, а недасведчаныя чытачы літаратурныя газеты і часопісы не выпісваюць.

Адсюль вынікае ўся адказнасць крытыкаў за свае рэцэнзіі. Бо яны, паўтаруся, — стваральнікі гісторыі літаратуры нароўні з аўтарамі. Ад таго, наколькі яны будуць сумленна ставіцца да сваёй працы, залежыць будучыня нацыянальнай культуры. Як і будучыня канкрэтнага аўтара: стануць яго далей друкаваць ці не. Аднак, зноў жа, апеляванне да высокіх грамадзянскіх пачуццяў крытыка, што, маўляў, ты павінен працаваць на беларускую літаратуру, а не прыгожа самавыяўляцца, — будзе мець не большы плён, чым казаць чалавеку: не пі, не куры, бо потым будзеш сам жа пакутаваць. Калі пэўны чалавек не кідае піць дзеля ўласнага будучага здароўя, а аддае перавагу часовай асалодзе, то тым болей сярэдні крытык найменш задумваецца пра лёс літаратуры і творцаў, а найперш — пра сваё месца ў ёй, пра сваю выгаду і рэалізацыю сваіх планаў. Таму мы зболшага назіраем такую карціну (не толькі ў Беларусі — паўсюль): уплывовых, вядомых літаратараў пераважна хваляць, ці прынамсі не крытыкуюць, а малавядомых, пачаткоўцаў — або не заўважаюць зусім, або стандартна пляжаць. Бо крытыку важна быць, як мінімум, апублікаваным, а гэта паспяхова дасягаецца толькі тады, калі ён не ідзе ў разрэз з агульнапрынятымі меркаваннямі.

Наастатак хочацца звярнуць увагу на істотны момант: далёка не ўсе крытыкі валодаюць ідэальным мастацкім слыхам, некаторыя папросту не ведаюць, прачытаўшы твор, добра гэта, сярэдне, кепска ці геніяльна. Бо абсалютны літаратурны слых, як і музычны, — рэч больш прыроджаная, чым прыдбаная, гэтаму немагчыма навучыцца ў гуманітарных ВНУ, аспірантурах, рэдакцыях. Таму некаторыя крытыкі звяраюцца з колішнімі меркаваннямі сваіх універсітэцкіх настаўнікаў, разнамасных аўтарытэтаў, з літаратуразнаўчымі шаблонамі, прыслухоўваюцца да выпрацаванага грамадскага меркавання наконт аналізаванага твора. Каб не абняславіцца, яны хваляць пераважна вядомых людзей (тут не сядзеш у калюжыну), а ганяць пачаткоўцаў, бо мяркуецца, што пачатковец апрыёры не можа быць дасканалым. І толькі адзінкі крытыкаў, што маюць адпрыродныя мастацкі слых і сумленнасць, а таксама яшчэ шмат-шмат якасцяў, куды ўключаецца энергічнасць, мужнасць, вера ў тое, дзеля чаго працуеш, — гэтыя нешматлікія людзі і праўдзяць нацыянальны літаратурны працэс, ствараюць эфектыўныя іерархічныя сістэмы, па якіх нашчадкі будуць знаёміцца з цяперашняй літаратурай, якая стане гісторыяй.

Міхась ЮЖЫК

Ці патрэбны «разбор палётаў»?

Прачытала артыкул Жанны Капусты "Шэсць прычын не любіць крытыкаў" і дзіву далася: ці то не яна пісала, а імем ейным падпісаліся, ці то яна пісала пад моцным уражаннем тых размоў паміж пісьменнікамі і крытыкамі, што ёй нагадваюць "дзіцячую гульню ў сапсаваны тэлефон".

Крытык Жанна Капуста піша: "складаецца ўражанне, што пісьменнікі і крытыкі — людзі з розных планет", а сама яна быццам з трэцяй прыляцела. Ну хіба чалавек, які жыве, можна сказаць, у літаратурнай прасторы, можа напісаць, што "крытык не хваліць і не ганіць, а робіць аналіз і дае ацэнку". Спадарыня Жанна, ну вы ж самі далей пішаце, што "ёсць у крытыкаў вялікі грэх: яны, як правіла, арыентуюцца на ідэальнага чытача", а самі ў артыкуле арыентуецеся нават не на ідэальнага, а нейкага звышідэальнага крытыка. Ну дзе вы бачылі крытыка, які арыентуецца выключна на мастацкія вартасці тэкстаў і "разглядае пісьменніка як прафесіянала", і пры гэтым яшчэ не ўлічвае "ні біяграфію, ні чалавечыя якасці пры напісанні рэцэнзіі"?.. Пакажыце мне такога АБ'ЕКТЫЎНАГА крытыка! Я хачу паціснуць яму руку!

Літаратурныя крытыкі — таксама людзі. І таму не пазбаўленыя суб'ектыўнасці. Крытыка — з'ява персаніфікаваная, асобасная (не блытаць з асабістай), а таму ўпарадкоўваецца мастацкімі ўстаноўкамі і літаратурным густам! Апошнім часам гэтая самая персаніфікацыя нават стала прадметам увагі навукоўцаў ды даследчыкаў... Я ж асабіста прыйшла да высновы: літаратурная крытыка па прыродзе сваёй суб'ектыўная, жывая, часам эпатажная, чаго вымагае не толькі сучасны літаратурны працэс, але і чытачы з іх не абы-якімі запатрабаваннямі. Яна і павінна быць такой, каб хваляваць і выклікаць спрэчкі, чаго так прагне Жанна Капуста. Да аб'ектыўнасці і правільнасці павінна імкнуцца літаратуразнаўства.

Зрэшты, чытачы пазбаўленыя ілюзій наконт аб'ектыўнасці, незаангажаванасці крытыкаў, што пацвярджаюць шматлікія апытанні, праведзеныя мной пры напісанні навуковай працы "Суб'ектыўны фактар у сучаснай беларускай літаратурнай крытыцы" (між іншым, на прыкладзе матэрыялаў "ЛіМа"). У чытачоў, апроч уласнага густу ды меркавання пра тую ці іншую кнігу, ёсць выбар, каго з крытыкаў чытаць. Крытыкаў хапае, аднак крытычных тэкстаў не стае, што з'яўляецца яскравым паказнікам якасці літаратуры. Крытыкі — асобы амбітныя, пра абы-што пісаць не хочуць. Да таго ж, заўважыла, асаблівасць: калі рэцэнзія на кнігу напісаная адным крытыкам, то іншы пра яе пісаць не бярэцца. Лепш пра іншую. І тут хачу пахваліць "ЛіМ": вельмі добра, што тыднёвік дае па два меркаванні на адну і тую ж кніжку.

Тыя шэсць пунктаў, паводле якіх крытыкаў любіць няварта, высмактаныя з пальца. Так, пункты 3, 4, 5 — пра адно і тое ж. Паводле іх "пісьменнік чакае пахвалы" — раз; "пісьменнік адмаўляе магчымасць творчай няўдачы" — два; "пісьменнік настолькі перакананы ў сваёй таленавітасці, што з вялікай цяжкасцю дапускае думку, што некаму яго твор сапраўды можа не спадабацца" — тры. Цяпер звязваем гэта ў адно: пісьменнік перакананы, што ён таленавіты, а ягоны твор удалы, таму ён і чакае пахвалы (хто ж будзе хваліць няўдалае?), што, у сваю чаргу, пацвярджае, што ягоны твор будзе людзям падабацца. Усё ўзаемазвязана.

Гучны загаловак артыкула выклікаў у мяне наступнае пытанне: навошта нас, крытыкаў, любіць? Асабіста я буду цалкам задаволена, калі мяне будуць чытаць, паважаць маю працу, прыслухоўвацца да маіх заўваг і ацэнак.

Вяртаючыся да ўпомненых планет. Натуральна, што пісьменнікі і крытыкі, жывучы ў адной культурнай прасторы, знаходзяцца па розныя бакі барыкад. Адны пішуць, другія ацэньваюць. Хіба гэта не розныя планеты? Розныя. Навошта крытыкам і пісьменнікам тое паразуменне, пра адсутнасць якога так непакоіцца спадарыня Жанна?.. Як кажуць мае сваякі, хоць гаршчком назавіце, абы ў печ не ставілі. З чаго наогул узялося меркаванне пра нейкае непаразуменне ды варожасць? Калі яно і ёсць, то залежыць не ад роду заняткаў, а ад людскіх характараў. Няўжо Жанна сапраўды думае, што пісьменнік і крытык, меркаванні якіх знаходзяцца ў апазіцыі, прачытаюць гэты яе артыкул і нашу палеміку вакол яго, паміры́ўшыся, пойдуць піць баржомі?.. Сумніўна. Да таго ж, аўтар сама таго не ўсведамляючы, спрабуе давесці нам, крытыкам, што нас (і вас, паважаная Жанна) любіць няварта. Чаму? Лагічным адказам былі б лісты пакрыўджаных крытыкаў, дзе яны выклалі б прычыны, паводле якіх не трэба любіць пісьменнікаў... У выніку замест таго, каб прымірыць розныя лагеры, знайсці паразуменне і наладзіць дыялог, сітуацыя толькі пагоршыцца...

Зразумела, што тэкст Жанны Капусты скіраваны на палеміку, але ці патрэбна яна ў гэтым выпадку? У сучасным літаратурным працэсе ёсць нашмат больш сур'ёзныя пытанні і праблемы, якаія патрабуюць адкрытага дыялога.

Ася ПАПЛАЎСКАЯ

На старонках часопіса "Нёман" (№ 2/09) прачытала артыкул Станіслава Саладоўнікава "Характер и эпоха: проблема выбора", аўтар піша "Я просто размышляю над конкретными произведениями и приглашаю к этому читателей". Прымаю яго запрашэнне.

Ці маем права?

"Советским людям, начиная с невинного пионерско-комсомольского возраста, дурили головы, что в 20-е годы и даже раньше в деревне страшнее не было «кулаков» — этих мироедов, живоглотов, скупых и злобных людей. Они то совсем не хотели идти в колхоз, где им обещали манну небесную. Такого «врага» — мироеда встречаем и в первом романе А. Аферовского из его трилогии, не имеющей, к сожалению, общего названия, — «Двое на тонком льду»". Трылогія Івана Мележа з палескай хронікі "Людзі на балоце", "Подых навальніцы", "Завеі, снежань" таксама не мае агульнай назвы, але гэта не перашкаджае твору быць яскравым прыкладам прыгожага пісьменства, годным пашаны. Хто ў 20-я гады хацеў аддаць сваю гаспадарку ў калгас?! Ды ніхто. Анатоль Афяроўскі вельмі праўдзіва паказвае існуючы лад таго часу, ахвярамі якога з'яўляюцца героі трылогіі.

"И вот А. Аферовский берётся за раскрытие темы мести, заставляет задуматься над проблемой мести простого человека, униженного и оскорблённого. ИМЕЕТ ЛИ ОН НА ЭТО ПРАВО?". А чаму не мае? Гэта ж мастацкі твор, глыбока псіхалагічны, і калі ў ім не раскрываць характары і ўчынкі герояў, ён будзе нагадваць дрэнна напісаную аповесць, якую, нават, не варта ў рукі браць. Таленавіты пісьменнік не толькі мае права, ён абавязаны найбольш поўна і рознабакова падаць героя чытачу. А можа, на думку С. Саладоўнікава, зганьбаваны і прыніжаны чалавек увогуле не мае права быць галоўным героем твораў беларускай літаратуры, і гэта трэба неяк маскіраваць?

Апошнім часам, чытаючы крытычныя артыкулы, падаецца, што крытыкі не аналізуюць творы, а шукаюць адзін негатыў.

Напрыклад, "Узнёсла-рамантычныя чаканні бурапеннага жыцця" Сяргея Грышкевіча ("ЛіМ", № 8, 2009 г.) не задаволіла аповесць Валерыя Гапеева "Усё цудоўна, або ўрок бяспечнага сексу" ("Маладосць", № 11/08). Па словах "настаўніка, сацыяльнага педагога, які мае прамое дачыненне да сістэмы адукацыі" і чакае ад твора "пікантных момантаў" ды "забойных аргументаў", аповесць яму не спадабалася, таму што "сёння многія школьнікі такому навучаць у сексе, што дарослым і не снілася" (адкуль такое веданне справы?). Ды і як "журналіст-"раёншчык" з тэхнічнай адукацыяй", які "не мае права гаварыць пра моладзь з вышыні свайго цнатлівага савецкага мінулага" можа гэтыя чаканні задаволіць, яму ж тэхнічная адукацыя не дазваляе за дзвярыма падслухоўваць шчырыя размовы хлопчыкаў і дзяўчат, — а ён яшчэ ідэалізуе дзяцей і ўвогуле робіць іх правільнымі!

Па сваіх разважаннях сацыяльны педагог нагадвае аднаго з бацькоў, апісаных у творы, мабыць, таму аповесць і не даспадобы.

Дзяцей дрэнных не бывае, ёсць дарослыя, якія з'яўляюцца дрэнным прыкладам, — што пасееш, тое па восені збярэш, і не трэба ўсё спісваць на несавецкі час, чалавек сам гаспадар свайго жыцця.

Не першы раз сустракаюся з крытыкай твораў, якія вельмі падабаюцца мне, як чытачу, і чым больш даспадобы, тым больш негатыўнай крытыкі. Пісьменнік піша для чытача. Крытыкаваць лёгка, было б што, а на белай паперы заўсёды знойдуцца чорныя плямы, калі не — дык мы намалюем, медаль мае два бакі, глядзім на той, які каму бліжэй.

Зразумела, што я не супраць крытыкі, яна існуе дзеля годнага і высокамастацкага развіцця літаратуры, але павінна быць больш гуманнай. Такая мая думка.

Шаноўны крытык, не пілуй пад корань дрэва, на суку якога сядзіш, сухія галінкі ападуць самі...

Вольга ПАЛУНЧАНКА

З вясной па жыцці

Я ніколі не заўважаў Віктара Карамазава сумным, насупленым. З першых фотапартрэтаў, якія мне давялося пабачыць на ягоных кнігах, да асабістага знаёмства з ім, на мяне глядзелі адны і тыя ж вочы з непрыхавана-добрай, высакароднай усмешкай. Гэты чалавек, як мне падаецца, поўніцца і цешыцца радасцю жыцця, якое б яно ні было. Ён з тых асоб, якія вырашаюць праблемы без боязі і ныцця, бо вясна, якая жыве, разліваецца па ўсіх яго часцінках цела і душы, поўніць, перапаўняе чулае яго сэрца, дапамагае яму крочыць наперад.

У дзяцінстве, як і многім хлапчукам савецкага часу, яму хацелася подзвігаў; юнацтва, вядома, цягнулася да рамантыкі, ну, а дарасласць — патрабавала ўчынкаў. Вядома, што не абы-якіх. Хацелася смелых і адважных, без гнілі і смярдзючага паху — дзеля ісціны і праўды. Падобных учынкаў у яго жыцці было шмат, як і шмат было мамантаў, калі можна было прамаўчаць, зрабіць так, як хоча нехта іншы. Але ж пераважвала і прываблівала першае — высокае і чыстае, якое, часам, патрабавала ахвяраваць службовай кар'ерай.

Гартаю раман "Пушча" і ўспамінаю, як Віктар Філімонавіч зазірнуў да нас, у рэдакцыю газеты "На страже Октября". Нагоды для сустрэчы пісьменніка з журналістамі і чытачамі не было — былі розныя меркаванні пра падзею, якая не сыходзіла з вуснаў людзей. Карамазаў выказваў свой погляд на дзеянні міліцыі падчас жорсткага разгону масавай дэманстрацыі памяці ахвяраў сталінізму 30 кастрычніка 1989 года, а рэдакцыя газеты, як афіцыйны орган МУС БССР — іншы. Пазіцыю апошняга змушана абараняў рэдактар Сяргей Шахновіч, бо душой і сэрцам быў разам з пісьменнікам.

Вось тады, у тыя хвіліны, зямляк-творца ўпершыню адкрыўся для мяне як прынцыповы і сумленны чалавек, бо нягледзячы на небяспеку, якая магла ўзнікнуць у яго жыцці, смела выказваў сваю думку.

"Калі хочаш, Віктар, быць сапраўдным творцам, — гаварыў ён мне, як пачаткоўцу, калі мы ехалі да яго на лецішча, — будзь у апазіцыі да ўсіх, і ў першую чаргу, да сябе. Толькі тады твой твор будзе праўдзівы, жыццёвы, толькі тады ты будзеш адчуваць, што не ўпустую папрацаваў за рабочым сталом".

Пісьменніку з такой жыццёвай пазіцыяй творча працаваць цяжка. Чыноўнікі не любяць, калі іх учынкі падвяргаюцца крытыцы, асабліва калі яны вобразна падаюцца ў творы, а значыць, застаюцца і ў гісторыі. Карамазаў глядзіць на гэтыя працэсы філасофскім поглядам: не закупіла Магілёўшчына кнігу пра свайго земляка-мастака Антона Бархаткова, ён аддаў яе на продаж у іншыя кнігарні, праігнаравала Гомельшчына набыць выданне пра Гаўрыіла Вашчанку, пісьменнік і тут не засумаваў, прапанаваў яе ў іншыя рэгіёны рэспублікі. Прыхільнікі таленту як Бархаткова, так і Вашчанкі ёсць усюды, але ж пісьменніку Карамазаву бачылася і вельмі хацелася, каб у першую чаргу кнігу пра жыццёвы і творчы шлях мастакоў набылі бібліятэкі тых раёнаў і абласцей, дзе нарадзіліся гэтыя творцы. Каму, як не ім ганарыцца людзьмі, што праславілі свой радзінны куток, перад гасцямі і замежнымі дэлегацыямі?

Няўрымслівасць, нестандартныя паводзіны Карамазава заўважаеш усюды, калі ідзеш па яго слядах. Неяк тэлефаную яму дахаты, а жонка, Лідзія Мікалаеўна, паведамляе, што Віктар Філімонавіч хворы. "Што здарылася? — пытаюся. — Прастаяў па пояс у снезе, пакуль не накідаў на палатно зімні эцюд".

І гэта ў такія сталыя гады? Для некага падобны прыклад будзе здавацца дзіўным, для мяне — ні ў якім разе. Добра ведаю, як Карамазаў збіраў мастацкія вобразы пра жыццёвы і творчы шлях Бялыніцкага-Бірулі і Жукоўскага. Восем гадоў вандровак па Беларусі і Расіі сярод простага люду, у асяроддзі мастакоў, лесніковў і паляўнічых. Бачыў яго зялёную старую "Ніву", на якой ён праехаў сотні кіламетраў па бірулеўскіх і жукоўскіх сцежках-дарожках, каб расказаць пра гэтых знакамітых сыноў Айчыны. Аповесці "Крыж на зямлі і поўня ў небе" (твор прысвечаны Вітольду Каятанавічу Бялыніцкаму-Бірулю) і "Мой брат духоўны" (пра мастака-"перасоўніка" Станіслава Жукоўскага, які нарадзіўся і вырас у Беларусі), напісаныя пісьменнікам у палатцы і лодцы, са стрэльбай, дыктафонам і фотакамерай.

У хуткім часе свет пабачыла аповесць-эсэ "Антон", пра мастака Антона Бархаткова. Жыццё пейзажыста-лірыка, вытокі творчасці выкладзены Віктарам Карамазавым шчодра, душэўна, зачаравана-прыгожа. Пісьменнік прызнаецца: "У карцінах і эцюдах Бархаткова бярэш урокі мудрасці: як працаваць і не спрацавацца, любіць і не пагаснуць, як на карысць любімай справе аберагчы душу ад крыўды, зайздрасці, хамства, хлусні".

Зазірнуць ва ўнутраны свет мастака вачамі празаіка рэдка каму з творцаў удавалася. Віктар Філімонавіч выдатна з гэтым справіўся. Чытачу ёсць магчымасць не толькі пазнаёміцца з карцінамі мастака, яго фотаархівам, але і апынуцца ў гістарычную эпоху творцы, дзякуючы вобразнаму тэксту Карамазава. Атрымаўся гэткі своеасаблівы сінтэз літаратуры і мастацтва, дзе красамоўнае, паэтычна-празаічнае слоўка, як мазок на палатне, зачароўвае багаццем свайго святла і колеру.

— Я пішу кнігу і ўяўляю сабе чытача, — дзеліцца са мной думкамі Віктар Філімонавіч на лецішчы і падкідвае ў стаяк бярозавыя паленцы. — Ён нешта большае хоча знайсці ў кнізе. Напрыклад, жыццё мастака, яго карціны, прычым такія мастацкія работы, якія праходзяць праз аўтарскі тэкст, якія фарміруюць аповесць і працягваюць яе.

Чытаеш эсэістычна-біяграфічную прозу Карамазава пра мастакоў і падсвядома ўспамінаеш асяроддзе чэхаўскіх персанажаў: музыканты, артысты, паэты... Тут жа і мясцовы люд, які прыпамінае прыезджых на кані з эцюднікамі і стрэльбамі.

Дарэчы, захапленне асобай Вітольда Каятанавіча Бялыніцкага-Бірулі для Віктара Карамазава не прайшло бясследна. Свет мастацтва моцна паўплываў на пісьменніка. Цяпер празаік, публіцыст, чулы да людзей чалавек, асвойвае тэму прыгажосці і праўды ў беларускім выяўленчым мастацтве. Аўтарскія карціны, якія мне пашчасціла пабачыць, у асноўным пейзажныя. Адчуваецца лёгкае дыханне пэндзля тонкага лірыка.

Па жыцці Віктар Філімонавіч Карамазаў ідзе з вясной...

Віктар ПАТАПЕНКА

Чарговае выданне — пра ветэранаў

Сёння не многія з нашых магілёўскіх пісьменнікаў-дакументалістаў могуць пахваліцца такім "ураджаем" на выдавецкай ніве. Аляксандр Балдоўскі выдаў за апошнія гады кнігі нарысаў "Этапы вялікага шляху" (2004 г.), "60 гадоў Свята-Пакроўскаму храму" (2006 г.)," Жыццё працягваецца" (2007 г.), "Тісторыі нятленныя старонкі"(2007 г.), "Жамчужына Хоцімска" (2008г.) і шмат іншых.

І вось ужо ў сярэдзіне 2009 года ў магілёўскім выдавецтве "Амелія Прынт" тыражом у 500 асобнікаў выйшла ў свет чарговая кніга празаіка-дакументаліста "Перамаглі ворага і разруху". Гэта першая кніга навукова-папулярнага выдання з серыі "Ветэраны". Усяго ж па задуме аўтара поўны праект будзе складацца з трох кніг. Збіраць матэрыялы, дакументы, фотаздымкі для другой кнігі цяпер аўтару дапамагаюць супрацоўнікі Крычаўскага краязнаўчага музея, раённай бібліятэкі, ваеннага камісарыята.

Як адзначае сам пісьменнік, "ветэраны, пра баявыя подзвігі якіх пойдзе гаворка ў гэтай кнізе, альбо нашы землякі, альбо тыя, хто парадніўся з Крычавам, пражыўшы ў ім некалькі дзесяцігоддзяў. Гэта яны, мужна прайшоўшы праз горан баёў, падаравалі нам спакойнае жыццё пад мірным небам. Іх нястомная праца паслужыла пасляваеннаму адраджэнню прамысловасці, уздыму сельскай гаспадаркі і далейшаму развіццю старажытнага горада над Сожам".

Прыцягваюць увагу чытача і фотаілюстрацыі, якія ўдала дапаўняюць тэкставы матэрыял, то адсылаючы ў далёкія і суровыя гады ваеннага ліхалецця, то набліжаючы да сённяшніх дзён з іх новымі планамі і задачамі, поспехамі і дасягненнямі.

Кніга разлічана на шырокае кола чытачоў і, верыцца, будзе годна ацэнена.

Мікалай ХОБАТАЎ

Талент мужнее ў працы

Мой старэйшы сябра Сцяпан Кухараў, выхаванец першых пяцігодак, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, чалавек паважанага ўзросту — яму споўнілася 90 гадоў — добра адчувае перамены, якія адбыліся за апошнія гады. У часы сваёй маладосці ён не стаяў у марным роздуме. Дапамагаў бацькам па гаспадарцы, вучыўся ў школе, шмат чытаў. Яго нястрымна вяла прага ведаў, і ён добрасумленна рабіў усё, што патрабаваў час.

Колькі было радасці, калі паступіў у Гомельскае педагагічнае вучылішча, дзе з захапленнем вывучаў творы мастацкай літаратуры, родную мову. У 1939 годзе Сцяпан Іванавіч быў прызначаны выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры Горскай сярэдняй школы, у якой сам скончыў сямігодку.

Вёска Горы, упрыгожаная рачулкай Палуж, недалёкая ад яе вёска Стайкі, дзе С. Кухараў нарадзіўся, стала крыніцай яго натхнення, пазнання жыцця і самога сябе. Сцяпан з задавальненнем чытаў вершы і замалёўкі землякоў Петруся Бядуліна, Аляксея Пысіна, Міколы Ткачова і іншых вясковых селькораў, якія ўжо сталі вядомымі. І ён таксама вучыўся бачыць усё новае, што нараджала рэчаіснасць, што абуджала думку. Тут усё спрыяла развіццю асобы, далучэнню да творчасці.

Сцяпан Кухараў працягваў дасылаць свае допісы ў раённую газету "Чырвоны сцяг", у якую пісаў яшчэ вучнем. Газета вучыла яго любіць жыццё, сапраўдных працаўнікоў, бачыць вакол сябе добрыя ўчынкі, справядлівасць, пераймаць ад бацькоў лепшыя звычкі і традыцыі. Сцяпан пісаў таму, што ў яго юнацкім сэрцы загучала грамадская "жылка", святая патрэба жыць інтарэсамі людзей — гэтыя якасці натхнялі яго да актыўнай творчай дзейнасці. Ён выношваў новыя задумы, марыў пра вучобу ў інстытуце. Але яго юнацкія мары ў адзін дзень перакрэсліла вайна.

Пасля вызвалення Краснапольскага раёна ў кастрычніку 1943 года Сцяпан Кухараў знаходзіўся ў дзеючай Чырвонай Арміі. Прайшоў з баямі цяжкі шлях ад берагоў Бесядзі, Сожа, Дняпра да Берліна. Удзельнічаў у вызваленні роднай Беларусі. Вызваляў землі Польшчы, Усходняй Прусіі, удзельнічаў у баях пад Наравам, фарсіраваў Віслу і Одэр. Паміж іншымі аўтографамі на сцяне рэйхстага паставіў і сваё прозвішча "С. Кухараў". За мужнасць і адвагу Сцяпан Кухараў узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I ступені, медалямі "За баявыя заслугі", "За ўзяцце Кёнігсберга", "За ўзяцце Берліна" і іншымі.

Вайна загартавала характар С. Кухарава, усё добрае і сумленнае захавалася ў яго душы. Абудзілася даўняя мара стаць журналістам, творцам. У студзені 1946 года, хвалюючыся, зайшоў у рэдакцыю маладзёжнай газеты "Чырвоная змена". Яе рэдактар Іван Матыль, нядаўні арганізатар камсамольскага падполля ў Магілёўскай вобласці, запытаў:

— Франтавік? Пісаў што-небудзь?

— Так. Толькі што дэмабілізаваўся. Шмат пісаў у раённую газету.

У той жа дзень Сцяпана Кухарава прынялі ў аддзел сялянскай моладзі. Пачаліся яго новыя дарогі па беларускіх гарадках і вёсках, якія ажывалі і адбудоўваліся, залечвалі раны фашысцкай акупацыі. На старонках газеты журналіст услаўляў традыцыі баявога і працоўнага братэрства, справядлівасць і жыццяздольнасць людзей, іх ініцыятыву і вынаходлівасць. Прыемна было працаваць сярод уратаванай моладзі і былых франтавікоў, дзе яшчэ так выразна праглядаліся межы паміж дабром і злом, праўдай і падманам. У яго артыкулах і нарысах — адлюстраванне пасляваеннай эпохі, прычым энтузіязму, гераізму было, здаецца, не менш, чым у гады вайны.

Аднойчы ступіўшы на нялёгкую і пачэсную сцяжынку журналіста, Сцяпан Кухараў не саступіў з яе, зрабіў служэнне слову сэнсам свайго жыцця. Ён працаваў у рэдакцыях газет "Мінская праўда", "Настаўніцкая газета", а з 1955 года — у часопісе "Маладосць", дзе апынуўся сярод зорак беларускай літаратуры — Аляксей Кулакоўскі, Пімен Панчанка, Алесь Асіпенка, Іван Навуменка, Янка Сіпакоў, Уладзімір Юрэвіч, Анатоль Кудравец, Уладзімір Караткевіч і іншыя.

Аб пісьменніцкай кар'еры С. Кухараў менш за ўсё думаў. Ён старанна працаваў у жанры дакументальнага нарыса, з кожным годам назапашваў мастацка-выразныя сродкі. Самыя натуральныя жыццёвыя абставіны — шматгадовая праца селькора, журналіста і літаратурна-творчае акружэнне — прывялі яго да пачэснага звання пісьменніка. У 1972 годзе выйшла з друку аповесць С. Кухарава "Бацькавічы", першы буйны мастацкі твор, прыхільна сустрэты крытыкай. Аляксей Пысін пісаў: "Мне вельмі падабаецца аповесць "Бацькавічы", усё ў ёй так знаёма, дорага, блізка. Аповесць густа населена цікавымі самабытнымі людзьмі, сваімі героямі, іх шмат — цэлая вёска. І кожны мае свой запамінальны твар, апратку, мову, сваю мудрасць. свой розум. Кожны ва ўзаемаадносінах з суседзямі і ўсім калектывам". Пісьменнік-публіцыст выдаў кнігі нарысаў "Незабыўныя сустрэчы" (1959), "Людзі крылатага ўзросту" (1961), "Ад вашага карэспандэнта" (1966), "Жыццё-легенда" (1971), "Светлая пара" (1978), "Сцішанае поле" (1986), "Суніцы для сына" (1986), "Зоркі-незабудкі" (1992), "Дарогі і сустрэчы" (1994). Пісьменнік сказаў сваё слова і яго пачулі ўдзячныя чытачы.

Колькі б я ні сустракаўся са Сцяпанам Іванавічам Кухаравым, заўсёды адчуваю яго чалавечую высакароднасць, хараставо беларускай душы, яго цікавасць да грамадскага жыцця. Прыемна і лёгка гаварыць з чалавекам адукаваным, адкрытым, бескарыслівым. Напаўняешся жаданнем жыць і пазнаваць, штосьці рабіць для сябе і сваіх суайчыннікаў.

Эдуард КАРНІЛОВІЧ, кандыдат гістарычных навук

У новай рубрыцы "кіЛіМ з ласкутоў" — шмат стракатых фактаў, баек, показак, гісторый, каментарыяў, разваг ды ўспамінаў з пісьменніцкага жыцця, тэматычна сшытых у адзінае палатно.

Псеўданім на ўдачу

Псеўданім — частка літаратурнага амплуа, своеасаблівы сцэнічны касцюм, у якім аўтар выходзіць да чытацкай публікі. Хтосьці выкарыстоўвае ўсе правілы маскіроўкі, захоўваючы інкогніта. Хтосьці абірае лёгкі грым, каб надаць вобразу драматызму, рамантычнасці, змрочнасці альбо жартоўнасці. А нехта бярэ ў якасці псеўданіма бацькоўскае прозвішча, назву роднай мясціны, імя каханай альбо дзіцячую мянушку, каб паўсюль насіць яго з сабой на ўдачу, як магічны амулет, зашмальцаваны фотаздымак у кішэні ля сэрца ці любімую кнігу.

Калекцыянер псеўданімаў

Янка Саламевіч — галоўны захавальнік беларускіх псеўданімаў, ён збірае і расшыфроўвае іх ужо амаль 50 гадоў. Кажа, лёгка лічыць: пачаў гэтым займацца ў 1961-м, у год нараджэння сына, дык сыну Аляксандру ўжо 48. Гэта фенаменальна: ён носіць у галаве сапраўдную базу дадзеных, дзе захоўваецца інфармацыя пра псеўданімы безлічы жывых і даўно памерлых пісьменнікаў. Іван Уладзіміравіч скардзіцца, што цяпер, калі колькасць псеўданімаў і крыптанімаў перасягнула за дваццаць тысяч, цяжка трымаць усё ў памяці. Звычайнае хобі ператварылася ў тытанічную працу ўсяго ягонага жыцця, у вялізны цяжар інфармацыі, які нарэшце можна скінуць толькі адзіным спосабам: увасобіць у тоўстых тамах, а вось з гэтым якраз і праблема — няпроста знайсці выдаўца для такой "вузкай" тэматыкі. Першы слоўнік беларускіх псеўданімаў выходзіў у 1983 годзе, дзякуючы падтрымцы тагачаснага дырэктара выдавецтва "Мастацкая літаратура" Міхала Дубянецкага. У яго ўвайшло 3992 псеўданімы і крыптанімы 1231 аўтара — пісьменнікаў, крытыкаў, літаратуразнаўцаў, перакладчыкаў, публіцыстаў, фалькларыстаў, мовазнаўцаў, журналістаў.

Праца па расшыфроўцы выдуманых імёнаў патрабуе шмат сіл, ведаў, а часта і інтуіцыі, бо дакладную інфармацыю часам немагчыма знайсці нават у архівах (асабліва што тычыцца выданняў 1920—1930-х гадоў). Да прыкладу, толькі адным псеўданімам Беларус карысталіся ў перыёдыцы Максім Гарэцкі, Зміцер Жылуновіч, Мікола Засім, Сымон Рак-Міхайлоўскі, Павел Шпілеўскі ды многія іншыя, а самую вялікую цяжкасць для даследчыкаў, вядома ж, уяўляюць крыптанімы — тут увогуле, паводле Янкі Саламевіча, блытаніны хапае нават у паважаных выданнях. Іван Уладзіміравіч імкнецца скарыстаць самую надзейную крыніцу для расшыфроўкі — дасылае пісьменнікам лісты з просьбай патлумачыць уласныя літаратурныя імёны. Але і тут здараюцца недарэчнасці: некаторыя аўтары самі забываюцца, дзе, калі і як падпісваліся, таму любыя звесткі даводзіцца пільна правяраць.

Хачу шчыра падзякаваць Івану Уладзіміравічу за дапамогу ў падрыхтоўцы гэтага матэрыялу.

Пячатка на творчасці

Маладая паэтка Віка Трэнас бачыць у абранні псеўданіма пэўную прадвызначанасць, фатум. Упершыню яе вершы былі апублікаваныя ў 2000 годзе з простым і па-маладому фамільярным подпісам — Віка. Праз год з'явіўся псеўданім Трэнас, а сваё сапраўднае шляхетна-вытанчанае прозвішча — Ляйкоўская — паэтка пакінула для крытычных і публіцыстычных артыкулаў. Трэнас — старажытна-грэчаскае слова, што азначае плач па памерлых, а псеўданімам яно сталася праз захапленне Вікі вядомым творам "Трэнас або Плач адзінае святое сусветнай апостальскае ўсходняе царквы з тлумачэннем догматаў веры" праваслаўнага пісьменніка-палеміста эпохі барока Мялеція Смятрыцкага (дарэчы, псеўданім Тэафіл Артолаг, пад якім гэты антыкаталіцкі твор быў выдадзены ў 1610 годзе ў Вільні, выратаваў аўтара ад пакарання).

"Псеўданім Трэнас замацаваўся неяк незалежна ад мяне, — тлумачыць Віка, — я б не сказала, што мне самой ён вельмі падабаецца, але калі цяпер яго змяніць, то прыйдзецца наноў заваёўваць чытачоў". На пытанне, ці наклала такое змрочнае літаратурнае імя адбітак на творчасць, паэтка адказвае: "Канечне, з ім звязаная эстэтыка маіх вершаў, асабліва яно паўплывала на першы зборнік "Цуд канфіскаванага дзяцінства", на якім якраз ляжыць пячатка змрочнасці і гатычнасці, пазней гэты настрой плаўна перайшоў і на наступныя зборнікі".

Дух агню

Паэт Алег Бембель пачаў падпісвацца псеўданімам Зьніч яшчэ да свайго хрышчэння ў праваслаўе, у сярэдзіне 70-х — у часы савецкага дысідэнцтва, калі ягоныя творы забараняліся і хадзілі па руках у коле знаёмых і сяброў. Пазней гэты псеўданім загучаў і за межамі Беларусі — у 1988 на Захадзе выйшлі яго кнігі паэзіі «Рэха малітвы» і «Саната ростані». Сёння Алег Бембель — паслушнік Жыровіцкага манастыра, яго царкоўнае імя — інак Мікалай, але ад свайго афіцыйнага псеўданіма паэт не адмовіўся, нягледзячы на частыя пытанні пра яго паганскае паходжанне. "Зніч, паводле славянскай міфалогіі, — дух агню, які вынішчае зло на зямлі, апякун смеласці і адвагі, — распавядае паэт, — але ёсць і хрышчоны Зніч, гэта азначае, што душы, якія трапілі ў багну паганства, павінны вяртацца, як блудныя сыны, да Творцы".

Сямейная легенда

Празаік Алесь Наварыч гутарыць са мной пра псеўданім катэгарычна адмовіўся, патлумачыўшы, што пісьменнік павінен заставацца для чытача таямнічым і неразгаданым. А вось Расціславу Бензяруку ён сямейную легенду даверыў, а той выдрукаваў яе ў сваёй кнізе "Аўтографы", якая выйшла летась у Брэсце. Дазволю сабе працытаваць цікавы абразок "Сямейнае імя":

"Як зайшла гаворка пра псеўданім Алеся Трушко, цяпер згадаць цяжка, але сам Алесь не пагадзіўся з нашым меркаваннем:

— Наварыч — гэта зусім не псеўданім, а сямейнае імя, — і расказаў легенду, якая перадавалася, мусіць, з пакалення ў пакаленне.

...Было гэта вельмі даўно, яшчэ за прыгонным часам. Алесеў продак нейкім чынам трапіў поварам да генерала. З кемлівага палешука выйшаў выдатны кухар: генерал не мог нахваліцца прыгатаванымі ім стравамі.

Аднойчы кухар гэтак дагадзіў генералу, што той не ўцярпеў і сказаў:

— Смачна. Вельмі смачна! Прасі — і адно тваё жаданне я выканаю!

Паляшук хітра скасавурыў вока:

— Любое?

— Любое!

— Ну, то дайце, ваша правасхадзіцельства, мне вольную...

— Вольную?! — падкруціў сівы вус генерал. —- Хітро!

Але слова сваё стрымаў.

Сталі пісаць вольную грамату, ды тут аказалася, што ў палешука і прозвішча няма. Што рабіць? Генерал вырашыў так:

— Ты добра варыш — значыць будзеш Наварычам.

Так пайшоў па свеце род Наварычаў. Адзін з нашчадкаў, богведама ў якім калене, стаў пісьменнікам Трушко, але свайму сямейнаму імю не здрадзіў: апавяданні і раманы падпісвае "Алесь Наварыч".

А навошта выдумляць?

Адам Глобус у сваім блогу распавёў, як на адным творчым семінары маладыя літаратары выдумлялі сабе псеўданімы: Максім Клімковіч узяў псеўданім Макс Клім, Пётра Васілеўскі — Пятро Няміра, Уладзімір Сіўчыкаў — Уладзімір Булаўскі, Міраслаў Адамчык — Міраслаў Шайбак, Уладзімір Адамчык — Адам Глобус, а Уладзімір Сцепаненка назваўся... Сцяпанам Рабінзонам.

"Усё было не зусім так, — распавядае ўласную версію Уладзімір Сцяпан, — сапраўды на першым курсе інстытута, калі пачалі сур'ёзна займацца літаратурай, вырашылі пабраць сабе псеўданімы — былі розныя варыянты, і жартаўлівыя, і сур'ёзныя, недзе праскоквала ў мяне думка назвацца Рабінзонам. Але пасля адзін вельмі абазнаны выкладчык, які вучыў нас асновам архітэктурнай кампазіцыі, мне сказаў: "А навошта выдумляць? Усе ж называюць цябе Сцяпан, гэта цалкам славянская традыцыя, хай так і будзе". Псеўданім быў мне патрэбны, каб развесці асобу — ёсць мастак Уладзімір Сцепаненка, ён проста жывы чалавек, які есць, п'е, можа з некім сварыцца, а Уладзімір Сцяпан — зусім іншая асоба, якая піша тэксты". Пісьменнік прызнаўся, што псеўданім выклікае пэўную блытаніну: многія дагэтуль думаюць, нібыта Сцяпан — гэта яго імя, а некаторыя клічуць Уладзімірам Сцяпанавічам.

Рэкардсмены

У беларускай літаратуры, паводле звестак Янкі Саламевіча, безумоўным пераможцам па колькасці псеўданімаў з'яўляецца пісьменнік і грамадскі дзеяч Цішка Гартны (Зміцер Жылуновіч) — іх у яго налічваецца больш як 120, але падпісваліся імі пераважна публіцыстычныя артыкулы. У 1916 годзе ў Петраградзе ён выдаваў газету "Дзянніца", якую фактычна сам і запаўняў матэрыяламі, ставячы пад імі розныя прозвішчы, каб стварыць уражанне вялікага "штату" супрацоўнікаў.

Сярод сучаснікаў рэкардсменам, паводле звестак Янкі Саламевіча, можна назваць журналіста і літаратурнага крытыка Алеся Марціновіча. Шматлікія артыкулы ў "ЛіМе" ды ў іншых выданнях Алесь Марціновіч пазначаў псеўданімамі Лявон Юрчык, Алесь Вішнеўскі, Віктар Закрэўскі, Язэп Літвіновіч, Васіль Руневіч, Вацлаў Анціпенка — усяго каля 45 прозвішчаў.

Знакаміты аднафамілец

Цяжка пачынаць пісьменніцкі шлях з чыстага аркуша, калі тваё прозвішча супадае з ужо вядомым у літаратуры. Так атрымалася ў пісьменніка Леаніда Левановіча, які напраўдзе мае аднолькавае прозвішча з вядомым аўтарам "Рускага лесу" Леанідам Лявонавым.

Купалле і жытні колас як сімвал жыцця

Усім вядома, што Іван Луцэвіч нарадзіўся на Купалле, гэта і абумовіла выбар псеўданіма Янкі Купалы. Але не ўсе ведаюць, што першым псеўданімам Якуба Коласа быў подпіс Карусь Лапаць, якім пазначаны сшытак з раннімі творамі пісьменніка пад назвай "Наша сяло, людзі і што робіцца ў сяле". Рукапіс захоўваецца ў музеі класіка, мяркуецца, што створаны ён падчас вучобы Канстанціна Міцкевіча ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі (1898—1902 гг). А першы друкаваны верш "Наш родны край" на старонках "Нашай долі" ў 1906 годзе ўжо меў подпіс Якуб Колас. Паводле ўспамінаў Пятра Глебкі, на пачатку літаратурнай дзейнасці пясняр захапляўся творчасцю рускага паэта Пятра Якубовіча (Мельшына), асабліва падабаўся яму верш пра колас. Такім чынам, імя "Якуб" малады пісьменнік, хутчэй за ўсё, узяў ад прозвішча ўпадабанага паэта (з якім, дарэчы, нарадзіўся ў адзін дзень і месяц — 22 кастрычніка альбо 3 лістапада па новым стылі), а колас, да таго ж, добра падыходзіў для псеўданіма як сімвал жыцця і працы.

У імя каханай

Каханым прысвячаюць не толькі вершы, апавяданні, карціны і рамантычныя ўчынкі, іх імёны часта становяцца пуцяводнай зоркай для ўсёй творчасці. Шмат псеўданімаў утвораныя ад імёнаў і прозвішчаў жонак і мужоў — да прыкладу, паэт, перакладчык, публіцыст Андрэй Александровіч некаторыя артыкулы падпісваў Чыгуначнік Бэцін, паэт Алесь Звонак меў таксама псеўданім П. Алесін, Эдуард Акулін калісьці пазначаў артыкулы ў "ЛіМе", прысвечаныя Багдановічавай хаце, ініцыяламі Н. К. — няцяжка здагадацца, што ўсе яны ўтвораныя ад жаночых імёнаў. А самы яркі прыклад такога псеўданіма —- Ядвігін Ш. Антон Лявіцкі ў маладосці быў закаханы ў Ядвігу Шабуневіч з Радашковіч, імя якой і ўвекавечыў у псеўданіме.

Ад прадзедаў спакон вякоў

Большасць псеўданімаў пісьменнікі пераймаюць у спадчыну, утвараючы ад родных сэрцу бацькоўскіх і дзедавых імёнаў.

Мікалаю Раманоўскаму псеўданім Кузьма Чорны, здаецца, не вельмі пасаваў — знешнасць у пісьменніка была занадта светлая. Чаму ж ён абраў такое літаратурнае імя? Аказваецца, яго дзед па мацярынскай лініі М. Парыбак, што быў ткачом, меў вясковую мянушку Чорны, якую пасля пераняў знакаміты ўнук.

За скарочаным прозвішчам бацькі Адам М-скі ў канцы XIX стагоддзя хавала сваю лірычную жаноцкасць польскамоўная паэтэса Беларусі Зоф'я Манькоўская.

А сярод сучаснікаў вернымі сямейнай памяці застаюцца браты Уладзімір і Міраслаў Адамчыкі. Гучны псеўданім Адам Глобус створаны ад прозвішча бацькі Вячаслава Адамчыка і дзявочага прозвішча маці Ніны Глобус. Пісьменнік Міраслаў Адамчык доўгі час карыстаўся псеўданімам Шайбак — прозвішчам бабулі па бацькоўскай лініі, якое ў перакладзе з цюркскіх моў азначае "сад у квецені".

Самы просты псеўданім

Псеўданім пісьменніцы Зоські Верас, які выкарыстоўваўся ёй з 1917 года, мае відавочнае тлумачэнне: Людвіка Сівіцкая-Войцік проста вельмі любіла верас, асабліва, калі ён квітнее, радуе вока, набрыняе салодкім пахам, які так падабаецца пчолам.

Водар роднай зямлі

У адным з лістоў Максім Лужанін, сапраўднае прозвішча якога Аляксандр Каратай, так тлумачыў паходжанне свайго псеўданіма: "Мне здаецца, што імя паэта павінна несці з сабою араматы і ачараванне роднай зямлі. Я нарадзіўся на Случчыне; там — выдатныя заліўныя і сухадольныя лугі з такім сенам, што пах яго я чую кожны раз, калі пішу гэтае слова. Ну, а імя — у гонар Максіма Багдановіча; да гэтага нашага паэта, які памёр у 25-гадовым узросце, я адчуваў у маладосці асаблівыя пачуцці. Вось так і з'явіўся ў 1925 годзе ў газеце "Савецкая Беларусь" Максім Лужанін".

Новае імя ў літаратуры

Празаік Альгерд Бахарэвіч у адным інтэрв'ю некалькі гадоў таму распавядаў пра тое, чаму з Алега ён ператварыўся ў вялікакняжацкага Альгерда: "Калі мне было 18 гадоў і я пачынаў толькі займацца літаратурай, адзін добры чалавек сказаў мне: імя Алег абсалютна не беларускае, беларускі пісьменнік не можа быць з такім імем". Іншае імя мае ў пашпарце і паэтка з Полацка Лера Сом — ад нараджэння яе завуць Алена.

"Легалізаваны" псеўданім

Некаторыя літаратары нават імкнуцца ўзаконіць свае адносіны з літаратурным імем, зрабіўшы адпаведную пазнаку ў пашпарце. Ужо дастаткова даўно на аперацыю па афіцыйнай перамене прозвішча рашыўся Сяргей Мыцько, ператварыўшыся ў Сержа Мінскевіча. Паводле паэта, яго цяперашняе прозвішча тлумачыцца проста: яно гучыць як імя па бацьку і абазначае "сын Мінска", таго самага, у якім праходзіла маладосць літаратара.

Дакументальна замацаваў сваё літаратурнае імя і малады паэт Віктар Лупасін. У Віктара ёсць свая філасофія "літаратурнага лупасінства": "Пісьменнікі падзяляюцца на творцаў, якія спрабуюць рабіць нешта новае, і ў іх гэта атрымліваецца, графаманаў, якія спрабуюць, але ў іх не атрымліваецца, і постмадэрністаў, якія не спрабуюць. Такім чынам, графаманы стаяць вышэй за постмадэрністаў. Лупасінства палягае на тым, каб не баяцца наступаць на адны і тыя ж граблі, не баяцца выглядаць графаманам, а ўвесь час спрабаваць і імкнуцца". Віктар распавядае, што выбар адбыўся выпадкова — прозвішча рэдкае, праўдападобнае, не мае павярхоўнай матывацыі, якая б лёгка прачытвалася, а да таго ж, у ім можна разгледзець цікавую этымалогію, трактуючы як "волкагрэх", ці "сіняя лупа".

Саша ДОРСКАЯ

Дзе гэта вуліца, дзе гэты дом?

Цікавую методыку выяўлення гісторыка-культурных аб'ектаў мінулага распрацаваў і ўпершыню прымяніў у сваёй дакументальнай аповесці "Зимовка гвардии" пісьменнік Сямён Букчын. Каб знайсці дом, у якім спыняліся знакамітыя дзекабрысты Нікіта Мураўёў і Аляксандр Бястужаў-Марлінскі, знаходзячыся ў Мінску ў 1821—1822 гадах, Сямён Уладзіміравіч узяў з кніжнай паліцы "Историю Минска", надрукаваную ў 1957 годзе выдавецтвам Акадэміі навук БССР, разгарнуў яе на 96-й старонцы і прачытаў наступны трэці абзац: "Далучаныя да Высокага рынку вуліцы — Дамініканская, Францысканская, Койданаўская, Зборавая, забудаваныя каменнымі дамамі, таксама мелі добраўпарадкаваны выгляд". Пасля гэтага С. Букчын прыйшоў да нечаканай высновы: у адным з дамоў на нейкай з гэтых вуліц і здымаў кватэру Мураўёў. Даследчык выказваў меркаванне: "Можа быць, у тым жа самым, у якім спыняўся Бястужаў, вярнуўшыся з Выганічаў. Ці сустракаліся яны?"

Застаецца толькі з чатырох вуліц вызначыць тую, на якой мог знаходзіцца дом, у якім жылі названыя дзекабрысты, і ўсталяваць на ім мемарыяльную дошку. Аднак, прайшло больш як трыццаць гадоў са дня публікацыі аповесці "Зимовка гвардии", а Сямёну Уладзіміравічу так і не ўдалося адшукаць гэты дом. Ёсць падставы меркаваць, што і не ўдасца. І вось чаму.

Мураўёў прыехаў у Мінск 21 кастрычніка 1821 года і спыніўся ў тракціры, у якім пражыў каля тыдня, пакуль не знайшоў для сябе належную кватэру. Бястужаў-Марлінскі ў гэты час знаходзіўся за 40 кіламетраў ад Мінска, у вёсцы Выганічы, адкуль 22 кастрычніка адаслаў ліст Ф.Булгарыну (у якім, у прыватнасці, пісаў: *"Пушкина "Уединение" слабо, но "Муза" есть приятная безделка"*). Такім чынам, сустрэцца ў гэты час у Мінску Н.Мураўёў і А.Бястужаў-Марлінскі ніяк не маглі. Гэта вымушаны быў прызнаць і сам Сямён Уладзіміравіч праз некалькі старонак.

"Мінск здаваўся няўтульным і бедным, — піша С.Букчын. — У вочы кідалася празмерная дарагавізна ўсяго. Бястужаў, які пабываў у горадзе раней за Мураўёва, у лісце да сваякоў скардзіўся, што "живши в нем очень умеренно, истратил 25 рублей на один стол".

З усяго вышэй сказанага вынікае, што дома, у якім спыняліся дзекабрысты Мураўёў і Бястужаў-Марлінскі, не існавала ўвогуле. Але быў дом, у якім здымаў кватэру Н.Мураўёў. Вось як сам дзекабрыст пісаў пра яе ў адным са сваіх лістоў: *"... мне отводили квартиры одну хуже другой, так что я решился нанимать и нашел три комнаты прекрасные за 50 рублей в месяц бумажками. У меня зала в 4-е сажени длины, и вообще квартира очень хороша"*. Ці мог сабе дазволіць зняць такую кватэру Бястужаў-Марлінскі? На жаль, не! Ён паходзіў са шматдзетнай збяднелай дваранскай сям'і, а Н.Мураўёў — з найбагацейшай сям'і Расіі. Знаходзячыся на так званай "дзяржаўнай службе", ён трымаў пры сабе пастаянна двух прыгонных слуг, меў цудоўную брычку з парай коней і шмат іншых прывілей.

Вядома, адшукаць дом, у якім жыў больш за паўгода дзекабрыст Мураўёў, наўрад цяпер ці магчыма, таму што цэнтральная частка Мінска, з далучанымі да яе вуліцамі (якія называў С.Букчын), вельмі змянілася. Але месца, дзе мог знаходзіцца гэты дом, хаця б прыблізна вызначыць можна.

Дапамогуць нам у гэтым лісты самога Н.Мураўёва. У лісце, датаваным 27 кастрычніка 1821 года, ён піша: *"Любезнейшая маминька, я вам еще ничего не писал о Минске. Город невидный — отовсюда окружен обширными лесами. Посреди города большая продолговатая площадь, обстроенная каменными домами. **Я теперь живу на этой площади**"*.

У другім, ад 21 лістапада гэтага ж года, Мікіта нібыта ўдакладняе месца свайго пражывання: *"Вы мне советуете ходить — я бы рад был, но океан грязи ограничивает мою деятельность, и я хожу по одной площади, **которая перед моими окнами**, которая одна еще довольно суха, потому что самое высокое место в городе и вымощена большими камнями"*.

У трэцім лісце, ужо за 20 сакавіка 1822 года, ён піша: *"Многие из офицеров наших живут теперь в местах, вовсе почти от воды недоступных. Но я не чувствую сих неудобств, потому что живу на горе, и притом мощенной"*.

І нарэшце чацвёрты ліст, ад 8 красавіка 1822 года, поўны радасці і захаплення: *"У нас здесь с субботы погода удивительная. Такие дни, какие бывают в июле. **И я все время не схожу с площади нашей**"*.

Дзе ж знаходзілася гэтая прадаўгаватая, выбрукаваная вялікімі камянямі плошча? Вызначыць яе дапаможа ўжо згаданая "История Минска" 1957 года выдання. Як і С.Букчын, мы разгорнем яе на 96-й старонцы, аднак звернемся не да трэцяга, а да другога абзаца: "Цягам першай паловы XIX стагоддзя цэнтрам горада заставаўся раён Высокага рынку. Ён быў забудаваны камяніцамі. Тут знаходзіліся Петрапаўлаўскі сабор, кафедральны каталіцкі касцёл, двухпавярховы будынак ратушы, дом губернатара, гімназія, гасцінны двор, будынкі манастыроў, **вялікія жылыя дамы.** Гэтая плошча была лепшай часткай горада".

Чытач, напэўна, ужо здагадаўся, што прадаўгаватая плошча так званага Высокага рынку — гэта сучасная плошча Свабоды. Менавіта на ёй здымаў кватэру дзекабрыст Н.Мураўёў у адным з **"вялікіх жылых дамоў"**, дзе жыла гарадская эліта, а не на прылеглых да гэтай плошчы вуліцах, у чым нас спрабаваў пераканаць С.Букчын. Дарэчы, менавіта гэтая акалічнасць і дазволіла Н.Мураўёву даволі часта, асабліва ў непрыглядныя дажджлівыя дні, наведваць дом мінскага губернатара, які знаходзіўся літаральна за некалькі крокаў ад яго кватэры.

Вячаслаў АФАНАСЬЕЎ

Віншуем

з **90**-годдзем **Булахава** Міхаіла Гапеевіча, беларускага мовазнаўца.

з **90**-годдзем **Кухарава** Сцяпана Іванавіча, беларускага пісьменніка.

з **75**-годдзем **Гарбука** Генадзя Міхайлавіча, беларускага акцёра.

з **70**-годдзем **Макарэвіча** Васіля Сцяпанавіча, беларускага паэта.

з **60**-годдзем **Кавалёву** Ніну Дзмітрыеўну, беларускую паэтэсу.

з **60**-годдзем **Ламана** Пятра Аляксандравіча, беларускага пісьменніка, акцёра.

з **50**-годдзем **Пятровіча** Барыса (Сачанку Барыса Пятровіча), беларускага празаіка.

з **50**-годдзем **Русілку** Вольгу Іванаўну, беларускую паэтэсу.

Юбілейны каляндар

95 гадоў **Алейнікаву** Пятру Мартынавічу, беларускаму акцёру кіно.

85 гадоў **Курто** Яўгену Іванавічу, беларускаму празаіку.

85 гадоў **Лук'янаву** Міколу (Мікалаю Піліпавічу), беларускаму празаіку.

80 гадоў **Каваленку** Віктару Антонавічу, беларускаму пісьменніку, літаратуразнаўцу.

80 гадоў **Нядзведскаму** Уладзіславу Іосіфавічу, беларускаму пісьменніку.

75 гадоў **Вуячычу** Віктару Лук'янавічу, беларускаму эстраднаму спеваку.

70 гадоў **Кірвелю** Анатолю Мяфодзьевічу, беларускаму пісьменніку.

Мінскі дэбют актрысы

Газета "Минские губернские ведомости" ў № 39 за 1869 г. у сваёй неафіцыйнай частцы змясціла рэцэнзію на адну тэатральную пастаноўку, у якой, у прыватнасці, паведамлялася: "Паненка Страмлянава няблага сыграла ролю выхавацелькі ў п'есе "На хлеб і на ваду", але тутэйшая публіка бачыла ў гэтай ролі ўзорную ігру спадарыні Карпенкі (малодшай), якая далёка пераўзыходзіць маладую дэбютантку і па таленце, і па сцэнічнай вопытнасці, і таму параўнанне было не на карысць апошняй. Аднак гэта яшчэ не бяда і хай нашыя словы не бянтэжаць маладую артыстку: на яе баку затое перавагі маладосці і больш шчаслівай знешнасці, а сцэнічная вопытнасць прыйдзе сама сабою. Могуць развіцца і задаткі таленту, якія, безумоўна, ёсць у спадарыні Страмлянавай..."

Гэта адзін са шматлікіх водгукаў, якія з'яўляліся ў газеце ў тыя далёкія ад нас гады на гастролі розных тэатральных труп. Вядома, можна было б і не звяртаць на яго ўвагу, тым больш, імя "паненкі Страмлянавай", пра якую вядзецца гаворка, нічога не кажа нават знаўцам тэатральнага мастацтва, не кажучы ўжо пра шараговага чытача. Аднак за гэтым прозвішчам стаіць імя выбітнай рускай актрысы, першай грамадска-тэатральнай дзяячкі Расіі, адной з ініцыятараў Першага з'езда рускіх сцэнічных дзеячаў, адной з арганізатарак Рускага тэатральнага таварыства, яго старшыні, а таксама стваральнікаў пры ім Прытулку пажылых акцёраў (цяпер — Дом ветэранаў сцэны) — Марыі Гаўрылаўны Савінай.

Дачка правінцыйных акцёраў Гаўрыіла і Марыі Падрамянцавых (на сцэне — Страмлянавых), яна, як кажуць, вырасла за кулісамі. Сямі-васьмігадовым дзіцем не раз выступала на адэскай сцэне, выконваючы дзіцячыя ролі. Восенню 1869 г., пятнаццацігадовай дзяўчынай, Маша Страмлянава атрымлівае ў Мінску свой першы ангажэмент і вядомасць.

А пачыналася гэта так.

Акцёр чарнігаўскай трупы Славянскі (ён жа Саваяраў) з беспрацоўных артыстаў стварыў вандроўную трупу, прыкладна з 8—10 чалавек. Да гэтай трупы далучыўся і бацька Марыі. Пасля разводу з жонкай ён пакінуў ля сябе старэйшую дачку Машу і ўзяў яе з сабою на гастролі: яе прызначалі на тыя ролі, на якія не ставала актрыс. У сярэдзіне лета 1869 г. у Бабруйску, дзе гастралявала вандроўная трупа, адбылося здарэнне, якое дазволіла юнай Марыі выявіць свае акцёрскія здольнасці напоўніцу.

Камічная актрыса Міхайлава паставіла ў свой бенефіс вадэвіль "На ловца и зверь бежит", дзе Маша Страмлянава мелася іграць эпізадычную ролю кветачніцы. Збор планаваўся быць поўным, аднак падчас рэпетыцыі высветлілася, што Міхайлава ўночы нарадзіла дзіця і іграць не зможа. Не зважаючы на пярэчанні бацькі ды іншых акцёраў, Маша ўзялася сыграць ролю Міхайлавай, і гэтая смела спроба мела ў гледачоў вялікі поспех.

Захаваліся ўспаміны акцёра Мяшкова-Траяпольскага, які ў той час знаходзіўся ў вандроўнай трупе разам са Страмлянавай, дзе, у прыватнасці, засведчана, што яе поспехі ў Бабруйску былі настолькі вялікімі, што чуткі пра гэта дайшлі да Мінска, адкуль спецыяльна прыехаў дырэктар тэатра — губернскі архітэктар Аўгуст Штраўх, каб запрасіць яе на зімовы сезон. Так пятнаццацігадовая Марыя апынулася ў Мінску.

Вялікую карысць сваімі сяброўскімі парадамі і падтрымкай падчас яе службы ў Мінску прынёс Марыі Страмлянавай акцёр В. Істомін-Кастроўскі. Іграючы разам з ім у вадэвілі "Гамлет Сидорович и Офелия Кузьминишна", М. Страмлянава заслужыла вялікую сімпатыю і ўдзячнасць не толькі ў мінскай публікі. *"Губернатар*, — піша М. Савіна ў сваіх успамінах, — *зрабіў вымову Штраўху, што я так мала атрымліваю пры несумненным таленце і такіх багатых касцюмах і загадаў даць мне бенефіс і павялічыць жалаванне. Як апісаць маё захапленне... Жалаванне мне павялічылі толькі на 10 рублёў, але бенефіс!.. Іграць я стала ўсё і кожны дзень. Супраць губернатара ніхто не насмельваўся ісці, і за кулісамі мяне перасталі прыцясняць, тым больш што Кастроўскі стаяў за мяне"*.

Неўзабаве пасля ад'езду з Мінска, у Харкаве, Марыя Страмлянава выйшла замуж за правінцыйнага акцёра і антрэпрэнёра Мікалая Славіча (па сцэне — Савіна). Разам з ім яна іграе ў Калузе, Ніжнім Ноўгарадзе, Казані, Саратаве, Арле ды іншых гарадах. Пяць гадоў цягнуцца гэтыя вандраванні юнай актрысы, а вясной 1874 года яна апынаецца на пецярбургскай сцэне ў Імператарскім Александрыйскім тэатры, якому яна прысвяціла сорак гадоў жыцця. Аднак першы свой ангажэмент у Мінску Страмлянава памятала заўсёды.

Дарэчы, распавядала яна пра гэта і вялікаму рускаму пісьменніку І. Тургеневу. Менавіта ён папрасіў Марыю Савіну апісаць перажытае. Марыя Гаўрылаўна часткова выканала яго просьбу: заўчасная смерць перашкодзіла ёй завяршыць свае запісы, якія спыніліся на падзеях 1877 г. Аднак для нас запіскі Савінай уяўляюць найвялікшую цікавасць тым, што ў іх захавалася часцінка культурнага жыцця Бабруйска і Мінска другой паловы XIX стагоддзя.

Уладзімір ЧУКАЛІН

Чалавек, паэт, педагог

Уладзімір Немізанскі быў чалавекам надзвычай сціплым. Але жыхары нашага раёна не забываюць яго, нават выдалі зборнік выбраных твораў паэта. Педагог, літаратар, грамадскі работнік, Уладзімір Львовіч быў перш за ўсё выдатным чалавекам, таму і пакінуў пасля сябе незабыўны след.

Вечарына, прысвечаная 70-годдзю з дня нараджэння У. Немізанскага, прайшла ў Рагачоўскім педагагічным каледжы. Студэнты і школьнікі расказвалі пра жыццёвы і творчы шлях паэта і педагога нашага краю, чыталі яго творы з кніг "Дарункі жыцця" і "Иду к себе", "Чатыры зярняткі". Ветэран педагагічнай працы Л. Кабылянец падзялілася сваімі сяброўскімі ўспамінамі пра Уладзіміра Немізанскага, паэтэса Ніна Пінчук з удзячнасцю згадвала пра вялікую дапамогу, якую аказваў Уладзімір Львовіч рагачоўскім літаратарам, культработнік Ірына Марчанка выдатна выконвала песні на вершы Уладзіміра Немізанскага.

Міхась КАВАЛЁЎ
г. Рагачоў

Марыя МАЛІНОЎСКАЯ. Нарадзілася ў Гомелі ў 1994 годзе. Вучыцца ў Лінгвістычнай гімназіі. Займаецца ў мастацкай студыі. Член савета Школы маладога літаратара пры гомельскім аддзяленні Саюза пісьменнікаў Беларусі. Лаўрэат літаратурнага конкурсу, прысвечанага 70-годдзю Гомельскай вобласці. Прызёр абласнога творчага конкурсу "Любімы педагог". Пераможца абласнога конкурсу "Даруй мне цішыню тваіх бібліятэк". Уладальніца Гран-пры Літаратурнага конкурсу Мінскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Друкавацца пачала ў абласной газеце "Гомельская праўда".

Зусім нядаўна пабачыў свет яе першы зборнік паэзіі "ЛУНЫ ПЕЧАЛИ" (Гомель, выдавецтва "БАРК", 2009, у аўтарскай рэдакцыі, прамова І. Бісева, мастак А. Крылоў, 54 стар., 100 асоб.)

"Як адрозніць прафаннае ад сапраўднага, вось праблема. Цяпер — вялікая колькасць пішучых сярэдняй адоранасці, камар носа не падсуне, усё робяць так, як трэба, пад некага, пад нешта, але нічога з таго не хвалюе. Там мастацтва памерла. Калі я ў новай кніжцы паэта магу адрозніць вершы па іх, груба кажучы, каштоўнасці, магу зразумець дзе вяршыня, а дзе правалы — гэта жывое. А калі не, калі ўсё аднолькава геніяльна, як запэўніваюць, то справы швах."

Алег ЧУХОНЦАЎ

Калі я ўспамінаю сваё літаратурнае пачаткоўства, у прыватнасці пісанне вершаў, мне робіцца ніякавата. Я пісаў у свае пятнаццаць год куды горш, чым Марыя Маліноўская. Тое нельга было не тое што друкаваць, а ўвогуле паказваць людзям. Я і не паказваў. Дзякаваць Богу, ужо ў такім узросце ў мяне хапала самакрытычнасці. Гэта я да таго, што ранні пачатак творчасці яшчэ пэўна не вызначае далейшага літаратурнага лёсу. Хоць, вядома, былі прыклады рознага кшталту. Возьмем Лермантава, Рэмбо ці нашага Куляшова...

Але не заўсёды "творчыя вундэркінды" дарэшты выяўлялі свой патэнцыял. Здараліся і ўвогуле драматычныя, а то і трагічныя выпадкі. Як тое адбылося з вядомым еўтушэнкаўскім адкрыццём Нікай Турбіной, мінскім рускамоўным таленавітым падлеткам Ігарам Паглазавым... А сёння на нашых вачах мітусліва развіваецца творчая планіда Валерыі Куставай, першая кніжка якой з'явілася ў трынаццацігадовым узросце з прадмовай А. Разанава...

Безумоўна, нельга аб'ядноўваць і з адзіных пазіцый характарызаваць, а тым больш аналізаваць усіх пералічаных тут творцаў. У кожнага з іх свая мера таленту, свая чалавечая адмета, свой жыццёвы вырак.

І ўсё ж... Як на маю думку, толькі талент ад Бога можа быць гарантам вялікага мастацкага плёну. Ды як тое прадбачыць...

Таму варта паразважаць пра першы (цэльна не акрэслены) зборнік вершаў гомельскай гімназісткі Марыі Маліноўскай. Найперш — *падзівіца* прыгожаму беларускаму прозвішчу, а яшчэ больш — *уразіцца* рускамоўнасці аўтара. Шкада. Разам са зборнікам яе вершаў у рэдакцыю "ЛіМа" прыйшлі дзве ўзнёсла-станоўчыя рэцэнзіі з Гомельшчыны. І гэта пахвальна. Людзі заўважылі талент юнай зямлячкі і адразу пра гэтую арыгінальную творчую з'яву спавесцілі ўсю нашу літаратурную грамаду. Мы выдрукавалі толькі адзін водгук, бо другі быў з боку чалавека, які меў дачыненне да творчасці паэткі, і, вядома, нейкім чынам выглядаў бы *зацікаўленым па справе*...

Чытаючы біяграфію пятнаццацігадовай дзяўчыны, я думаў, о, якое прыкладнае дзіця нашага канфармісцкага і канфліктнага часу! А чытаючы вершы, здзіўляўся, які прывідна-драматычны лёс таленавітай паэткі!

Аналізуючы паэтычны зборнік Марыі, увесь час не можаш, як ад лясной павуты, адчапіцца ад віртуальнай стылёвай прысутнасці Марыны Цвятаевай. Надта ж ужо заўважна *вучнёўства*. Не сцвярджаю, што гэта кепска. Якраз — наадварот. Дзякаваць Богу, што не *"паслаў другога"*, каго-небудзь з нашых сучасных "літвыдзвіжэнцаў". Класічная вучоба ставіць версіфікацыю маладой паэткі на высокі ўзровень. Напэўна, Марыя чытала і гэты пасаж з Марыны з яе празаічнай "Казкі мамы", слухаючы якую і спагадаючы яе герою-Разбойніку, сказала, што выйшла б за яго замуж і сама была б валацужніцай разам з ім альбо *"пісала б яму вершы ў сшытачак"*. І далей:

"Не могу не закончить заключительным (трагическим!) стихотворением первой моей детской тетради. Рисунок: я за письменным столом. Лицо — луна, в руке перо (гусиное) — и не перо, а целое крыло! — линия стола под самым подбородком, зато из-под стола аистовой длины и тонизны ноги в козловых (реализм!) сапогах с ушами. Под рисунком подпись: "Марина Цветаева за сочиненьями".

Конец моим милым сочиненьям
Едва ли снова их начну
Я буду помнить их с забвеньем
Я их люблю.

— Вы никогда не писали плохих стихов?

— Нет, писала, только — все мои плохие стихи написаны в дошкольном возрасте.

Плохие стихи — ведь это корь. Лучше отболеть в младенчестве".

Наша Марыя піша ў своеасаблівай **"Клятве"** паэта: *"Я буду работать — **от**весно, **до**тла"*. Гэта калі мець на ўвазе духоўную работу. Бо сама версіфікацыя не павінна вымагаць катаржнай працы, яна даецца Звыш, як дар, дзеля яе трэба жыць, найперш унутраным жыццём, суперажываючы ўсяму жывому. Сама Паэзія — нерукатворная. Таму большы давер, і разам з тым насцярожлівасць і трывогу, выклікае іншы радок: *"И в каждую строчку// я буду ложиться как в землю"*. А тут ужо — вопыт уласнага чалавечага жыцця. Яго пакуль паэтцы недастае. Недахопы яго яна і кампенсуе, па Багдановічу кажучы, "выдумкай сваёй галавы", фантазіяй, творчым натхненнем... Не заўсёды атрымліваецца прыгожа і пераканаўча, каб адначасна здзіўляла, выклікала давер і суперажыванне ў чытача. Гэта, дарэчы, вельмі трапна і асцярожліва зазначыў у сваёй прадмове да зборніка І. Бісеў: *"Яна імкнецца (спяшаецца?) як мага паўней выказаць сябе цяперашнюю і будучую. У разнастайных жыццёвых сітуацыях і калізіях аўтар выяўляецца перад намі ў розных ролях, іпастасях і вобліках"*, разам з тым ён паказаў і на *"перабольшванне значнасці асабістых перажыванняў і знешніх падзей, мілую незразумеласць"* гомельскай паэткі... Далёка не адыходзячы, варта сказаць добрыя словы на адрас тых людзей, якія дапамагалі Марыі ў літаратурных "штудыях" (таму ж І. Бісеву, Н. Шкляравай і тым, каго я не ведаю). У іхнім становішчы "мэтраў" галоўнае не збіць паэтку, як кажуць, з тропу, з уласнай дарогі, не схіляць сілай на свае сходжаныя сцежкі, даць права на аўтаномны палёт, пры якім нават падзенне будзе выпроставаць і ўмацоўваць крылы. Бо ўжо і сёння ў вершах Марыі нярэдка здараюцца вельмі яркія ўдачы, што сведчыць пра арыгінальны талент, якім надзелена юная паэтка.

Вращение — ось возвращения —
Кольцо не разжать, как объятья.
В нём ключ, за ключом —
за-ключение.
В нём сплавлены счастье
с несчастьем.

Выклікаюць захапленне і асобныя метафары і вобразы:

Текли, как пот,
слова со лба страницы...

Альбо гэтая, здаецца, ужо недзе чутая раней:

Я с тобой жизнью делилась,
как пищей...

І такое:

В мёрзнущем пламени глаз
разгорается лёд...

Але ёсць і рытмічнае прапаведаванне маральных чалавечых каштоўнасцей, жаданне пераступіць свой узрост, быць *"седой і мудрой"*:

Будь ты водою,
Я утонула бы в тебе.
Будь ты землёю,
Я навеки легла бы в тебя.
Будь ты сатаной,
Я обратила бы тебя ко Христу.

Куды цікавей чытаюцца строфы выдыхнутыя з уласнай юнай істоты:

А стих, который посвящаю вам,
Ещё не кончен.
Он и остр, как спица,
И нежен, как апрельская трава,
Проросшая сквозь белую страницу.
О нём не будет злой
людской молвы.
Никем не читанный,
придёт он к вам по почте.
Я знаю, что всё правильно лишь Вы
Поймёте.

Ва ўсякім разе шчырае прызнанне, бо спадзявацца ў такім затаемленым кантэксце на разуменне чытача, сапраўды цяжка. Я нават хацеў пацікавіцца ў каго з гамяльчан наконт біяграфіі паэткі і пэўных сямейных і сяброўскіх стасункаў у яе жыцці, але падумаў, — калі тое ведаць, то навошта чытаць гэтыя вершы?..

Безумоўна, не маючы важкага жыццёвага досведу, Марыі часта даводзіцца пісаць на абстрактныя лірычныя тэмы, дамалёўваючы і дадумваючы тое, што магло і можа быць ці яшчэ здарыцца. Неардынарныя стылёвыя і фармальныя пошукі вымагаюць ад паэткі глыбокай моўнай практыкі як ва ўнутраных сваіх вычуваннях так і ў дачыненнях з акаляючым яе светам. Трошкі падсушвае і штучніць вершы залішне частая апеляцыя да самой Яе Вялікасці Паэзіі. Вось адзін прыклад:

И ты прошёл сквозь мысль в строке.
Ты здесь. Пусть знает вся земля,
***КОМУ** я с детских лет была*
И кем.

Па-першае, згадваецца інтанацыя Г. Ахматавай. Па-другое, менавіта ў такіх "дарослых мудрствуючых" пасылах і адчуваецца абсалютная адсутнасць натуральнасці паэтычнага голасу, наіўнага здзіўлення і самаадкрыцця... Хоць непадалёк па-добраму ўражвае наступны радок:

В пустой душе
ни для чего нет места...

Гэта вельмі добра. Бо, здавалася б, якраз наадварот: месца колькі заўгодна, — там жа пуста, аднак, гэта не тая пустата, што прагне прывіднага напаўнення, — там захоўваецца месца для **"некага"**, а не для *"нечага"*.

Радуе, што ў зборніку вельмі шмат вершаў пра каханне, што паэтка, апроч ужо згаданых тут паэтаў, захапляецца і слынным Федэрыкам Гарсія Лоркам.

А найбольш мяне захапляюць яе мастацкія ўдачы, якія іншы раз нават бянтэжаць сваёй аголенасцю і крывава-пульсуючым нервам:

Как бы ты страстно меня
не любил,
Сколько б стихов я тебе
ни писала,
Грань между нами
Господь очертил
Миррой помазанным
острым кинжалом.
Пусть я в чертах
его буду искать
Что-то твоё в тишине
нестерпимой —
Знай, лишь его я могу называть
Сущность утратившим
словом "Любимый"...

Цудоўна. Толькі не разумею, навошта мірам мазаць кінжал (зброю)?..

Альбо гэтае, як прыкладзенае да той цвятаеўскай "мамінай казкі" пра Разбойніка:

И, как только способна, люби
Обречённого.

Любоў, дабрыня, шчырасць і спачуванне — тое, што скразным падтэкстам прачытваецца ў вершах М. Маліноўскай, ёсць падставай і гарантам правільнасці абранага ёй паэтычнага шляху да сваёй літаратурнай "галгофы".

Я вижу — чутким —
зрением и слышу —
острым — слухом,
Как пьёт себя водоворот.
Играю строчками,
А Строки — мной.
Так происходит непорочное
Зачатие Стиха —
от вольного, как ветер, Духа...

Ну што тут скажаш?! Толькі, як рыба на беразе, будзеш лавіць сваё кудысьці (камусьці?) адляцеўшае дыханне...

І ўсё ж не будзем забываць, што паэтка яшчэ на пачатку свайго шляху, што яшчэ яна можа дазволіць сабе гуляць са словам і з чытачом, пакуль яны дазваляюць ёй гэта, хоць ноткі яе рэдкай самакрытычнасці даюць нам спадзеў на яе будучы творчы плён:

В который раз беру тетрадь
С моими детскими стихами...
.....
Они, по сути, так смешны.

Госпадзе, думаю, хіба трынаццаць гадоў (пазначаны пад вершам час яго напісання: 18 снежня 2007) гэта не дзяцінства?.. Але тут жа ўспамінаю іншыя радкі Марыі Маліноўскай:

Ведь речь идёт о связи сна и яви,
О том, на что
так трудно намекнуть.

Хоць, шчыра кажучы, найбольш мне ўпадабалася такая, зусім не дзіцячая, а далёка прадбачлівая, як і ў кожнага сапраўднага паэта, яе ўласная творчая перспектыва:

Мне всё трудней
становится писать,
Ведь вечных строк
не ищет эта
нежность...

Што ж, парадуемся за талент. І будзем у яго верыць.

ЛеГАЛ

ЛіМ

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная калегія:
Анатоль Акушэвіч
Лілія Ананіч
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Святлана Берасцень
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Уладзімір Дуктаў
Анатоль Жук
Вольга Казлова
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Мікола Станкевіч
Юрый Цвяткоў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19

Тэлефоны:
галоўны рэдактар,
намеснік — 284-66-73

Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
крытыкі
і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі — 284-44-04
мастацтва — 284-82-04
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: lim_new@mail.ru

Адрас у Інтэрнеце:
www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва".

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Незалежнасці, 79.

Індэкс 63856
Наклад 3187
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 29.07.2009 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 4016

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686
9 770024 468001 09028